КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №19 (147)
◂ 29 МАЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**МАЛДАЎСКІЯ, РУМЫНСКІЯ, САВЕЦКІЯ**

Стар. 20

**СУТЫКНЕННЕ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ У 53-М ТРАЛЕЙБУСЕ**

Каб назіраць за сутыкненнем цывілізацый, зусім не абавязкова мець здольнасці думаць геапалітычнымі катэгорыямі...

Стар. 4

**БЕЛНАФТАХІМ ПАКУЛЬ ТРЫМАЕЦЦА І ШУКАЕ СПОНСАРАЎ**

Па выніках першага квартала бягучага года ў цэлым па канцэрну «Белнафтахім» аб'ёмы прамысловай вытворчасці не скараціліся...

Стар. 6

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–16

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**«Студэнцкая думка: партрэт часопіса ў інтэр'еры пакалення»**

Нарыс Марыі Мартысевіч.

З цыклу «Новая генерацыя»

▸ З НАГОДЫ

# КАЗАЧНІКІ АД УРАДУ

Вольга ХВОІН

**Інстытут стратэгічных даследаванняў (BISS) правёў даследаванне, якое тычылася пытанняў, што найбольш хвалююць беларусаў. Эканамічнай сітуацыяй у краіне (а дакладней, інфляцыяй і ростам цэнаў) заклапочаныя 80 працэнтаў апытаных рэспандэнтаў.**



Photo.ByMedia.Net

Другое месца ў рэйтынгу займае праблема алкагалізму — 47,9 працэнта, далей ідуць высокія тарыфы на паслугі ЖКГ (32,9 працэнта), нізкі ўзровень прыбыткаў (32,4 працэнта) і высокія кошты на жыллё (29 працэнтаў). Праблемы з дэмакратыяй і свабодаю слова хвалююць 8 працэнтаў беларусаў, ціск на нацыянальную культуру і мову, а таксама нізкая якасць сістэмы адукацыі зацікавілі такую колькасць суайчыннікаў, што лічбы аказаліся ці не ў межах статыстычнай памылкі — 2,2 і 1,8 працэнты адпаведна.

А ўрад тым часам гаворыць, што эканамічны спад, які для Беларусі, між іншым, толькі пачаўся, ужо завяршаецца. І хутка мы будзем выхваляцца ростам ВУП, заробкаў і агульным дабрабытам. Але не трэба думаць, што людзі — дурні, і не разумеюць, да чаго ідуць справы. На днях мой знаёмы — рабочы на адным з мінскіх заводаў — спачатку сціпленька запытаўся, чаго чакаць бліжэйшым часам ад нашай эканомікі, пасля не стрымаўся і красамоўна вылаяўся, назваўшы кіраўніцтва краіны нядобрым словам за імклівы рост знешніх пазыкаў і дрэнную арганізацыю вытворчасці. І гэта, між іншым, у час, калі слова «крызіс» у краіне дазволілі ўжываць толькі тады, калі пераход прадпрыемстваў на няпоўныя працоўныя тыдні схаваць ужо ніяк не выпадала, і дзяржаўныя СМІ былі вымушаныя выдаваць народу дазаваную інфармацыю.

Эканамічны ўздым, які да таго ж мусіць прыпасці на лета — час адпачынкаў і зацішша ў сацыяльна-эканамічным жыцці, — урад збіраецца забяспечыць новымі знешнімі ўліваннямі. Настойліва просіць 500 мільёнаў долараў у Расіі і адначасова са спадзяваннямі на інвестыцыі і крэдыты як бы паварочваецца да Захаду. Сусветны банк на мэты развіцця для Беларусі плануе выдаць не менш за 200 мільёнаў долараў, дый перамовы па атрыманню другога транша крэдыту ад МВФ у рамках праграмы *stand-by*, па словах віцэ-прэм'ера Андрэя Кабякова, ідуць поўным ходам. Дарэчы, у красавіку была агучана інфармацыя пра заяўку на атрыманне крэдыту памерам 125 мільёнаў долараў ад Міжнароднага банку рэканструкцыі і развіцця. Праблемы з дэфіцытам гандлёвага балансу ўрад імкнецца вырашыць за кошт адміністрацыйных захадаў, і разглядае гэту праблему не як сістэмную (хаця адмоўнае сальда па гандлю з'явілася не ўчора), а часовую з'яву.

Пра рэальны стан спраў гавораць і намеры абмежаваць норму бязмытнага ўвозу ў Беларусь тавараў з тысячы да двухсот еўра. Не сакрэт, што кошты на многія віды тавараў у параўнанні з краінамі бліжэйшага замежжа аж зашкальваюць. І людзі, асабліва з памежных рэгіёнаў, ездзяць на закупы ў Польшчу, Літву, Украіну. Калі такое рашэнне будзе прынята, то ўдарыць яно найперш па звычайных спажыўцах. «Гэта мера, ведаеце, непапулярная і часовая, — пракаментаваў магчымыя абмежаванні Аляксандр Лукашэнка. — Я, праўда, не бачыў яшчэ гэтых прапаноў, але я ад зваротнага пачынаю разважаць. Я хачу, каб вы апраналі сваё і елі сваё. Можа, яно горш упакавана, чым імпартнае, але сёння сітуацыя такая, што ў нас валюты бракуе. А калі патрошку-патрошку, глядзіш, і нешта сабралі».

З беларусаў па нітцы — сірацe кашуля, толькі ці не акажуцца самі беларусы без штаноў ад такіх антыкрызісных мераў. «Мы паглядзім, варта або не варта, — заявіў кіраўнік краіны. — Гэта, хутчэй за ўсё, ад Нацыянальнага банка ідзе, каб абмежаваць увоз імпарту. Мы павінны разумець, што зараз разглядзім літаральна ўсе пытанні, каб абараніць свой рынак, каб свайго вытворцу абараніць, каб прадаць сваё. Таму што попыт зваліўся ўсюды, і мы не можам рэалізаваць сваю прадукцыю, як раней. Таму хоць у сябе ўсярэдзіне трэба прадаць. Вядома, паўстае пытанне якасці. Давайце нармальную якасць. Нікуды не дзенуцца, будуць даваць».

Усе намаганні казачнікаў ад эканомікі дашчэнту разбіваюць факты. Вось і нядаўна Беларусь падвязалася ўступіць ў антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС. Беларускія ўлады разлічваюць атрымаць нейкую дапамогу з гэтага фонду, агульны памер якога павінен скласці 10 мільярдаў долараў. Доля Расіі ў антыкрызісным фондзе ЕўрАзЭС складае 7,5 мільярда долараў, Казахстану — 1 мільярд, Кіргізія, Таджыкістан і Арменія пералічаць у фонд па 1 мільёну долараў ЗША. Беларускія ж улады дагэтуль не толькі не агучылі аб'ём удзелу ў фондзе, але і адмаўляюцца паведамляць, ці прынята рашэнне па дадзеным пытанні. Прынамсі, інфармацыі пра пералічаныя на рахунак грошы нідзе не з'явілася. Плаціць няма з чаго.

Працяг тэмы на стар. 6 ▸

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### АШМЯНЫ. ЧЫГУНКА ДА АЭС

**Будаўніцтва атамнай станцыі ў Астравецкім раёне не распачалося, аднак чыгунку коштам 226 мільярдаў рублёў пракласці ўжо дамовіліся.**

У Ашмянскім раёне прайшло пасяджэнне міжведамаснай камісіі па будаўніцтву чыгункі ад станцыі Ашмяны да будучай АЭС у Астравецкім раёне. Правёў пасяджэнне Віктар Пяткевіч — выконваючы абавязкі начальніка аддзела транспарту і камунікацый Гродзенскага аблвыканкама. Даўжыня новай чыгункі будзе 25 кіламетраў. Будаўніцтва яе выклікана неабходнасцю дастаўкі абсталявання на станцыю.

### МАГІЛЁЎ. РУХАВІКІ ДЛЯ АСТРАВЕЦКАЙ АЭС

**Завод «Электрарухавік» пачаў серыйны выпуск двух новых мадэрнізаваных рухавікоў для атамных станцый.**

Яны дапаўняюць шэраг рухавікоў, што выпускае завод для атамных станцый былога Савецкага Саюза, у першую чаргу Расіі. Плануецца выкарыстаць навінку на АЭС у Беларусі.

### ВІЦЕБСК. НЕЗАЙЗДРОСНЫ ЛЁС БЫЛЫХ ВАЙСКОВЫХ ГАРАДКОЎ

**Камітэт дзяржаўнага кантролю супольна з упраўленнем Дэпартамента федэральных расследаванняў правялі праверку на прадмет захавання і эфектыўнасці выкарыстоўвання ў вобласці былых вайсковых гарадкоў.**

Праверка закранула гарадкі, якія былі перададзены ў камунальную ўласнасць у 1992–2004 гадах у Верхнядзвінскім, Талачынскім, Лепельскім, Аршанскім, Пастаўскім і Полацкім раёнах, а таксама ў гарадах Віцебск, Орша, Полацк і Наваполацк.

3 626 аб'ектаў падобнага кшталту толькі 479 задзейнічаны ў гаспадарцы. Нават тыя, што перададзены ў камунальную ўласнасць, але не падлягаюць эксплуатацыі, спісаны і зняты з бухгалтарскага ўліку, не былі дэманціраваны. Такіх аб'ектаў па вобласці на момант праверкі выяўлена 65. Складзены акты. Сума фінансавых спагнанняў з вінаватых у афіцыйным паведамленні не называецца.

### ЛІДА. НАВІНКА ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ

**На тэрыторыі горада неўзабаве плануецца правесці рэканструкцыю дамоў, пасля чаго яны будуць мець мінімальнае энергаспажыванне.**

За тры гады ў Лідзе будзе створана дэманстрацыйная пляцоўка з мэтай прапаганды эканоміі энергарэсурсаў у ЖКГ для ўсіх суб'ектаў гаспадарання ў Беларусі. Рэканструкцыі падлягаюць тры пяціпавярховыя «хрушчоўкі» ў цэнтры горада і тры на ўскрайку. Фінансуе гэты праект Гродзенскае абласное ўпраўленне ЖКГ, якое выйграла грант Еўрасаюза ў 180 тысяч еўра па праграме энергазберажэння. Гадавое энергаспажыванне ў гэтых дамах будзе зніжана з 240 кв/гадзін да 40 на 1 кв. м, што адпавядае нормам Германіі.

Дадатковае фінансаванне будзе здзяйсняцца з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў. У Лідзе будзе таксама рэалізаваны праект па будаўніцтву дома з нулявым энергаспажываннем. Праект рыхтуюць нямецкія спецыялісты. Вядома толькі, што гэта будзе адміністрацыйны аб'ект у тры паверхі. Усё астатняе — сакрэт.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

---

ПРАБЛЕМА

## ЛАГЕРНАЕ ЛЕТА ПАДЛЕТКАЎ

**Гэтым летам плануецца ўладкаваць на працу больш за 5 тысяч падлеткаў, якія знаходзяцца пад прафілактычным назіраннем.**

Яшчэ 3 тысячы будуць накіраваны ў ваенна-патрыятычныя або абаронна-спартыўныя лагеры, 5,5 тысячы — у загарадныя аздараўленчыя лагеры, 7 тысяч — у лагеры з дзённым знаходжаннем, прыкладна па адной тысячы — у валанцёрскія лагеры і студэнцкія будаўнічыя атрады. Пра гэта паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязей МУС Беларусі.

Такія мерапрыемствы прадугледжаны міжведамаснай спецыяльнай праграмай «Клопат», якая рэалізуецца ў краіне з 1 мая па 1 верасня. Асаблівая ўвага надаецца дзецям з праблемных, шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, а таксама тым, якія знаходзяцца на прафілактычным уліку. Для іх плануецца правядзенне турыстычных паходаў і злётаў, экскурсій, турніраў па розных відах спорту.

У чэрвені ў краіне плануецца арганізаваць 152 ваенна-патрыятычныя і абаронна-спартыўныя лагеры, у ліпені — 75, у жніўні — 56. У іх змогуць аздаравіцца больш за 8 тысяч падлеткаў.

**Паводле БелаПАН**

---

КУЛЬТУРНЫ АБМЕН

## ДНІ ІЗРАІЛЬСКАГА КІНО

**Вечарам 25 мая ў мінскім кінатэатры «Цэнтральны» ваеннай драмай «Бафор» адкрыліся Дні ізраільскага кіно.**

У 127-хвілінным фільме рэжысёра Джозефа Сідара апавядаецца пра падзеі 2000 года на поўдні Лівана, дзе падраздзяленне Арміі абароны Ізраіля апошнімі днямі акупацыі рыхтуюцца да запланаванага адступлення са старажытнай крэпасці Бафор, якую баевікі «Хезбалы» абстрэльваюць ракетамі. У стужцы, знятай паводле аповесці Рона Лешэма «Калі ёсць рай», паказана трагічная гісторыя салдат, якія, нягледзячы на страты сяброў і паніку, павінны выканаць загад — утрымаць блокпост, а пры адыходзе ўзарваць крапасныя збудаванні. У 2007 годзе на Берлінскім кінафестывалі фільм быў адзначаны прызам за найлепшую рэжысуру, а ў 2008 годзе намінаваўся на прэмію «Оскар» як найлепшы замежны фільм.

Адкрываючы Дні ізраільскага кіно, пасол Ізраіля ў Беларусі Эдуард Шапіра зазначыў, што за першыя 10 дзён дэманстрацыі фільма ў Ізраілі яго паглядзелі 90 тысяч чалавек, а ўсяго 300 тысяч ізраільцян і мільёны замежных гледачоў.

**Марат Гаравы, БелаПАН**

---

ПАМЯЦЬ

## ПОМНІК АХВЯРАМ ХАЛАКОСТУ

**У Камянцы будзе ўстаноўлены помнік ахвярам Халакосту. Такое рашэнне прыняў Камянецкі райвыканкам. З ініцыятывай увекавечыць памяць вязняў Камянецкага гета да мясцовых уладаў звярнулася Брэсцкая гарадская яўрэйская грамадская арганізацыя «Брыск».**

Гета знаходзілася ў горадзе ў 1941–1942 гадах, яго вязнямі сталі больш за 4 тысячы яўрэяў.

Як паведаміў БелаПАН старшыня арганізацыі Барыс Брук, пасля зацвярджэння гэтага праекта аблвыканкамам пачнуцца работы па ўстаноўцы помніка на перасячэнні вуліц Пралетарская і Чкалава, дзе размяшчалася гета. Сродкі на памятны знак выдзелены фондам Лазарусаў (Вялікабрытанія), тэрыторыю добраўпарадкуюць за кошт мясцовага бюджэту. Плануецца, што помнік будзе ўстаноўлены да 3 ліпеня гэтага года.

**Паводле БелаПАН**

---

ГРЫП

## АВІЯРЭЙСЫ З ЯПОНІІ МОГУЦЬ АДМЯНІЦЬ

**Эла Дзвінская**

У Японіі зарэгістравана ўжо 300 выпадкаў захворвання свіным грыпам, на шчасце, без смяротных зыходаў. Пра гэта паведаміла кіраўнік Цэнтра японскай культуры ў Мінску спадарыня Масака Тацумі.

У сувязі з захворваннем могуць быць адменены авіярэйсы з Японіі на Беларусь. Спадарыня Тацумі занепакоена, што ў такім выпадку перапыняцца штогадовыя стасункі японскіх дабрачынцаў з беларускімі арганізацыямі.

Па колькасці хворых на свіны грып Японія займае чацвёртае месца з 46 краін свету, у якія ўжо патрапіў вірус. Таксама носьбітамі віруса стала значная частка японскіх школьнікаў.

Распрацавана спецыяльная інструкцыя пра тое, як ізалявана ад іншых лячыць і даглядаць дзіця ў сям'і. У сувязі з гэтым узнікаюць сур'ёзныя складанасці. Напрыклад, бацьку 14-гадовай Румі Кудзукі забаранілі з'яўляцца на працу ў адну з такійскіх фірм да таго часу, пакуль дзіця не паправіцца. Дачка і бацька сядзяць у розных пакоях у доме і размаўляюць па тэлефоне. Маці прыносіць ежу і пакідае каля ўваходу ў пакой.

У школах абвешчаны каранцін, спынены заняткі. У родным горадзе Масака Тацумі Кіёта, які з'яўляецца буйным турыстычным цэнтрам і захоўвае шмат помнікаў архітэктуры, таксама зарэгістраваны выпадкі віруса A/H1N1, што завезлі наведвальнікі горада.

---

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ. ПАДЗЕІ ТЫДНЯ

### АСТРАВЕЦ. ІНФАРМАЦЫЙНЫ СУПРАЦІЎ

Пасля прыняцця рашэння пра пабудову ў гэтым рэгіёне АЭС, актывісты, што пратэстуюць супраць размяшчэння тут станцыі, якім мясцовыя ўлады не дазваляюць праводзіць мітынгі, пікеты, сустрэчы з грамадзянамі, каб патлумачыць людзям наступствы прысутнасці тут падобнага аб'екта, распачалі інфармацыйную кампанію. Ад пачатку 2009 года тут распаўсюджваюцца бюлетэні «Астравецкі веснік» і «Мірны атам», у якіх даследуюцца не толькі будучыя экалагічныя праблемы, але і сацыяльныя. Прыкладам, у адным з апошніх нумароў «Мірнага атама» разглядаецца праблема прыезду сюды элітных путан, паколькі ўжо ў гэтым годзе плануецца асвоіць у межах будаўніцтва 172,4 мільярда рублёў. У падобным накірунку асвятляе праблемы краю бюлетэнь «Голас Віленшчыны». Сярод іншага, ён змяшчае адрасы каардынатараў супраціву АЭС у Астравецкім, Вілейскім, Маладзечанскім, Мядзельскім і Смаргонскім раёнах.

**Іван Крук**

### ЛІДА. ЗМАГАННЕ ЗА БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ САДКІ

Гарадская суполка ТБМ правяла акцыю сярод бацькоў дзіцячых садкоў па накіраванню дзяцей у беларускамоўныя класы. Былі задзейнічаны два мікраёны. У Слабадзе па кватэрах будучых вучняў былі раздадзены буклеты з пажаданнямі навучацца на беларускай мове. Па вуліцы Рабіновіча, дзе знаходзяцца чатыры дзіцячыя садкі, сябры ТБМ запрашалі на бацькоўскія сходы. На кожным з іх агулам прысутнічала ад 20 да 40 чалавек. Ідэю накіроўваць дзяцей у беларускамоўныя класы паўсюдна падтрымалі настаўнікі школ, які прысутнічалі на мерапрыемствах.

**Станіслаў Суднік**

### МАСТЫ. ВЫЯЎЛЕНЫ МАГІЛЫ ПАЎСТАНЦАЎ

Актывісты незарэгістраванага грамадскага аб'яднання «Альянс Панямоння» сумесна з пазбаўленым дзяржавай рэгістрацыі ГА «Саюз палякаў на Беларусі» (кіраўнік Анжэліка Борыс) адшукалі яшчэ два вялікія пахаванні паўстанцаў 1863 года на тэрыторыі раёна. Яны размешчаны ля вёскі Пацавічы і на ўскрайку горада. Ад першага помніка застаўся пастамент з камянёў з памінальным надпісам, другі знішчаны ўшчэнт, нават пліту з памінальным надпісам хтосьці паклаў у падмурак свайго дома. У архівах адшуканы выявы помнікаў, і неўзабаве яны будуць адноўлены.

**Язэп Палубятка**

### БРАСЛАЎ. НЕЗВЫЧАЙНАЯ ВЫСТАВА

Калекцыя шкла з фондаў музейнага аб'яднання выстаўлена ў краязнаўчым музеі. На выставе можна ўбачыць вырабы, якія датуюцца XIX–XX стагоддзем. Сярод іх ёсць даволі рэдкія. Гэта бранзалеты, каралі, знойдзеныя падчас археалагічных раскопак, пацеркі, бісер. Вялікай атрымалася калекцыя разнастайных бутэлек, найперш вінных і піўных. Некалькі стэндаў прысвечана аптэчнаму посуду.

**Алесь Невядомы**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НА ПАКРЫЎДЖАНЫХ…

Генадзь КЕСНЕР



**На гэтым тыдні беларускі афіцыйны лідэр зноў пакрыўдзіўся на расійскае кіраўніцтва. Маўляў, нас зноў наш найбліжэйшы хаўруснік не пускае на свае рынкі.**

«Калі мы пачынаем блакаваць адзін аднаго ў гэтых пытаннях, і Расія пачынае блакаваць Беларусь і не пускаць на свой рынак, каму патрэбны гэтыя так званыя інтэграцыйныя працэсы? — задаўся пытаннем Аляксандр Лукашэнка падчас свайго наведвання Магілёўскае вобласці. — Толькі мяне ў гэтым абвінавачваць не трэба, не я ў гэтым вінаваты, што ў нас не рухаецца інтэграцыя, што мы там на Захад развярнуліся, ва «Усходняе партнёрства» ўступілі і гэтак далей. А куды нам падзецца?»

А куды ж улады глядзелі апошнія 15 год? Ці спадзяваліся і надалей на звыклую расійскую халяву ў выглядзе нізкіх цэнаў на вуглевадароды і такім чынам прыхаванае субсідаванне нашай эканомікі? Раней трэба было думаць, а не чакаць крызісу, які захлынуў у тым ліку і Беларусь. Выратаванне тапельцаў…

У сваю чаргу, і апазіцыя не спіць у шапку. Прынамсі, маладая яе частка. Так, моладзевыя грамадскія і палітычныя актывісты 26 мая на прэс-канферэнцыі ў Мінску абвясцілі пра гатоўнасць узяць адказнасць за лёс краіны, а таксама пра сваё аб'яднанне для дасягнення рэальных перамен у Беларусі.

Па словах сустаршыні незарэгістраванай партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Паўла Севярынца, мысленне прадстаўнікоў старога пакалення палітыкаў прывяло да стагнацыі ў дэмакратычным руху, калі лідэры розных палітычных сіл не могуць дамовіцца паміж сабою дзеля дасягнення агульных мэтаў.

Як адзначыў Павел Севярынец, «цяпер сярод моладзевых лідэраў ёсць тыя, хто гатовы да канструктыўнага дыялогу з уладай. Ёсць і тыя, хто бескампрамісны ў дачыненні да яе, але мы можам знайсці агульныя пункты сутыкнення і дамовіцца паміж сабою».

Для аб'яднання сваіх мэтаў актывісты падпісалі маніфест, у якім заявілі, што вітаюць рашэнне Еўрасаюза ўключыць краіну ў праграму «Усходняе партнёрства», ухваляюць умацаванне эканамічных, культурных і навуковых сувязяў Беларусі з ЕС і супрацоўніцтва Еўрасаюза з беларускай грамадзянскай супольнасцю і палітычнымі партыямі, падтрымліваюць дзеянні лідэра руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча па наладжванні адносінаў Беларусі з ЕС дзеля ўмацавання незалежнасці краіны на ўмовах дэмакратызацыі і павагі правоў чалавека, будуць каардынаваць сваю дзейнасць з мэтай распрацоўкі і ажыццяўлення канкрэтных крокаў на шляху рэфармавання і еўрапейскай інтэграцыі Беларусі. Сярод падпісантаў маніфеста — кіраўнікі зарэгістраванага ў Чэхіі Міжнароднага моладзевага аб'яднання «Малады Фронт» Зміцер Дашкевіч і Наста Палажанка, намеснік старшыні руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч, лідэр незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Маладая Беларусь» Артур Фінькевіч і іншыя актывісты.

Усё добра, толькі вось у прысутных на прэс-канферэнцыі склалася ўражанне, што дакумент гэты скіраваны на падтрымку аднаго канкрэтнага палітыка, і тым самым моладзевыя актывісты ўжо пачалі ўдзел у наступнай кампаніі па выбарах прэзідэнта.

Яшчэ адной важнай падзеяй мінулых сямі дзён стаўся VII справаздачна-выбарчы з'езд Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя журналістаў». Форум прайшоў без інтрыг і нечаканасцяў, кіраўніком БАЖу зноў абрана Жанна Літвіна — заснавальніца і нязменны кіраўнік асацыяцыі. Дэлегаты з'езду прынялі звароты да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і да прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага. Ад першых журналісты пераважна недзяржаўных выданняў патрабуюць перагляду заканадаўства, якое дазваляе прыцягваць людзей да адказнасці за распаўсюд «экстрэмісцкай інфармацыі», а Сяргея Сідорскага заклікаюць стварыць роўныя эканамічныя ўмовы для СМІ розных форм уласнасці і паспрыяць вяртанню трынаццаці незалежных выданняў у дзяржаўную сістэму распаўсюду і падпіскі. Што да мяне асабіста, то мне падаецца, што гэтыя заклікі калег так і застануцца голасам таго, хто кліча ў пустыні.

Прыемным момантам форума стаўся выхад сігнальных асобнікаў кнігі беларускага журналіста Аляксандра Тамковіча «Інтэрв'ю, якіх не было». У зборніку на пытанні Аляксандра адказалі сорак беларускіх журналістаў, сярод якіх — старшыня БАЖу Жанна Літвіна, а таксама Святлана Калінкіна, Ірына Халіп, Аляксандр Коктыш, Вольга Бабак і іншыя майстры пяра і слова.



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Артур Фінькевіч, Павел Севярынец, Наста Палажанка, Юрась Губарэвіч

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



Photo.ByMedia.Net

### РАДЗІВІЛЫ

У Беларусь на некалькі дзён прыехалі нашчадкі роду князёў Радзівілаў. За гэты час яны наведаюць Мінск, Мірскі замак, рэзідэнцыю Радзівілаў у Паланечку, Нясвіж. Візіт прадстаўнікоў старажытнага роду арганізаваў сумесна з Польскай амбасадай журналіст Глеб Лабадзенка. З афіцыйных асобаў гасцей курыруе намеснік міністра культуры — гасцям не трэба дамаўляцца, каб наведаць некаторыя музеі, архівы. У Нясвіжы — радавым горадзе — князёў сустрэў мэр горада, у гонар гасцей у касцёле адбылася святая імша. Візіт прадстаўнікоў роду Радзівілаў мае прыватны характар, а княгіня Эльжбета Радзівіл да эміграцыі жыла ў радавым палацы ў Нясвіжы. Княгіня была надзвычай уражаная цёплым прыёмам як афіцыйных асобаў, так і простых жыхароў. Князь Мікалай-Канстанцін Радзівіл назваў гэты візіт вельмі важным у сваім жыцці, бо змог на ўласныя вочы пабачыць мясціны, адкуль паходзіць яго род, і пачуць расповеды спадарыні Эльжбеты Радзівіл — сведкі падзей, што адбываліся ў Беларусі.

### ЛЯВОН БАРШЧЭЎСКІ



Старшыня партыі БНФ Лявон Баршчэўскі заявіў пра сваю гатоўнасць сысці на пенсію, «калі маладое пакаленне сапраўды гатова нешта прапанаваць». Такую заяву аксакал беларускага апазіцыйнага руху зрабіў пасля таго, як быў агучаны Маніфест лідэраў новага пакалення. Аднак гатоўнасць сысці не азначае непасрэдна сыход. «Жаданне прыйсці да ўлады якраз і не прагучала, — сказаў БелаПАН Лявон Баршчэўскі. — Агню ў вачах, які яны дэкларавалі, я не ўбачыў. Гэта былі па-сапраўднаму стомленыя цяжкімі ўмовамі жыцця людзі». Старшыня партыі БНФ падкрэсліў, што моладзевыя лідэры «не выказаліся ні па адным палітычным пытанні». «Усё гэта так гладка праходзіла, што немагчыма іх ні крытыкаваць, ні падтрымаць. На жаль, падобная заява не першая. Калі сапраўды маладое пакаленне гатовае нешта прапанаваць, я з задавальненнем сыду на пенсію. Пакуль, на жаль, яны мяне не ўпэўнілі ў неабходнасці зрабіць такі крок».

### АНДРЭЙ КУРЭЙЧЫК



Беларускі драматург і кінасцэнарыст Андрэй Курэйчык з'язджае на некалькі месяцаў скараць Галівуд. Ён актыўна працуе на расійскую кінаіндустрыю і нядаўна нават узначаліў топ–10 самых паспяховых расійскіх сцэнарыстаў. Запрашэнне прыехаць на працу ў Галівуд Курэйчык атрымаў ад прадзюсера Дэвіда Гамбурга, які эміграваў у Злучаныя Штаты ў 1970-я з Рыгі. Акрамя кінасцэнараў драматург Курэйчык цяпер піша п'есу для Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага па матывах беларускай гісторыі. Галоўным героем п'есы з'яўляецца экстравагантны Станіслаў Караль Радзівіл, больш вядомы як «Пане Каханку». Апошнія гады Андрэй Курэйчык працаваў над расійскай камедыяй «Любовьморковь» і яе сіквэлам, што, уласна, і прынесла яму вядомасць.

▸ МЕРКАВАННЕ

# СУТЫКНЕННЕ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ У 53-М ТРАЛЕЙБУСЕ

Сяргей НІКАЛЮК

**Каб назіраць за сутыкненнем цывілізацый, зусім не абавязкова мець здольнасці думаць геапалітычнымі катэгорыямі. У Беларусі такога кшталту сутыкненні адбываюцца штодзень практычна на ўсіх узроўнях штодзённага жыцця.**





Photo.ByMedia.Net

Да прыкладу, аўтару гэтых радкоў на днях у гарадскім тралейбусе па дарозе ў родную Малінаўку (маршрут № 53) пашчасціла стаць сведкам адметнага эпізоду. На просьбу кандуктара прад'явіць квіток добра апрануты мужчына, не паварочваючы галавы, зняважліва буркнуў: «Адміністрацыя». Гэтага было дастаткова, каб у кандуктара знікла жаданне настойваць на сваёй просьбе. Думаю, што нікога з чытачоў падобныя паводзіны кандуктара не здзівілі, але пры чым тут сутыкненне цывілізацый, і якія цывілізацыі ў гэтым выпадку сутыкнуліся?

## 23 гарантыі

Калі звярнуцца да аўтара тэорыі сутыкненняў цывілізацый амерыканскага паліталога Самюэля Хантынгтана, то ў мінскім тралейбусе ў той дзень сутыкнулася заходняя цывілізацыя, вызначальнай характарыстыкай якой з'яўляецца панаванне закона, з праваслаўнай з яе рабалепствам перад начальствам. Паводле артыкула 1 Канстытуцыі, Беларусь — прававая дзяржава, так што на фармальным узроўні з заходняй прапіскай у нас усё добра. Аднак на ўзроўні штодзённых практык прававыя нормы на кіраўнікоў у Беларусі не распаўсюджваюцца. Пры гэтым не мае значэння, ці тое датычыць таямнічага прадстаўніка незразумела якой адміністрацыі або кіраўніка дзяржавы, які па сумяшчальніцтву з'яўляецца гарантам Канстытуцыі (артыкул 79). Дарэчы, словы з коранем «гарант» згадваюцца ў Канстытуцыі 23 разы.

Для таго, каб не падацца галаслоўным, прывяду прыклад накont узроўню канстытуцыйных гарантый, які ўсім нам гарантуе Гарант. Паглыбліцца ў мінулае не будзем, звернемся да тэксту апошняга паслання, у якім, у прыватнасці, утрымліваецца напамін дэпутатам Нацыянальнага сходу пра неабходнасць хуткай справаздачы «перад беларускім народам за выкананне задач, пастаўленых на трэцім Усебеларускім народным сходзе і зацверджаных у Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2006–2010 гады».

Усебеларускі народны сход — гэта пазаканстытуцыйны орган. Ніякіх афіцыйных дакументаў пра парадак яго фармавання і яго палітычную кампетэнцыю не існуе. Калі ў 2006 годзе кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін паспрабаваў прыняць удзел у працы гэтага «ўсенароднага веча», то быў збіты людзьмі ў цывільным. Хоць ЦВК на той момант Казуліна ўжо зарэгістраваў у якасці кандыдата ў прэзідэнты, прызнаўшы тым самым больш за сто тысяч подпісаў, сабраных у яго падтрымку. Але подпісаў гэтых кандыдату ў прэзідэнты не хапіла, каб патрапіць у лік некалькіх тысяч дэлегатаў. Цікава, колькі ж подпісаў сабраў кожны з прысутных у зале Палаца Рэспублікі народны «абраннік»?

Гарант беларускай Канстытуцыі яшчэ ў 1996 годзе наступным чынам сфармуляваў уласнае палітычнае крэда: «Я сваю дзяржаву за цывілізаваным светам не павяду». Ці ёсць у Гаранта права на такі выбар? Безумоўна. У сучасным свеце можна налічыць не адзін дзесятак кіраўнікоў дзяржаў, якія адкрыта адмаўляюць цывілізаваны шлях развіцця, і ці не большасць з іх карыстаецца падтрымкай насельніцтва.

Зразумела, што далёка не ўсе беларусы згодны кіравацца ў бок, процілеглы ад цывілізаванага свету, пры гэтым выбар канкрэтнай дарогі, якая вядзе не туды, для іх другасны. Свет цывілізаваны ад свету нецывілізаванага адрозніваецца найперш сістэмай каштоўнасцей, а дыялог паміж прыхільнікамі розных каштоўнасцей практычна немагчымы. Пра каштоўнасці, як і пра густы, не спрачаюцца. Гарант гэту агульнавядомую ісціну ўвесь час падкрэслівае, напрыклад, хаця б тым, што інакш як «адмарозкамі» сваіх палітычных апанентаў не называе. Сам жа ён прыйшоў ва ўладу з апазіцыі «канструктыўнай». Была, як высвятляецца, і такая ў найноўшай гісторыі Беларусі. Гэта канструктыўнасць, як лёгка здагадацца, вызначалася наяўнасцю ў яе шэрагах будучага Гаранта. З яго пераходам у 1994 годзе ва ўладу сакрэт апазіцыйнай канструктыўнасці ў Беларусі быў згублены.

## У чаканні другога прышэсця

Усё сказанае вышэй варта разглядаць у якасці спробы аўтара апраўдаць з'яўленне ў *«Советской Белоруссии»* інтэрв'ю старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Грамада» Анатоля Ляўковіча. Нагадаю, інтэрв'ю было апублікавана 16–17 красавіка пад назвай «Апазіцыя павінна супрацоўнічаць з палітычнай сістэмай, а не ставіць ёй палкі ў колы».

Але не ці не супярэчыць мая спроба апраўдаць імкненне спадара старшыні апазіцыйнай партыі супрацоўнічаць з палітычнай сістэмай маімі ж развагамі пра немагчымасць дыялогу ва ўмовах несупадзення сістэм каштоўнасцей? Не, не супярэчыць, бо ў гэтым выпадку ніякага каштоўнаснага несупадзення няма.

Спадар Ляўковіч лічыць сябе сацыял-дэмакратам. Ён мае права гэта рабіць. Ён таксама мае права ўкладаць у гэта паняцце любы, які яму заманецца, сэнс. Напрыклад, такі: «Мае партыйныя таварышы, і нават я, лічым (можа, суб'ектыўна!) прэзідэнта Лукашэнку стыхійным сацыял-дэмакратам. І няма нічога ганебнага або дзіўнага ў тым, што мы бачым перспектыву нашай партыі ў супрацоўніцтве з уладай, у падтрымцы яе прагматычнага курсу». Вось і цудоўна, вось і файна! Сапраўды, няма нічога ганебнага ў тым, што два беларускіх «сацыял-дэмакрата» нарэшце знайшлі адзін аднаго. Падобнае, як вядома, прыцягваецца да падобнага.

Ці азначае гэта, што ў Беларусі можа адбыцца другое прышэсце канструктыўнай апазіцыі? А чым чорт не жартуе! У часы сацыяльна-эканамічнай стабільнасці і ад «Белай Русі» карысці для ўлады практычна ніякай не было, а ва ўмовах, калі «чорнае крыло (крызісу) закранула і Беларусь», глядзіш, і сацыял-дэмакратычнае лыка ад спадара Ляўковіча спатрэбіцца. Нездарма ў краіне яшчэ ў чэрвені 2007 года была прынята Дырэктыва № 3 пад вельмі абнадзейлівай назвай «Эканомія і ашчаднасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі дзяржавы». Кадры, у тым ліку і «сацыял-дэмакратычныя», — яны ж ва ўсе часы праходзілі па артыкуле «працоўныя рэсурсы», а таму да Дырэктывы № 3 маюць самае непасрэднае дачыненне.

## Манастырская дэмакратыя

Інтэрв'ю спадара Ляўковіча не засталося не заўважаным калегамі па партыйнай апазіцыі. Практычна ўсе першыя асобы Аб'яднаных дэмакратычных сіл штосьці асуджальнае выказалі. Сёй-той нават паспрабаваў запатрабаваць адлучэння, але да гэтага справа не дайшла. Такія няcмелыя спробы адмежавацца ідэйна ад новага саюза «сацыял-дэмакратаў» былі заўважаны зверху, і вось ужо ўсё ў той жа *«Советской Белоруссии»* з'яўляецца абураны каментар: «Што ж гэта атрымліваецца? Калі цяпер, у той час як некаторыя палітычныя партыі, што аб'ектыўна не маюць рэальнай улады, так заўзята спрабуюць закрыць рот свайму ж таварышу, то страшна ўявіць, якія норавы ў грамадстве яны будуць насаджаць, калі раптам усё ж рэальна прыйдуць да гэтай самай улады. Можна ўявіць, які маштаб набудзе тады нецярпімасць да чужога меркавання! Няцяжка здагадацца, што з усіх прынцыпаў і ўладных інструментаў у сённяшніх шукальнікаў народнай любові застанецца адзін, затое універсальны і мабільны рык: «Ні-з-зя!» (Дзмітрый Крат «Каму патрэбна «паляванне на ведзьмаў»?», «СБ» ад 16.05.2009).

Цікавы пункт гледжання, асабліва калі ўлічыць, што ў першым абзацы артыкула «Каму патрэбна «паляванне на ведзьмаў»?» адстойваецца права кожнай газеты публікаваць «толькі тыя матэрыялы, якія адпавядаюць яе рэдакцыйнай і інфармацыйна-палітычнай лініі». А аб'яднанням палітычных партый, атрымліваецца, сваю лінію мець нельга?

З глыбіні стагоддзяў да нас прыйшла прымаўка, якая не рэкамендуе сунуцца са сваім статутам у чужы манастыр. Яна актуальна і сёння, бо не супярэчыць базавым каштоўнасцям цывілізаванага свету. Кожны манастыр, у рамках дадзенай сістэмы каштоўнасцей, мае права на свой статут і тым самым можа абмяжоўваць у яго доступ тых, хто патрабаваннем статуту не адпавядае. Іншая справа, што ў цывілізаваным свеце ні ў каго няма права на стварэнне манастыроў-манапалістаў, і кожны грамадзянін пры жаданні можа арганізаваць свой уласны манастыр. Пры гэтым яму не патрэбна будзе ўзгадняць з гарадскімі ўладамі дазвол на арэнду памяшкання для правядзення ўстаноўчага з'езда будучага манаскага братэрства, а потым гадамі абіваць парогі мясцовага міністэрства юстыцыі ў беспаспяховых спробах прызнаць з'езд, які адбыўся, легітымным.

Усё гэта — простыя ісціны, але выпрацоўка адзінай пазіцыі на іх аснове ў расколатым па каштоўнасным прынцыпе беларускім грамадстве немагчымая, а таму добра апрануты мужчыны са шматлікіх «адміністрацый», як і раней, будуць ездзіць бясплатна ў гарадскім транспарце, зрэшты, як і бамжы. Да іх таксама не чапляюцца кандуктары з патрабаваннем аплаціць праезд.

***P.S.***

На жаль, інтэрв'ю спадара Ляўковіча не стала падставай для сур'ёзнай размовы пра стратэгію і тактыку апазіцыі ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму.

ПАРТЫІ

# РЭФАРМАТАРЫ І ПІЯРШЧЫКІ

Вольга ХВОІН

**Камуністы і хрысціянскія дэмакраты вызначыліся са сваімі планамі на бліжэйшую будучыню. Першыя, са згоды сябраў партыі, займуцца рэфармаваннем сваёй структуры, другія, відавочна, нацэленыя на раскрутку БХД і — у больш амбітным варыянце — змаганне за прэзідэнцкі фатэль.**



З'езд БХД. Сустаршыні партыі

Першага сакратара ЦК Партыі камуністаў Беларускай Сяргея Калякіна (цяпер яшчэ і рэфарматара левай ідэалогіі) на пазачарговым 14-м з'ездзе партыі падчас галасавання пра давер да кіраўніцтва падтрымалі прыблізна семдзесят працэнтаў удзельнікаў з'езда.

Перайменаванне палітычнай структуры — першы крок на шляху да стварэння новага іміджу ПКБ. Пачаць перамены ў партыі камуністы, памятаючы запавет капітана Врунгеля (як вы човен назавеце — гэтак ён і паплыве), вырашылі з назвы. За перайменаванне Партыі камуністаў Беларускай прагаласавала 108 дэлегатаў, 51 — супраць, 5 — устрымалася. З шасці прапанаваных кіраўніцтвам партыі назваў шляхам рэйтынгавага галасавання былі абраны тры варыянты: Беларуская партыя левых, Партыя дэмакратыі і справядлівасці, партыя «Радзіма». З канчатковай назвай камуністы вызначацца на другім этапе з'езда, сёлетній восенню. Лідэр партыі Сяргей Калякін падкрэслівае, што змена назвы — гэта толькі адзін з крокаў, якія трэба зрабіць у рэфармаванні партыі. «Трэба заняцца прапагандай партыі, каб уцягваць людзей, моладзь, трэба засвойваць камп'ютарныя тэхналогіі, бо друкаваную прадукцыю маладыя людзі цяпер чытаюць вельмі мала, — дзяліцца планамі палітык. — Мы хочам асвоіць інтэрнэт-прастору, стварыць добры і моцны сайт партыі і многае іншае. Нашая мэта — каб маладыя людзі ведалі пра ПКБ і пра тое, што яна прапануе». Такімі метадамі камуністы хочуць павялічыць свае шэрагі за паўтара-два гады з дзвюх тысяч да пяці-сямі тысяч сябраў.

Што тычыцца ідэалагічнага зместу, то замена шыльды на яго, па словах лідэра камуністаў, ніяк не паўплывае. «Наша палітычная платформа і праграма застаюцца без зменаў. А сама партыя застаецца ў складзе аб'яднаных дэмсілаў, і мы будзем дамагацца, каб у Беларусі ўсталявалася дэмакратыя», — падкрэслівае Калякін. Наконт вылучэння ў кандыдаты на прэзідэнцтва камуністы яшчэ нічога не вырашылі. Гэта пытанне будзе абмяркоўвацца восенню на другой частцы з'езда. Сяргей Калякін пра ўласныя амбіцыі гаварыць адмаўляецца, спасылаючыся, што за ім найперш мусяць стаяць людзі, і менавіта паплечнікі будуць вырашаць, удзельнічаць яму ў выбарчай кампаніі ці не.

Што тычыцца хрысціянскіх дэмакратаў, то яны, хаця і не прайшлі праз сіта рэгістрацыі ў Мінюсце, разгарнулі надзвычай актыўную дзейнасць з прыцэлам на будучыню. Акрамя рэгулярных кампаній і акцый у абарону сямейных каштоўнасцяў, БХД старанна акопваецца на палітычным полі краіны. Так, падчас канферэнцыі «Беларускай хрысціянскай дэмакратыі» быў абраны кандыдат для ўдзелу ў наступнай прэзідэнцкай кампаніі. Ім стаў сустаршыня БХД Віталь Рымашэўскі. Таксама на ролю кандыдата вылучаліся сустаршыня Георгій Дзмітрук і намеснік кіраўніка Мінскай гарадской арганізацыі БХД Леанід Скарабагаты.

Наконт палітычнага патэнцыялу Віталя Рымашэўскага ўжо прагучала шмат скептычных выказванняў, але, падаецца, перад БХД цяпер стаіць не змаганне да апошняга за месца ў Адміністрацыі, а задача зусім іншага характару. Калі дакладней, то раскрутка і папулярызацыя партыі. Пра гэта сведчаць і выказванні абранага кандыдата. «Я збіраюся неадкладна прыступіць да перамоваў з іншымі прэтэндэнтамі на ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах ад дэмсіл. Перадусім, з блізкімі нам светапоглядна, напрыклад, з Аляксандрам Мілінкевічам, кіраўніцтвам Партыі БНФ і іншымі палітычнымі сіламі. Трэба вызначыцца з механізмам вылучэння адзінага кандыдата, а таксама супольнай падрыхтоўкі да правядзення Кангрэса праеўрапейскіх сіл», — заявіў Віталь Рымашэўскі. Сябе кандыдат разглядае менавіта як прадстаўніка БХД, незалежна ад далейшага развіцця падзей з вылучэннем іншых кандыдатаў ад апазіцыі для ўдзелу ў выбарчай кампаніі. «Я бачу свае функцыі ў прадстаўленні сябраў «Беларускай хрысціянскай дэмакратыі» ў гэтых перамовах, пашырэнні распаўсюду ідэй БХД у беларускім грамадстве», — так акрэсліў сваю місію новаабраны кандыдат у кандыдаты на пасаду прэзідэнта. Як бачым, размова пра перамогу ў палітычнай гонцы не вядзецца. Дарэчы, пра намер удзельнічаць у наступнай выбарчай кампаніі на прэзідэнцтва заявілі кіраўнік руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, старшыня партыі БНФ Лявон Баршчэўскі, відавочна, пэўныя амбіцыі мае і палітык Мікола Статкевіч. Між іншым, заклапочанасць Сяргея Калякіна іміджам Партыі камуністаў Беларускай і паляпшэннем яе прывабнасці ў вачах грамадзян — адна з прыкметаў таго, што лідэр камуністаў стварае сабе платформу для наступнай прэзідэнцкай кампаніі.



З'езд ПКБ. Апошні пад старой назвай

АПАЗІЦЫЯ

# «КАНГРЭСМЕНЫ»

Марыя КРУК

**Аматарам розных палітычных сходаў бліжэйшым часам будзе дзе разгуляцца. Прадстаўнікі апазіцыі запланавалі правесці ажно тры кангрэсы: два еўрапейскіх сілаў і адзін аб'яднаных дэмакратычных.**

Адной з важнейшых частак праграмы кожнага кангрэса будзе вылучэнне "адзінага" кандыдата для ўдзелу ў прэзідэнцкай кампаніі. Такім чынам, «адзіных» можа аказацца як мінімум тры. Ці здолеюць урэшце палітыкі паміж сабою дамовіцца, пакажа час, але цяпер ніхто да саступак не гатовы. І нават калі будуць сфармуляваныя на гэтых кангрэсах прынцыпы супраці, то можа выявіцца, што датычацца яны толькі пэўнага кола палітыкаў, у той час як астатнія будуць гуляць па сваіх правілах. Вымалёўваецца палітычная какафонія.

Першынства па часе плануе займець палітык і лідэр аргкамітэта па стварэнні партыі «Народная Грамада» (Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі) Мікола Статкевіч — свой кангрэс Еўрапейскай кааліцыі ён мае намер сабраць ужо 21 чэрвеня. Заяўку на правядзенне мерапрыемства ў Палацы культуры Мінскага аўтазавода арганізатары ўжо накіравалі ў Мінгарвыканкам. Найперш удзельнікі кангрэсу збіраюцца абмеркаваць чатыры пытанні: стратэгію праеўрапейскіх сілаў у Беларусі; вызначэнне адзінага кандыдата ад праеўрапейскіх сілаў на бліжэйшыя выбары прэзідэнта; антыкрызісную платформу еўрапейскіх сіл Беларусі, абранне рады па абароне еўрапейскіх каштоўнасцяў. Пакуль, каб паўдзельнічаць у кангрэсе, дастаткова папросту заявіць пра сваё жаданне, з сабою можна прывесці колькі заўгодна сваіх сяброў і аднадумцаў. Праўда, пашкданне не гумавае, і калі будзе зашмат жадаючых, арганізатарам, магчыма, давядзецца перайсці да механізму вылучэння дэлегатаў.



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Аляксандар Мілінкевіч і Мікалай Статкевіч на з'ездзе БХД

Паспешлівасць мерапрыемства Мікола Статкевіч тлумачыць эканамічнымі і палітычнымі фактарамі.

Аб'яднаныя дэмсілы з часам пакуль не вызначыліся, рух «За свабоду» свой форум прызначыў на восень. Рашэнне далучыцца да кангрэса праеўрапейскіх сілаў пад эгідай Аляксандра Мілінкевіча і руху «За свабоду» ўжо агучыў шэраг маладзёвых актывістаў. Сярод іх — сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Павел Севярынец, намеснік старшыні Партыі БНФ Юрась Губарэвіч, лідэр руху «Маладая Беларусь» Артур Фінкевіч, намесніца старшыні «Маладога фронту» Наста Палажанка. Аргументам для падтрымкі экскандыдата на пасаду прэзідэнта з'яўляецца тое, што Аляксандр Мілінкевіч — «адзін з праеўрапейскіх палітыкаў, які зараз найбольш блізкі моладзі. Ён прыцягвае сваёй еўрапейскасцю, інтэлігентнасцю, а незалежнасць Беларусі ўважае за мэту жыцця». Натуральна, з такім раскладам найбольш верагодны варыянт зняцця Віталя Рымашэўскага на карысць Аляксандра Мілінкевіча і праца хадэкаў на «адзінага» кандыдата.

Палітолаг Валерый Карбалевіч звяртае ўвагу, што «галоўным пытаннем дыскусій цяпер з'яўляецца вылучэння кандыдатаў: каго падтрымліваць, хто мае лепшыя магчымасці і больш моцны?» «Мілінкевіч хоча сабраць на кангрэсе сваіх прыхільнікаў, Статкевіч хоча таго ж і, відавочна, таксама бачыць сябе кандыдатам у прэзідэнты. Назва «кангрэс праеўрапейскіх сілаў» не павінна ўводзіць у зман, — заўважае эксперт. — Пытанне толькі адно: хто каго вылучыць і збярэ мацнейшую каманду». Валер Карбалевіч некалькі разоў заўважыў, што падобныя працэсы для апазіцыі цяпер кепскія. «Перамагчы, дабіцца вынікаў апазіцыя можа толькі з адзіным кандыдатам. Цяпер найбольш раскручаная фігура Мілінкевіча — ён мае нейкі рэйтынг, рэсурсы, падтрымку за межамі Беларусі. Але ці змогуць урэшце палітыкі паміж сабой дамовіцца, цяпер сказаць цяжка, бо назіраецца моцная канфрантацыя бакоў. Да таго ж не ўсе ахвочыя да прэзідэнцкай пасады агучылі сваё жаданне. Таму ўявіць, што да выбараў будзе адзіны кандыдат ад апазіцыі, цяпер цяжка», — падкрэслівае палітолаг.

КРЫЗІС

# НЕЗДАРОВЫ АПТЫМІЗМ

Вольга ХВОІН

**«Вынікі развіцця эканомікі Беларусі ўсяляюць упэўненасць, што падзенне зафіксавана, і ў далейшым будзе рост», — заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на пасяджэнні Савета міністраў. Эксперты аптымізм кіраўніка ўраду лічаць заўчасным і неабгрунтаваным.**

Падставай для высноў пра светлую будучыню айчыннай эканомікі, паводле слоў Сідорскага, з'яўляецца той факт, што летась тэмп росту ВУП склаў 110 працэнтаў, а ў студзені-красавіку гэтага года — 101,2 працэнта. Урад чакае станоўчай тэндэнцыі і ў маі. Каб дасягнуць такіх мэтаў, прэм'ер-міністр параіў прадаваць прадукцыі больш, чым выраблядь. «Не трэба гнацца за нейкімі паказчыкамі ў шкоду эканоміцы. Паказчыкі дзеля паказчыкаў нам не патрэбныя, галоўнае — продажы», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Найгоршая сітуацыя са збытам у канцэрнах «Беллесбумпрам», «Беллегпрам» і ў Міністэрстве прамысловасці. У цэлым на складах захоўваецца гатовай прадукцыі амаль на 7 трыльёнаў рублёў. У красавіку запасы павялічыліся на 91 мільярд рублёў. Прычыны гэтага Сяргей Сідорскі бачыць у пратэкцыянізме дзяржаў СНД, якія стварылі бар'еры для абароны сваіх вытворцаў. «Краіны ставілі столькі перашкодаў у кастрычніку-лістападзе мінулага года, калі ўсё бурылася, навобмацак прымалі рашэнні. Сёння кожная краіна адзначае пэўную стабілізацыю, значыць, трэба адмяняць тыя рашэнні, якія былі прынятыя імгненна», — лічыць прэм'ер-міністр.

На пасяджэнні Рады кіраўнікоў урадаў дзяржаў — удзельніц СНД 22 мая было прынятае рашэнне скасаваць бар'еры ў гандлі. Але Расія тактыкі пакуль не змяніла і, напрыклад, абмяжоўвае імпарт беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі. Намеснік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў на пасяджэнні Рады дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Масквы, якое праходзіла ў Магілёве, выказаў меркаванне, што беларускім вытворцам варта ствараць уласную таваправодную сетку і прадаваць сельгаспрадукцыю праз яе, а не праз фірмы-пасрэднікі. У студзені-сакавіку бягучага года тавараабарот Беларусі з Масквой склаў 23,3 мільярда расійскіх рублёў, і ў параўнанні з аналагічным перыядам 2008 года паменшыўся на 41,6 працэнта. «У той жа час, у красавіку-маі тэмпы ўжо значна падраслі, і мы набліжаемся да вызначаных лічбаў», — адзначыў Кабякоў. Акрамя патрабаванняў вярнуць гандаль паміж краінамі ў старое рэчышча, Беларусь хоча атрымаць ад Расіі яшчэ і другі транш крэдыту ў памеры 500 мільёнаў долараў. Хутчэй за ўсё, гэта пытанне будзе абмяркоўвацца на сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага і кіраўніка ўрада Расіі Уладзіміра Пуціна 28 мая ў Мінску напярэдадні пасяджэння Рады Міністраў Саюзнай дзяржавы.

У той час, як кіраўніцтва Беларусі рапартуе пра перспектывы росту эканомікі, агенцтва *Eurostat* распаўсюдзіла інфармацыю, што Беларусь заняла другое месца сярод краін Еўропы па тэмпах інфляцыі ў студзені-красавіку 2009 года. «Лепш» за нас толькі Украіна. За чатыры месяцы з пачатку года рост цэн у Беларусі склаў 6,5 працэнта, ва Украіне — 6,9, у Расіі — 6,2 працэнта. У краінах ЕС спажывецкія кошты ў студзені-красавіку ў сярэднім выраслі на 0,6 працэнты. А павышэнне стаўкі падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ) справакуе рост цэн на працягу года на 20 працэнтаў, што, натуральна, толькі пагоршыць інфляцыйныя паказчыкі.



Photo.ByMedia.Net

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

# БЕЛНАФТАХІМ ПАКУЛЬ ТРЫМАЕЦЦА І ШУКАЕ СПОНСАРАЎ

Вольга ХВОІН



**Па выніках першага квартала бягучага года ў цэлым па канцэрну «Белнафтахім» аб'ёмы прамысловай вытворчасці не скараціліся. У той час як іншыя галіны гаспадаркі эканамічны крызіс перажываюць даволі складана, напрыклад, у машынабудаванні аб'ёмы вытворчасці ўпалі на 30 працэнтаў. Але варта адзначыць, што скарачэнне аб'ёмаў прадукцыі і яе экспарту ўсё ж закранула асобныя прадпрыемствы канцэрна.**

Тэмп росту прадукцыі прамысловасці па канцэрну «Белнафтахім» за чатыры месяцы склаў 113,4 працэнта ў супастаўных цэнах. Суадносіны запасаў гатовай прадукцыі на складах да сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасці роўныя 41,8 працэнта — самы нізкі паказчык у параўнанні з іншымі галінамі гаспадаркі, адзначаюць у канцэрне.

Асноўны прырост прадукцыі прамысловасці ў цэлым па канцэрну быў дасягнуты за кошт павелічэння аб'ёмаў вытворчасці ў паліўнай галіне. У параўнанні з пачаткам 2009 года павысілася эфектыўнасць гаспадарчай дзейнасці ў нафтахімічным комплексе, вырасла рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі ў хіміі і нафтахіміі. Найлепшыя паказчыкі з прыростам вытворчасці ў 10 і больш працэнтаў прадэманстравалі адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гомельскі хімічны завод», «Гродна Азот», «Бархім».

Паводле дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у першым квартале скарацілася вытворчасць мінеральных угнаенняў — 49,5 працэнта да ўзроўню першага квартала 2008 года, хімічных валокнаў — 73,1 працэнта, вытворчасць шынаў склала 89,2 працэнта да аналагічнага ўзроўню мінулага года. Па шэрагу пазіцый адзначаецца значны спад экспарту ў параўнанні з першым кварталам 2008 года: калійныя ўгнаенні — 19,4 працэнта, нафтапрадукты — 84,1, шыны — 69,4 працэнта.

Як паведаміў журналістам намеснік старшыні «Белнафтахіма» Браніслаў Сівы, прадпрыемства «Полацак-Шкловалакно» з-за ранейшых санкцый ЗША вымушана было выйсці з праекту па стварэнні сучаснага лайнера, для якога яно павінна было пастаўляць вогнеўстойлівае арганічнае шкло. Браніслаў Сівы адзначыў, што была «праведзена вялікая праца па заваёўванню рынку ЗША і ўкладзена шмат сродкаў», але «пакупнікі не будуць заключаць кантракты з прадпрыемствам, у дачыненні да якога ў любы момант могуць увесці санкцыі». Але, падкрэсліў ён, «гэта не драматычна, вытворчасць працуе», цяжкасці маюць прадпрыемствы, якія арыентаваныя на экспарт. Што тычыцца лідскай «Лакафарбы», то для яе санкцыі ўмоўныя, паколькі на амерыканскім рынку яна не працуе.

Сёлета прадпрыемствы канцэрна рэалізуюць пяць інвестыцыйных праектаў. За чатыры месяцы ў асноўны капітал было накіравана 1,1 трыльёна беларускіх рублёў інвестыцый. Вытворчасць мадэрнізуюць такія прадпрыемствы, як «Белшына», «Лакафарба», «Беларуськалій», «Гродна-Азот». Намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім» паведаміў, што для ацэнкі ўмоў стварэння і варыянту развіцця нафтахімічнага комплексу на базе ААТ «Палімір» і ААТ «Нафтан», будзе прыцягнутая кансалтынгавая кампанія.

Нагадаю, што варыянт аб'яднання двух нафтахімічных прадпрыемстваў і продаж пакета акцый расійскім інвестарам разглядаўся ў мінулым годзе, да фінансавага крызісу. «Гэты праект каштуе вялікіх грошай, і ён досыць рызыкоўны», — патлумачыў Сівы. «Цяпер уводзяцца ў строй магутнасці па вытворчасці поліпрапілену і поліэтылену нізкага ціску ва ўсходнім рэгіёне, дзе выкарыстоўваецца больш танная сыравіна. «Пад праект мы шукалі не столькі грошы, колькі інвестара, які будзе гарантаваць пастаўкі сыравіны. Нам не патрэбна рэканструкцыя дзеля рэканструкцыі. Прадпрыемства старэе, а яно павінна мець перспектыву. А якую перспектыву яно мае, мы пакуль не бачым», — адзначыў намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім».

Летась былі размовы наконт магчымага стварэння нафтахімічнага холдынгу з Расіяй. Тады пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў паведаміў, што ёсць працоўная група, якая займаецца гэтым пытаннем. Аднак намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім» Браніслаў Сівы заявіў журналістам, што ніякіх дакументаў наконт холдынгу кіраўніцтва канцэрна не мае, і ўвогуле падобную структуру ў Расіі няма з кім ствараць. «Сёння ў Расіі такога монстра, як мы, які б аб'ядноўваў столькі прадпрыемстваў, няма», — падкрэсліў спецыяліст.

Пытанні інвестыцый у хімічную галіну краіны ўздымаліся і падчас сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй рады дырэктараў ААТ «Мінеральна-хімічная кампанія «Еўрахім» Андрэем Мельнічэнкам. Кіраўнік Беларусі заявіў пра гатоўнасць разглядзець прапановы расійскага інвестара па мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці. Лукашэнка адзначыў тры беларускія прадпрыемствы хімічнага профілю, якія паспяхова працуюць на сусветных рынках. «Мы ўмеем выраблядь азотныя, фосфарныя, калійныя ўгнаенні. У нас вызначаны вялікі аб'ём мадэрнізацыі гэтых прадпрыемстваў», — адзначыў беларускі лідэр. Паводле яго меркавання, тэхнічным пераабсталяваннем хімічнай прамысловасці варта было б заняцца больш аператыўна. Андрэй Мельнічэнка падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца вельмі цікавым рынкам для кампаніі, і адзначыў, што летась «Еўрахім» паставіла ў Беларусь прадукцыі на 200 мільёнаў долараў.

ААТ «Мінеральна-хімічная кампанія «Еўрахім» — буйнейшы вытворца мінеральных угнаенняў у Расіі. Кампанія ўваходзіць у тройку еўрапейскіх і дзесятку сусветных лідэраў у гэтай галіне. Старшыня рады «Еўрахіма» Андрэй Мельнічэнка валодае 50- працэнтамі акцый Сібірскай вугальна-энергетычнай кампаніі, а таксама з'яўляецца буйным акцыянерам шэрагу электраэнергетычных кампаній Сібіры і Далёкага Усходу.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 1 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.10, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.15** У свеце матораў.
**08.45** Выпускныя іспыты па беларускай і рускай мовах за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных установах (з сурдаперакладам). Выпускны іспыт па матэматыцы за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных і спецыяльных установах (з сурдаперакладам).
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.40** «Зорныя танцы». Закл. перадача.
**11.05** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**12.10** «Здароўе».
**12.40** «Будні чэмпіёнаў».
**13.10** Камедыйны дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**17.50** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**18.50, 01.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.45** Рэспубліканскі дзіцячы конкурс «Песня для «Еўрабачання-2009» (паўфінал).
**23.35** Прыгодніцкі баявік «Першы ўдар» (Ганконг - ЗША - Аўстралія - Расія).
**01.15** Дзень спорту.
**01.25** Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША).

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 00.50** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** Тэорыя неверагоднасці. «Таемныя знакі зямлі».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсер. фільм.
**17.05** «Фатальнае каханне».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Гуманоіды ў Каралёве». Расія, 2008 год.
**19.05** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.05** «Паляванне на Берыю». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Зваротны адлік».
**00.05** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** Фільм «Аднойчы ў Галівудзе». ЗША.
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Спартыўны тыдзень».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Свае дзеці». Расія, 2007г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**00.25** «Гучная справа».

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Тэлебарометр.
**08.40** Усё аб бяспецы.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.55** Прэм'ера! Сямейны прыгодніцкі фільм «Мост у Тэрабіцыю» (ЗША).
**12.30** Слова пісьменніка.
**12.55** Вясковы дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы-2» (Расія).
**13.45** Бухта капітанаў.
**14.25** Пазакласная гадзіна.
**14.35** Таемны густ.
**15.05** Экспедыцыя.
**15.35** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія).
**19.45** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Экспедыцыя.
**21.05** Канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа».
**22.10** Лірычная камедыя «Мой тата - герой» (Францыя).

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.05** Святочны канцэрт да Дня абароны дзяцей «Дарослыя і дзеці».
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Ну пачакай..., Кацёначкін!». Дакументальны фільм.
**12.20** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** Дабрачынны канцэрт «Падаруй жыццё».
**15.30** Фільм «Дзіўныя дарослыя».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Храм дзяцінства Наталлі Дуравай».
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.20** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**22.15** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**23.10** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** «Кулагін і партнёры».

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** «Асоба небяспечны!».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.10** «Ты не паверыш! Ньюс».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Горад спакус».
**21.35** «Сумленны панядзелак».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.20** Серыял «Мент у законе».
**00.20** Серыял «Чужы твар».
**01.05** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**10.00** Матаспорт па выхадных.
**10.15** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ЗША. Заезд 2-і.
**11.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Валенсія, Іспанія). Заезд 2-і.
**12.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). 9-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**21.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**22.05** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Вось дык так!!!
**23.45** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі. 9-ы дзень.
**01.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**01.30** Веласпорт. «Тур Італіі». 21-ы этап.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** «Ранча», серыял.
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім быў Кірыла Тураўскі?».
**19.05** «Белы тэрор», дак. фільм, 2006 г.
**20.00** Тыдзень з радыё «Свабода».
**20.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.40** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў».
**21.00** Аб'ектыў.
**21.20** Асабісты капітал.
**21.35** «Знакамітасць», маст. фільм, 1998 г.
**23.25** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**00.10** Аб'ектыў (навіны).

## 2 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.20, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.10** Гатуем разам.
**08.25** «Арэна». Праграма аб спорце.
**08.45** Выпускны іспыт па матэматыцы за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі ў агульнаадукацыйных і спецыяльных установах (з сурдаперакладам). Выпускныя іспыты па беларускай і рускай мовах за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі ў агульнаадукацыйных установах (з сурдаперакладам).
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Тэрарыстка Іванова» (Расія).
**10.00** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**10.50** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**11.40** Відэафільм АТН «Верхнядзвінская адысея» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Хранікальна-дак. цыкл «Эпоха». Вынікі Канскага кінафэсту. Фільмы 1-ы і 2-і.
**13.10** Камедыйны дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Меладраматычны серыял «Дзве сястры» (Расія).
**16.55** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**17.50** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Серыял «Тэрарыстка Іванова».
**21.00** Панарама.
**21.45** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні» (ЗША).
**22.50** Гангстэрская драма «Білі Батгейт».
**00.50** Дзень спорту.
**01.05** Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША).

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Двайняты. Адзін лёс на дваіх».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Гуманоіды ў Каралёве». Расія, 2008 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**22.10** «След».
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Наша Russia».
**23.50** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.35** Нашы навіны.
**00.50** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Свае дзеці». Расія, 2007г.
**10.05** Пяць гісторый.
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Гаішнікі». Серыял.
**21.40** «Аўтапанарама».
**22.00** «Вайна. Вядомая і невядомая».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**23.55** «Надзвычайныя гісторыі».

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.05** Дакументальна-пазнавальны фільм «Апошні з хамякоў-гігантаў» (Францыя).
**12.00** Вясковы дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы-2» (Расія).
**12.45** Серыял «Адно каханне душы маёй» (Расія). 1-я серыя.
**13.45** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Бітва экстрасэнсаў.
**15.35** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія).
**19.45** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Экспедыцыя.
**21.05** Спорт-кадр.
**21.30** Фантастычны баявік «Хронікі Рыдзіка» (ЗША).

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**11.00** Весткі.
**11.20** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.35** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**12.25** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Андрэй Бітаў. Крок у бок ад агульнага струменя». Фільм 1-ы. Дак. серыял.
**14.50** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.40** Фільм «Дуброўскі». 1-я серыя.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Вандраванне натураліста».
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.20** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**22.15** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі+».
**23.40** «Кулагін і партнёры».
**00.10** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**10.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Жаночы погляд».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Пагоня за анёлам».
**12.05** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** «Асоба небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Горад спакус».
**21.35** «Вочная стаўка».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.20** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**00.15** Меладраматычны серыял «Чужы твар».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**10.00** Пляжны футбол. Кубак Еўропы ў Італіі. Фінал.
**11.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). 9-ы дзень.
**15.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Чвэрцьфінал. Прамая трансляцыя.
**21.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**21.30** Бокс. Міжнародны турнір у ЗША.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBC у ЗША.
**00.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Чвэрцьфінал.
**01.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**01.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**02.00** Матаспорт па выхадных.
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.55** «Усяго найлепшага!, дак. фільм, 2008 г., Венгрыя–Аўстрыя–Германія.
**20.15** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма).
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).
**21.15** Хто ёсць кім: Уладзімер Някляеў.
**21.35** Форум (ток-шоу): Кватэрнае пытанне.
**22.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**22.50** Госць «Белсату».
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**00.00** Аб'ектыў (навіны).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 3 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

### 1

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.10** Гатуем разам.
**08.25** Сфера інтарэсаў.
**08.45** Выпускны іспыт па беларускай мове за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных установах (з сурдаперакладам). Выпускны іспыт па рускай мове за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных і спецыяльных установах (з сурдаперакладам). Выпускны іспыт па матэматыцы за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных установах (з сурдаперакладам).
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Серыял «Тэрарыстка Іванова».
**10.00** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**10.50** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**13.05** Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Серыял «Дзве сястры» (Расія).
**16.55** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці».
**17.50** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**18.50, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Меладраматычны серыял «Тэрарыстка Іванова» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.50** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні» (ЗША).
**22.50** Трылер «Ашуканая» (ЗША).
**00.55** Дзень спорту.
**01.10** Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША).

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Гуманоіды ў Каралёве». Расія, 2008 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**22.10** «След».
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Наша Russia».
**23.50** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.35** Нашы навіны.
**00.50** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Гаішнікі». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Рэальны спорт».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40, 17.30** «Званая вячэра».
**13.50** «Top Gear. Руская версія».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**16.50** «Вайна. Вядомая і невядомая».
**17.20** «Міншчына».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Гаішнікі». Серыял.
**21.40** «Дабро пажалiцца».
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**23.55** «Дэтэктыўныя гісторыі».

### ЛАД

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.05** Свая музыка.
**11.30** Пасоўванне+.
**12.00** Спорт-кадр.
**12.25** Вясковы дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы-2» (Расія).
**13.15** Серыял «Адно каханне душы маёй» (Расія). 2-я серыя.
**14.15** Мультфільм.
**14.30** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.25** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія).
**19.45** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Экспедыцыя.
**21.05** «Іншыя».
**21.35** Камедыйны баявік «Васабі».
**23.15** Канцэрт К.Рычарда (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**12.20** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** «Андрэй Бітаў. Крок у бок ад агульнага струменя». Фільм 2-і. Дак. серыял.
**14.50** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.40** Фільм «Дуброўскі». 2-я серыя.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Спецыяльны карэспандэнт».
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.20** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**22.15** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі+».
**23.40** «Кулагін і партнёры».
**00.10** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Вочная стаўка».
**10.20** «Асоба небяспечны!».
**10.55** «Галоўная дарога».
**11.25** Серыял «Пагоня за анёлам».
**12.10** Серыял «Мент у законе».
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** «Асоба небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Горад спакус».
**21.35** «І зноў добры дзень!».
**22.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.20** Серыял «Мент у законе».
**00.15** Серыял «Чужы твар».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**10.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Чвэрцьфінал.
**15.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Чвэрцьфінал. Прамая трансляцыя.
**20.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**20.30** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**21.00** Вось дык так!!!
**21.15** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Егіпет - ААЭ.
**21.45** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Нідэрланды - Аргентына. Прамая трансляцыя.
**23.35** Конны спорт. Кубак нацый у Італіі (Рым).
**00.30** Абранае па серадах.
**00.35** Навіны коннага спорту.
**00.40** Гольф-клуб.
**00.45** Яхт-клуб.
**00.55** Абранае па серадах.
**01.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Чвэрцьфінал.
**02.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.55** «Рэквіем Незалежнасці», дак. фільм.
**19.20** Асабісты капітал.
**19.35** «Апошні сезон», серыял.
**20.30** Праект «Будучыня».
**21.00** Аб'ектыў.
**21.15** Без рэтушы: «Чырвоны беларус», 2009 г., Польшча.
**21.45** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім быў Кірыла Тураўскі?».
**21.50** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**23.15** З архіву «Jazz Jamboree»: «Джэк ДэДжонэт» (Jack DeJohnette).
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**00.00** Аб'ектыў (навіны).

## 4 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**05.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.15, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.10** Гатуем разам.
**08.20** Зямельнае пытанне.
**08.45** Выпускны іспыт па матэматыцы за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі ў агульнаадукацыйных установах. Выпускны іспыт па рускай мове за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных і спецыяльных установах. Выпускны іспыт па беларускай мове за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі ў агульнаадукацыйных установах.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладраматычны серыял «Тэрарыстка Іванова» (Расія).
**10.00** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**10.50** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**11.40** Відэафільм АТН «Мсціслаўскі шлях» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні» (ЗША).
**13.05** Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Уласны персанал.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Серыял «Дзве сястры» (Расія).
**16.55** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**17.50** Серыял «Два бакі адной Ганны».
**18.50, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Серыял «Тэрарыстка Іванова».
**21.00** Панарама.
**21.45** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні» (ЗША).
**22.50** Крымінальная драма «Гульня Рыплі» (Італія - ЗША - Вялікабрытанія).
**00.55** Дзень спорту.
**01.05** Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША).

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Гуманоіды ў Каралёве». Расія, 2008 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Шальны анёл». Шматсерыйны фільм. Заключная серыі.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Злачынствы стагоддзя».
**00.00** «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажалiцца».
**08.50** «Гаішнікі». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Далёкія сваякі».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.50** «Прыватныя гісторыі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**16.50** «Ля парадната пад'езду».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Гаішнікі». Серыял.
**21.40** «Аўтапанарама».
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**23.55** «Сакрэтныя гісторыі».

### ЛАД

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія).
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.05** Невытлумачальна, але факт.
**11.50** Дак.-пазнавальны фільм «Сланы і людзі. Барацьба за жыццёвую прастору».
**12.45** Вясковы дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы-2» (Расія).
**13.35** Серыял «Адно каханне душы маёй» (Расія). 3-я серыя.
**14.30** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**15.20** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.25** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія).
**19.45** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Экспедыцыя.
**21.05** Час футболу.
**21.35** Камедыя «У краіне жанчын» (ЗША).
**23.15** «Проста праграма».
**23.55** «Вечар з Пласіда». Канцэрт (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2», Расія, 2008 г.
**12.20** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Андрэй Бітаў. Крок у бок ад агульнага струменя». Фільм 3-і. Дак. серыял.
**14.50** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.40** Фільм «Дуброўскі». 3-я серыя.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Відавочнае-неверагоднае».
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**21.20** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2», Расія, 2008 г.
**22.15** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** «Весткі+».
**23.40** «Кулагін і партнёры».

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Кухары і кухцікі».
**10.50** «Барацьба за ўласнасць»».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Пагоня за анёлам».
**12.05** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** «Асоба небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Горад спакус».
**21.35** «Рускія не здаюцца!».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.20** Серыял «Мент у законе».
**00.15** Серыял «Чужы твар».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**10.00** Конны спорт. Кубак нацый у Італіі (Рым).
**11.00** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Нідэрланды - Аргентына.
**12.15** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Чвэрцьфінал.
**15.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**19.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**19.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Партугалія - Чылі. Прамая трансляцыя.
**21.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР.
**21.45** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Францыя - Катар. Прамая трансляцыя.
**23.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Паўфінал.
**01.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**01.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Партугалія - Чылі.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**19.35** «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**20.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).
**21.15** Сальда (эканамічная праграма).
**21.30** Дакументальная гадзіна: «У пошуку ідыш», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2008 г., Беларусь.
**23.00** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**00.00** Аб'ектыў (навіны).

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

**Выпуск №2 (30) (травень)**

www.litbel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


Літаратурна-грамадскія навіны месяца ........ с. 2

Ніл Гілевіч: «Забаўныя гісторыі з жыцця пісьменнікаў» ... с. 3

Вершы Анатоля Івашчанкі ........ с. 4

Аповеды Усевалада Сцебуракі ........ с. 5

«Пераклад»: апавяданне Руала Дала «Скура» ........ с. 6–7

Быліца Сяргея Астраўцова, «Паліца» і «Цытатнік» ........ с. 8


ЭСЭ

# У ПОШУКАХ ПРЫВІДА МЕСІІ

*Алесь ПАПЛАЎСКІ*

**Яшчэ толькі збіраюцца вастрыць свае сякеры мяснікі-расфасоўшчыкі… Яшчэ не паспелі прапахнуць свежай крывёю мясныя крамы... А людзі стаяць ужо ў чэргах. Праменяцца хваравітымі ўсмешкамі іх непрытомныя вочы. Кропелькамі поту блішчыць на змарнелых тварах сонца. І мухі!.. Паўсюль надакучлівыя, ненажэрныя зялёныя мухі!..**

**Гэты дзень мог бы падацца мне такім жа шэрым і незапамінальным, калі б не той працяглы жаночы енк — візглівы, нібыта бензапіла:**

**– Не-на-віджу-у-у!.. Народ мінус «Я» — яшчэ не ўвесь народ!..**



Магчыма, гэты неаптымістычны фрагмент з жыцця незнаёмай мне жанчыны, падгледжаны і падслуханы некалі выпадкова, мог бы стаць эпіграфам да маіх супярэчлівых палемічных нататак, тым больш, што гаворка наша якраз і пойдзе не на аптымістычныя тэмы. Але не станем спяшацца з дачаснымі высновамі…

Ёсць аўтары, якіх трэба чытаць са шпількаю ў руцэ, каб не задаць храпака на самым «цікавым» месцы, тым больш, калі чытво гэтае — публіцыстыка. А ёсць Віктар Казько, твораў якога чакаеш з нецярпеннем, не гледзячы, што даводзіцца нярэдка чуць, нават ад тых жа калег па літаратурным цэху, што, маўляў, проза Віктара Казько — «жалезабетонная», «кулянепрабівальная», а значыць цяжкая для ўспрымання. Безумоўна, Віктар Казько — не Аляксандра Марыніна, і для аматараў літаратурных «тралі-валі» не можа быць блізкім па духу. Яго творамі здольныя зацікавіцца людзі падрыхтаваныя, удумлівыя. Аднак не станем заглыбляцца ў абстракцыі і засяродзім увагу на канкрэтыцы. Перачытаем яго апошнюю з апублікаваных рэч: «Зазірнуць у вочы свайму «Я»», надрукаваную ў часопісе «Дзеяслоў» (№29).

«З чаго пачаць?» — задае рытарычнае пытанне герой Віктара Казько на самым пачатку свайго аповеда і, не вагаючыся, заяўляе: «З горычы. З адчування апошнім часам няўтульнасці жыцця. Няёмкасці перад ім і нават перад самім сабой за тое, што ты яшчэ жывы, век твой яшчэ не скончыўся, а ты нібыта сыйшоў з яго, выпаў, згубіўся, знік. Цябе няма і як увогуле не было на гэтай зямлі…»

Апавядальнік дзейнічае на ўзроўні голасу і слыху, празаік — на ўзроўні сэрца, розуму і душы, пісьменнік — на касмічным узроўні. Апавядальнік гаворыць аб тым, як жывуць людзі, празаік — аб тым, як павінны жыць людзі, пісьменнік — аб тым, дзеля чаго жывуць людзі…» Менавіта на выказванне Сяргея Даўлатава мне б і хацелася спаслацца, бо якраз у гэтых трох іпастасях, як мне здаецца, і паўстае перад сваімі чытачамі Віктар Казько — аўтар аповесці «Зазірнуць у вочы свайму «Я»».

Хто мы?.. Які сапраўдны твар у чалавека нашага часу?.. Скуль у нас адчуванне ўсёй гэтай сваёй непаўнавартаснасці? Чаму наш народ такі безаблічны сярод іншых народаў?.. Вось якія пытанні цікавяць найперш героя аповеда. Не меншая цікавасць да ўсяго гэтага і ў нас, чытачоў. Здаецца б, пара набіць аскоміну на сваім самаедстве, насамрэч — не, баліць. Бо і «…зямля ўжо не трывае здзеку часу і людзей. Яна бунтоўна прарастае каменнымі крыжамі. Крыжамі, што паўстаюць з пралітай у свой час крыві… і … няма ў нас сёння і знаку глыбокай даўніны. Але і больш блізкай няма… Бо сёння ўсе мы, беларусы, і, канечне, перш наперш тыя, хто хоць крышку насуперак, стаім пастроеныя па камандзе смірна перад шыбеніцай. І кат ужо намыльвае вяроўку, каб не мулка было завіснуць у пятэльцы на стагоддзі».

Чаму гэтыя пытанні паўстаюць перад намі, беларусамі, на працягу многіх ужо стагоддзяў, чаму яны вярэдзяць, займаюць розум неабыякавых да лёсу радзімы людзей? Чаму актыўная меншасць пакутуе з-за маўклівай згоды палахлівай большасці? Няўжо нам нічога і не засталося ўжо, акрамя гэтага занудлівага калупання ў сваіх заганах і недахопах? Чаму блукаем мы, як бяздомныя па пустыні сваёй непаўнавартаснасці ў пошуках нейкага глыбіннага ды існага з адной толькі мэтай: каб ніколі не знайсці, а значыць не знайсці і сябе, сваёй Радзімы? Чаму мы людзі другога кшталту?..

У сваім творы Віктар Казько спрабуе даць адказы на ўсе гэтыя пытанні. Названы твор — гэта глыбокі і дэталёвы аналіз нашай сутнасці, як народа, як нацыі. Гэта праўдзівая, хоць і падчас невымерна-жорсткая, я б сказаў, нават бескампрамісная споведзь падманутага пакалення. Пакалення, якое выпала з абоймы жыцця, завісла недзе ў міжчассі. «Зазірнуць у вочы свайму «Я»» — гэта спроба аналізу ўсёй нашай гісторыі, калі такая была ў нас насамрэч. Бо, як прызнаецца аўтар, «...мы народ пазагістарычны». І нельга не пагадзіцца з ім, бо «…памяць стагоддзяў нашага народу ніколькі не траўмавана ў нас… бо мы любім пакутваць, не памятаючы пры гэтым пра сваіх пакутнікаў, на іх магілах ставім помнікі іх забойцам і катам. Дзе нашая нацыянальная вартасць і годнасць, ці ёсць у нас, я ўжо не кажу — гістарычная, хаця б кароценькая, аднадзённая памяць? Напэўна, мы не маем такой памяці. Напэўна, мы страцілі, у нас сцёрлі яе. Сцёрлі, зразумела, у тых, у каго было што сціраць…»

Шмат месца ў творы адведзена і паняццям культуры, якой не засталося нічога, акрамя як «…пайсці ў апазіцыю да ўлады». Бо: «…ці можна лічыць інтэлектуальным набыткам і культурай тое, што па сутнасці сваёй з'яўляецца абслугай — службовым ведамствам улады. Яе хісткім ценем і падтанцоўкай, што, не маючы іскры Божай, спажывае імёны вялікіх нашых нябожчыкаў, маніпулюе імі і прыстасоўвае да сваіх патрэбаў…»

Твор Віктара Казько — неаспрэчна песімістычны, хаця прабліскі нейкай надзеі ўсё ж прысутнічаюць у ім. Яны, нібы тыя сігнальныя маячкі, прабіваюцца да чытача праз горыч і расчараванне апавядальніка. Бо «…штось там ні гаварылі, няхай і тагасветна, а Беларусь ёсць, існуе. Жыве Беларусь і будзе жыць. Усё мінецца, а праўда застанецца, нягледзячы на здзек, пагарду і абразу…». Але, зноў-такі, гэта закіды на аванс. Гэта той аптымізм, якога я, як чытач, чакаю на працягу ўсяго аповеду, якога шукаю наўмысна, бо ў крыві нашай — спадзявацца да апошняга... Але ці тая гэта Беларусь, аб якой марылі Уладзімір Караткевіч і Васіль Быкаў? Ведома ж — не, бо якія мы, такая і наша Радзіма — спажывецкая, без гісторыі і памяці. Адчуванне незапатрабаванасці і непатрэбнасці ціснуць на свет цяжарам нашага граху. Вось мы і валачэм праз вякі на сваіх плячах гэты цяжэзны камень. І ўсё яшчэ застаемся ў становішчы вечнага чакання — чакання прывіду Месіі. Таму і не дзіва, што нам хочацца зазірнуць яму ў вочы, убачыць іх вялікасці твар. «Які ён?» — пытаецца ў пустэчы аўтар, але ў адказ чуе адны толькі выверты скажонага стагоддзямі рэха. А мы павінны стварыць сваё: сваю гісторыю, свае словы, а не запазычаць іх у некага. Нават і ў такой краіны, як Расія. Пішу гэтыя радкі, а ў самога ў галаве круціцца пранізлівае да слёз прызнанне паэта-эмігранта Масея Сяднёва:

*Я цэлае сваё жыццё аддаў слову.*
*Дзеля яго пакутваў за кратамі.*
*На алтар слова склаў ахвяры.*
*І як жа балюча ўсведамляць,*
*што яно цяпер непатрэбнае.*
*Яго зракліся браты-беларусы.*
*О ты, маё неспазнанае слова,*
*навошта я мучыўся табою?*

Колькі іх такіх — зняверaных і расчараваных: і на радзіме, і за яе межамі? Напісаныя паэтам яшчэ ў 1988 годзе радкі актуальныя і цяпер. Нічога не памянялася і, па ўсім відаць, не памяняецца ўжо ў хуткім часе . У чым ці ў кім тады нашыя надзеі і спадзяванні? Дзе тое выйсце з сітуацыі, у якой апынуўся цэлы народ?..

Шукаю адказы на гэтыя пытанні і не знаходжу іх. Спадзяюся на нешта, перачытваю наноў прачытанае, спрабую расшыфраваць схаваныя між радкоў патрэбныя суцяшальныя словы. А можа, яны павінны быць такімі: «…чаго ківаць на іншых? Мо гэта ў мяне самога твар крывы. І ні на каго іншага, гэта я на самога сябе гляжу ў люстэрка і касавуруся — ванітаваць верне…».

Што ж, магчыма, ідэя гэтакага ўсеагульнага перавыхавання і магла б зрабіцца тым выйсцем, той выратавальнай саломінкай, якое я шукаю, але стаць іншым — гэта не значыць памыцца ў лазні. Таму і гэтая мая ілюзія — фікцыя.

Прывід чаркі са шкваркай узведзены ў маёй краіне ў ранг нацыянальнай ідэі. Пах бясплатнага сыра ў пастцы забівае ўсе астатнія пахі. Страх страціць тое — мізэрнае, чым мы валодаем, чым цешымся, — робіць нас пакорлівымі і бяззубымі. Гэты страх стаў нашым Месіяй. Ён водзіць нас па пустыні нашай бездухоўнасці. І адзінае, што нам засталося, гэта сузіраць і ганарыцца прыгажосцю прывідных міражоў. А таму спрачацца з пісьменнікам цяжка, бо «няма і не будзе вам дарогі ў цывілізаваны свет, Ёрыкі. Пустыя вашыя вачніцы. Чарапы вачэй не маюць…».

Пад абразамі растане воск. Людзі развітаюцца з Богам, каб успомніць пра Яго толькі праз тыдзень. Дзверы Храма зачыняцца… І нам застанецца чакаць і спадзявацца, што званы некалі паклічуць нас, бо Месія — як і міф: калі яго няма, яго трэба прыдумаць!..

ІМПРЭЗЫ


Ірына Быкава і аўтары мемарыяльнай шыльды.

# СУСТРЭЧЫ Ў ПАМЯЦЬ ПРА ВАСІЛЯ БЫКАВА

**14 траўня ў Віцебску прайшлі грамадскія сустрэчы, прысвечаныя памяці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава.**

Прадстаўнікі Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч і Барыс Сачанка, удава творцы Ірына Быкава, старшыня Віцебскага аддзялення Таварыства беларускай мовы Іосіф Навумчык, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення СБП Франц Сіўко, паэт Давыд Сімановіч, бард Кастусь Герашчанка, а таксама прадстаўнікі інтэлігенцыі Віцебска наведалі памятныя быкаўскія мясціны.

Ірына Міхайлаўна Быкава ўпершыню ўбачыла мемарыяльную шыльду на будынку Віцебскай мастацкай вучэльні, дзе некалі вучыўся Васіль Быкаў. На адкрыццё гэтай шыльды летась віцебскія ўлады ўдаву пісьменніка не запрасілі. Госці абласнога цэнтра і гарадчукі пад пільным вокам відэакамеры «людзей у штацкім» усклалі кветкі да мемарыяльнай дошкі. Ірына Міхайлаўна сфатаграфавала яе, каб здымкі засталіся на памяць, і ўрэшце пазнаёмілася з аўтарамі — віцебскімі скульптарамі Аляксандрам Гвоздзікавым і Валерыем Магучым.

«Уражанне ад вашай працы вельмі добрае. Добрае, таму што тут месца, дзе памяць адзначаная. А гэта вельмі шмат! І Васіль падобны да сябе. Дзякуй вам вялікі!», — сказала ўдава. «А вам здароўя, Ірына Міхайлаўна», — пажадаў скульптар Валеры Магучы.

Ягоны калега Аляксандар Гвоздзікаў згадаў, што яны са спадаром Магучым чакалі амаль чатыры гады, пакуль мемарыяльную дошку ў гонар Быкава гарадскія ўлады ўсё-ткі вырашылі ўсталяваць: «Чатыры гады рабілі, таму што не было фінансавання. І ўрэшце амаль што за ўласны кошт давялося яе адліваць. Ну што зробіш, калі на памяць пра вялікіх людзей у дзяржавы бракуе грошай...».

Усталяваць мемарыяльную дошку ў памяць пра Васіля Быкава яшчэ ў 2004-м годзе прапанавала Віцебская абласная рада ТБМ.

Працягам акцый па ўшанаванні памяці вялікага пісьменніка стала перадача новых тамоў твораў Быкава гарадской і раённым бібліятэкам вобласці. Адбылася сустрэча ў абласной бібліятэцы. Спадарыня Ірына прапанавала перадаць для віцебскіх чытачоў яшчэ й выданні са свайго хатняга кнігазбору.

Вечарам аматараў слова чакала літаратурная вечарына ў віцебскай «Еўрапейскай хатцы».

# ТВОРЧАМУ РОДУ НЯМА ПЕРАВОДУ

**Вечарына пад такой назвай прайшла 15 траўня ў мінскай бібліятэцы імя Цёткі (Талбухіна, 12).**

Сям'я як творчасць — найбольш цікавая праява жыцця. Творчасць у сям'і — найбольш складаная праява сям'і. Вас чакае шматабяцальная сустрэча. Пад такім лейтматывам гучалі выступы літаратараў і мастакоў Галіны Дубянецкая і Сяргея Сыса (жонка муж), Яраша Малішэўскага і Аксаны Спрынчан (муж і жонка), Людмілы Рублеўскай і Віктара Шніпа (жонка і муж), Максіма Клімковіча і Ірыны Клімковіч (муж і жонка), Вадзіма Клімовіча і Наталлі Клімовіч (брат і сястра), Яны Шэляговіч і Хрысціна Шэляговіч (сёстры), Міхася Шавыркіна, Міраславы Навіш, Вальжыны Прохаравай (дзед і бацька, дачка і маці, дачка і ўнучка).

У антракце вечарыны адбылося адкрыццё выставы сям'і Алены Масла з творчымі працамі мужа Сяргея, сына Кастуся і дачкі Хрысціны Пержуковых. А таксама прэзентацыя абрадавых лялек, жыццё якіх цесна звязанае з жыццём сям'і. Госці былі адораныя каменчыкамі Удзячнасці.

# ПАЭЗІЯ ЯК ПРАДЧУВАННЕ

**Пад такой назвай 16 траўня ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Я. Коласа ў Мінску прайшоў літаратурны вечар, прысвечаны перакладам паэмы народнага паэта Беларусі Якуба Коласа на еўрапейскія мовы. Вечар ладзіўся ў межах акцыі «Ноч музеяў-2009», прысвечанай Году роднай зямлі і 50-годдзю адкрыцця Коласаўскага музея.**

Галоўны захавальнік фондаў Антаніна Гарон пазнаёміла з экспазіцыяй «Нас слова Коласа яднае. Паэма «Новая зямля» ў перакладах», у якой прадстаўленыя ўсе 23 прыжыццёвыя выданні эпічнай паэмы, напісанай у 1910-1923 гадах.

Сярод перакладчыкаў «Новай зямлі» на расійскую, польскую і ўкраінскую мовы яна назвала адпаведна Сяргея Гарадзецкага, Чэслава Сэнюха і Валерыя Стралко. Цяпер Вера Рыч у Лондане працуе над ангельскім перакладам паэмы песняра, творы якога выдадзеныя на 41 мове народаў свету, паведаміла А.Гарон.

Фрагменты паэмы на расійскай, украінскай і польскай мовах прачыталі старшыня МГА «Русь адзіная» Міхась Ткачоў, супрацоўнікі пасольстваў Украіны і Польшчы ў Беларусі Анатоль Емяльяненка і Эльжбэта Шчэпаньска-Даброўска.

Артысты Новага драматычнага тэатра Мінска паказалі спектакль па аповедзе Я.Коласа «Недаступны» (рэжысёр Аляксандр Гусеў), студэнты філалагічнага факультэта Беларускага дзяржуніверсітэта прынялі ўдзел у конкурсе на лепшы пераклад раздзелаў «Новай зямлі» на адну са славянскіх моў.

Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур прадставіў святочную праграму з удзелам Рускага народнага хора імя А.Нікіцінай, ансамбля польскай песні «Тэнча», украінскага фальклорнага тэатра песні «Ватра», а таксама калектыва «Першацвет» сталічнай школы № 13.

# ДНІ КУЛЬТУРЫ ШВЕЦЫІ

**Традыцыйныя Дні культуры Швецыі ў Беларусі, якія ладзяцца Амбасадаю Швецыі, пройдуць з 20 траўня па 17 чэрвеня..**

Пачаткам гэтых рознапланавых мерапрыемстваў стала прэзентацыя першай беларускамоўнай кнігі паэта, перакладчыка і драматурга Дмітрыя Плакса «Трыццаць тэкстаў», якая адбылася ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча 20 траўня.

Перакладчык, рэдактар беларускай праграмы «Радыё Швецыя» Дмітры Плакс вядомы як аўтар беларускага перакладу кнігі Астрыд Ліндгрэн «Піпі Доўгаяпанчоха», а таксама кнігі беларускага празаіка Барыса Пятровіча «Фрэскі» на шведскую мову.

21 траўня ў Акадэміі мастацтваў прайшла сумесная вечарына шведскай і беларускай літаратуры. З боку Швецыі ўдзельнічалі пісьменнікі Мікаэль Ніэмі, Пэтэр Фробэрг Ідлінг, Улінэ Сціг, Аніка Нурлін і Дмітры Плакс; ад Беларусі — Алесь Разанаў, Анатоль Вярцінскі, Людміла Рублеўская, Андрэй Хадановіч і Валярына Кустава.

У праграме Дзён культуры Швецыі — іншыя літаратурныя, а таксама музычныя і кінамерапрыемствы ў Мінску і Пінску.

ПРАЕКТЫ

# МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫ ЧАСОПІС «34»

**Выйшаў у свет штомесячны дыск-часопіс «34». Адна з першых ягоных прэзентацый адбылася 5 траўня ў кінаклубе «НаУКМА» — у межах фестывалю «Беларуская вясна-2009», які ладзіўся пры падтрымцы кампаніі «Будзьма беларусамі!»**




Рэдактар праекта Крысціна Карчэўская распавяла пра ідэю незвычайнага часопіса, асаблівасці яго распаўсюду і будучыя планы.

Стваральнікі часопіса — людзі розных прафесій. Адарваўшыся ад спраў, яны на пэўны час пакідаюць усе клопаты і зачыняюцца ў «крэатыўнай кухні», на якой і «варыцца» «34». Не зважаючы на нестандартны фармат, часопіс мае папулярнасць нават за межамі Беларусі.

Пасля невялікай дыскусіі наведвальнікаў прэзентацыі чакалі цікавыя мульцяшкі, кароткія фільмы на актуальныя тэмы — пад акампанемент лёгкай і вясёлай музыкі.

«У крыніцах ідэй часопіса не бачна дна, — адзначылі стваральнікі. — І таму сёння ён збіраецца пашыраць аўдыторыю праз інтэрнэт. Хутка доступ да «34» будзе мець кожны ахвотнік.

# «КНІГА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА...»

**У Польшчы выйшла кніга беларускіх, польскіх ды летувіскіх аўтараў пра супольную гістарычную краіну-радзіму.**

550-старонкавы фаліянт распавядае пра гісторыю і культуру былой агульнай дзяржавы беларусаў, палякаў і летувісаў. Ён прысвечаны 1000-годдзю першае летапіснае згадкі пра Літву, якое сёлета адзначаецца краінамі-спадкаемцамі ВКЛ. Кнігу атрымаюць у дар галоўныя бібліятэкі, музеі ды іншыя культурныя інстытуцыі краіны.

Ідэя выдання належала інтэлектуалам Беларусі, Літвы і Польшчы, сярод якіх былі Чэслаў Мілаш, Томас Венцлава, Анджэй Струміла. Якраз апошні, вядомы польскі мастак, зрабіў найбольш намаганняў для рэалізацыі праекта — як народжаны ў Вільні (ён стаў і аўтарам канцэпцыі кнігі, і аўтарам прадмовы).

Чатырохмоўная «Кніга Вялікага княства Літоўскага» — сумесная праца навукоўцаў і пісьменнікаў Беларусі, Літвы і Польшчы. Тэксты паралельна пададзеныя па-ангельску, па-беларуску, па-літоўску і па-польску. Беларусь у ёй рэпрэзентуюць гісторыкі Генадзь Сагановіч і Алег Латышонак, публіцыст Сяргей Дубавец, літаратары Сакрат Яновіч і Уладзімер Арлоў.

Кніга багата праілюстраваная, у чым заслуга мастакоў Анджэя Струміла і Зміцера Герасімовіча. У ёй змешчаныя рэпрадукцыі старадаўніх гравюраў, абразоў, жывапісных палотнаў і мапаў, фотаздымкі архітэктурных помнікаў, сярод якіх ёсць надзвычай рэдкія, невядомыя нават спецыялістам.

Першая прэзентацыя «Кнігі Вялікага княства Літоўскага» прайшла ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, дзе адкрылася выстава графікі Анджэя Струміла.

# КНІГА ПАМЯЦІ АНАТОЛЯ СЫСА

26 кастрычніка спаўняецца 50 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта Анатоля Сыса. На радзіме паэта, які пакінуў гэты свет чатыры гады таму, у вёсцы Гарошкаў, адбудзецца традыцыйнае паэтычнае свята «Дух — гэта, людзі, Я!..»

Да гэтай падзеі сябры творцы рыхтуюць кнігу ўспамінаў і паэтычных прысвячэнняў.

Сябры ініцыятыўнай групы звяртаюцца да літаратараў, якія маюць паэтычныя творы, прысвечаныя Анатолю Сысу, з прапановай да 1 чэрвеня даслаць іх на разгляд рэдактараў-укладальнікаў па наступных адрасах: info@litbel.org або sys55s1@gmail.com, ці звярнуцца пісьмова ў рэдакцыю часопіса «Дзеяслоў»: 220025. г. Мінск-25, а/с 91.

**Паводле БелАПАН, Радыё Свабода, www.litbel.org, www.budzma.org, www.belarus.org.ua і ўл. інфармацыі.**

ШЛЯХ

# НА ТРЭЦЯЙ УСЕСАЮЗНАЙ У МАСКВЕ

## ЗАБАЎНЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ПІСЬМЕННІКАЎ

Ніл ГІЛЕВІЧ

Летам 1955-га я атрымаў з Саюза пісьменнікаў ліст: «Вы рэкамендаваны на ІІІ Усесаюзную нараду маладых пісьменнікаў, якая адбудзецца ў верасні г.г. у Маскве...». Узрадаваўся незвычайна. Якая выдатная магчымасць пазнаёміцца з лепшымі паэтамі-равеснікамі з іншых рэспублік, асабліва — з расійскімі і ўкраінскімі (з лепшымі, вядома, бо на ўсесаюзную нараду горшых не пасылаюць, — так мне тады думалася). Паводле беларускай квоты на нараду былі рэкамендаваны: паэты Сцяпан Гаўрусёў, Пятрусь Макаль, Ніл Гілевіч, празаікі Аляксей Карпюк і Пятро Васілеўскі, драматург Алесь Махнач, ад пісьменнікаў, што пішуць для дзяцей, — Артур Вольскі...



Памятнай аказалася ўжо сама дарога да Масквы. Разам з маладымі ехалі на нараду, у якасці настаўнікаў, і сталыя майстры слова Аркадзь Куляшоў і Пятрусь Броўка (такое было з СП СССР патрабаванне). Настаўнікі, помню, пасяліліся ў другім купэ, мы з Гаўрусёвым — па суседству, побач (Макаль з намі не ехаў, ён служыў тады ў Падмаскоўі ў войску і далучыўся да нас на нарадзе). У купэ настаўнікаў «загаманілі» ўжо на перагоне ад Мінску да Смалявічаў. У нас было ціха, тым больш што практыкі дарожных пасядзелак у мяне, ды і ў Сцяпана, яшчэ не было ніякай. У Барысаве цягнік спыніўся на хвілін пяць, а можа, і на болей, бо, выйшаўшы з купэ, я ўбачыў праз вакно, як некаторыя пасажыры рванулі ў памяшканне станцыі. Папераддзе ўсіх, амаль бягом, крытык Алесь Кучар, — аказваецца, і ён едзе, пры пасадцы ў Мінску яго я не бачыў. Падышоў і стаў побач Сцяпан, услед і Пятро Васілеўскі. Спытаў, колькі стаяць будзем, і тут жа, не чакаючы адказу, усклікнуў:

— Ты паглядзі, паглядзі на гэту сцервозу Кучара! Колькі ён каньяку валачэ з буфету! Ёлкі-маталкі! Цікава, як ён, курдупель, узлезе з гэтымі бутэлькамі на падножку!..

Бутэлек у «курдупеля» было сапраўды мнагавата: па адной тырчэла з кішэняў расхінутага паліто, і штукі чатыры ці пяць — як абярэмак дроў — ён сціскаў абедзьвюма кароткімі рукамі-лапамі каля грудзей. З яго ростам і без нічога ў руках узабрацца на падножку няпроста, а з такім каштоўным шкляным грузам... цікава! Казалі, чуў у «асяроддзі», што ўвышкі гэты крытык быў метр сорак, але, відаць, сябры-пісакі трохі хлусілі, думаю, што паўтара метра ён усё-такі быў. Ды ў плячах амаль метр.

— Вось гэта размах! Як і мае быць у класікаў! — зазначыў Сцяпан. — І да Масквы не пап'юць.

Да Масквы было яшчэ далёка. Яшчэ не даехалі да Оршы, калі той жа Кучар уткнуў галаву ў наша купэ і голасна абвясціў:

— Зайдзіце, хлопцы, да нас, Пятрусь і Аркадзь просяць, толькі вас, паэтаў. Хуценька! Па чарцы каньяку дадзім!

Для мяне было дастаткова гонару і ад таго, што з жывымі класікамі еду ў адным вагоне. Ну а тут — нават разам пасядзець за чарчынай? Гэта ўжо Бог ведае за што такая ўзнагарода!.. Канешне ж, чакаць нас мы сваіх настаўнікаў не прымусілі: імгненна апынуліся ў суседнім купэ. Нам далі месца прысесці, і Пятрусь Усцінавіч шчодра плялёхнуў у вялікія чайныя шкляныя каньяку.

— Во, цяпер і пагутарым іначай. А то мы ўжо ўсе тэмы вычарпалі, — па-сяброўску падахвоціў нас Пятрусь Усцінавіч.

— Праўда, закускі вам ужо амаль не засталося, — спачувальна ўсміхнуўся Аркадзь Аляксандравіч.

— Чакайце! — схамянуўся Пятрусь Усцінавіч. — Там жа ў мяне ў партфелі павінны яшчэ каўбаскі быць! Алесь, — павярнуўся да Кучара, — падай сюды партфель. Сам бачыў, як Лёля клала ладны скрутак каўбасак — свайго вырабу, цешча мая спецыялістка па іх, Аркадзь і многія хлопцы гэта ведаюць, якія яна робіць каўбаскі, вот і вы будзеце ведаць...

Скрутак у прамасленай (тлустыя!) паперы апынуўся на стале. Пабег, «ні стуча, ні груча, па жылачках шчыкача», каньячок, пайшлі — не пайшлі, а паляцелі, аж загудзелі, — каўбачкі, пацякла-палілася гамонка... Каўбаскі, навелічкі — як ладныя яловыя шышкі, былі незвычайнай смакаты, і я хацеў працягнуць руку да скрутку яшчэ раз, дый запыніўся, засаромеўшыся, маўляў, трэба ж і меру знаць. Броўка няйначай як заўважыў гэту маю нерашучасць, падчапіў ёмкую, у застылым тлушчы, каўбаску на відэлец, працягнуў мне і загадаў:

— Еш! Бо ты вельмі худы. Чаму ты гэтакі худы? Такі таленавіты — і такі худы! Гэта ненармальна!..

З усяго, пра што гаманілі ў купэ, запомнілася як найбольш важнае тое, што нам сказаў пры гэным століку Пятрусь Усцінавіч, — пакуль мы са Сцяпанам яшчэ добра не захмялелі.

— Галоўнае, хлопцы, вы там, на нарадзе, не вытыркайцеся, не лезце. Вы — здольныя і таленавітыя, але — трымайцеся сціпла. Нас паважаюць і любяць за сціпласць, за тое, што мы не вытыркаемся. І вы не вытыркайцеся. Бо там, ведаеце, могуць быць усякія гаворуны, вы з іх прыкладу не бярыце... Я вам даю разумную параду, во хай і Аркадзь скажа, — павёў ён рукою ў бок Куляшова.

— А я скажу: лезьце, хлопцы, і вытыркайцеся! — хітра падміргнуў нам і весела засмяяўся Аркадзь Аляксандравіч.

— А я так скажу: на агародзе першай вырываюць тую моркаўку, што вытыркаецца, — парыраваў і зарагатаў з уласнай дасціпнасці Броўка.

«На агародзе — гэта праўда, — падумалася тады мне. — А ў літаратуры? І што значыць — вырываюць? Нейкія страшныя асацыяцыі. Пра «вырваных» гаварылася ў апошні час усё часцей і ўсё больш адкрыта... Многія «вырваныя» пачалі вяртацца ў літаратуру, тым лікам і ў нашу беларускую».

Значыць, не вытыркацца. Не лезці і не вытыркацца. Таксама — урок вучням. Яшчэ маладым, хоць ужо і не «зялёным».

***

...Уступнае слова на Пленуме — палымянае, пафаснае — сказаў Першы сакратар Праўлення СП СССР Аляксей Суркоў. Імя, вядомае мне з даваеннага часу па любімых у нашай хаце песнях «По военной дороге» і «На седых уральских кручах» (пра гібель Чапаева).

Праз колькі хвілін, як нарада пачалася, на сцэну з-за кулісы выйшаў Міхаіл Шолахаў. Вялікія так і павінны рабіць, паяўляцца са спазненнем, а не ў кучы з меншымі. Выйшаў — у гімнасцёрцы, у галіфэ, у ботах (1956 год!). Невысокага, можа, нават трохі ніжэй сярэдняга росту, русявенькі, высока — па-афіцэрску — падстрыжаны. Яшчэ не дайшоў да прэзідыума (сцэна — шырачэзная), як у зале ўспыхнулі, напачатку разрозненыя, воплескі. Напэўна, не ўсе з нас, удзельнікаў нарады, у першы момант пазналі яго, але так доўжылася імгненне, а тады — раптам — выбухнуў гром апладысментаў. У зале ўсе падняліся. Убачыўшы такую бурную радасць, Міхаіл Аляксандравіч у знак прывітання і ўдзячнасці прыклаў руку да сэрца і сеў у трэцім радзе прэзідыума з самага краю. «Ужо можна лічыць, што ў Маскву мы прыехалі недарэмна», — напаўголаса сказаў я Сцяпану. Углядаюся ў аблічча славутага пісьменніка: хударлявы, вузкія пакатыя плечы, пасівелыя вусы. Пераводжу позірк на іншых. Усе — у строгіх гарнітурах, пад гальштукам, а ён — у гімнасцёрцы. Чаму? Усе — багатыя, а ён — бедны? Ды не, канешне! З-за сціпласці? Па звычцы? А адкуль звычка? Яшчэ з часоў «грамадзянскай»?

Даклад сакратара праўлення СП В. Ажаева — галоўны даклад на нарадзе — меў назву «Маладыя сілы савецкай літаратуры і задачы СП СССР у галіне выхавання маладых літаратараў» (ох, гэтае «у галіне»! Ну чыноўнік! Па-пісьменніцку звязаць словы не могуць!)...

Садаклад аб паэзіі зрабіў вядомы літаратурны крытык А. Макараў. Майму маладому самалюбству ён дагадзіў: у пераліку імён таленавітых маладых назваў і маё імя. З беларускіх — адно. Тады (можа, і цяпер?) гэта вельмі прымалася пад увагу: названы ў дакладзе сярод лепшых ці не названы? Не дзіўна, што калі я вярнуўся вечарам у гасцініцу і зайшоў у пакой, мой «сукватарант» вядомы якуцкі паэт Інакенцій Эрцюкаў адразу ж выгукнуў: «Віншую! Вас назваў Макараў у сваім дакладзе!»

У спрэчках па дакладзе і садакладах першым узяў слова «наш», — так амаль заўсёды было і пазней — на ўсіх пісьменніцкіх з'ездах, пленумах, сходах і іншых усесаюзных форумах. Да ўсякай вялікай размовы «наш» любіў, што называецца, зрабіць запеўку. Ведаў, што і ў прэзідыуме і «там» яго запеўка спадабаецца, бо ў ёй будзе ўсё, што трэба: і сцвярджальны пафас, і шчырая ўдзячнасць за клопат, і ўмеранае прызнанне недахопаў, і — яшчэ адна прысяга на вернасць. Так і на гэты раз: П. У. паведаміў аб поспехах беларускай літаратуры, адзначыў, што ў творчым росце маладых скарацііўся «вегетацыйны» перыяд — адразу выходзяць у прафесіяналы, што мала пасылаем маладых у брацкія рэспублікі... «А потым да канца — агульшчына», — гэта ўжо я даю ацэнку яго выступу.

...Сяргей Міхалкоў. Высачэзны, статны, з моцна прыгладжанымі амаль чорнымі валасамі, з акуратна падстрыжанымі вусікамі, з трыма медалямі сталінскага лаўрэата на грудзях. Ягонае імя мне адно з самых вядомых. Папершае, сааўтар «Гімна Савецкага Саюза». А гэта не жартачкі! Падругое, у мае педвучылішчныя гады надта папулярнымі былі некаторыя яго байкі, асабліва «Заяц во хмелю» і «Две подруги». Апошнюю даводзілася тады чуць амаль не на кожным эстрадным канцэрце ў парку імя Горкага, бо ішла барацьба з касмапалітамі, з нізкапаклонствам перад заграніцай...

Моцнымі воплескамі правяла зала да трыбуны сівагаловага Максіма Рыльскага. Гаворыць мудрыя рэчы, і я стараюся самае галоўнае занатаваць. «Добры літаратурны густ — з'ява больш рэдкая, чым талент. Густ, паводле Пушкіна, у пачуцці «соразмерности и сообразности». Далей: «Трэба мець вялікі запас ідэй, чаго мала ў маладых украінскіх паэтаў». І яшчэ: «За адзін свежы радок можна дараваць шмат дрэнных». І яшчэ: «Толькі тая паэзія добрая, якая — твая, а не перапеўная». Ну але ж і сапраўды мудрэц, гэты славуты не толькі на Бацькаўшчыне, але і ва ўсім славянскім свеце Максім Тадэевіч!

...Нарэшце будзе гаварыць сам Шолахаў! Мы ўжо былі занепакоіліся: вось-вось, паводле графіка работы, выступленні закончацца, а яму слова не дадуць. Няўжо адмовіўся? Няўжо нічога нам, маладым, не скажа? І вось — увага! У зале — абсалютная цішыня.

«Цяжка гаварыць пасля Сіманава. Ну, а пасля Ажаева хіба лягчэй? (Махнуў рукой. У зале рагатнулі.) Ажаеў цяпер дзярэ лыка з асфальту вуліцы Вароўскага, а пачаў калісьці драць далёка ад Масквы. (Намёк на пасаду Ажаева ў сакратарыяце СП СССР на вуліцы Вароўскага і на яго многа хвалёны раман «Далеко от Москвы».) З асфальту лыка не здзярэш. Вот, вот! (Ківае галавой і зноў махае рукою. Ці не нападпітку ён? Занадта ж неяк вольна пачуваецца?) Ёсць такая катэгорыя дзявок, якія не выходзяць замуж, — перастаркі. І ў літаратуры яны бываюць. Дык вось: не заставайцеся да старасці ў кароткіх дзіцячых штанцах. Абдымаю вас, дарагія людзі!» І працягнуў рукі да залы. Кіўнуў галавой і... пайшоў за кулісу. Коратка — і... і... Як бы нешта не тое. Расчараванне, ці што? Праз колькі хвілін па радах пайшла запіска: «И кучу юных олухов Обнял с трибуны Шолохов».

Праз нейкія тыдні два «Литературная газета» надрукавала словы М. А. Шолахава на Усесаюзнай нарадзе маладых пісьменнікаў. Пазней яно ўвойдзе ў 8-мы том яго пасмяротнага Збору твораў. Яно — і не яно, ці — не зусім яно. Абкарнана так, што засталіся рожкі ды ножкі. Ні Сіманава, ні Ажаева, ні лыка, ні асфальту на вуліцы Вароўскага, ні дзявок-перастарак, — нічога не засталося. Затое дабавілася шмат трывіяльнай партыйна-савецкай рыторыкі. Вось і вер пасля гэтага газетным рэпартажам з месца падзеі! Калі б не быў сам сведкам і не мой запіс у нататніку — мог бы і паверыць, што так посна, так банальна сказаў сваё слова М. А. Шолахаў...

12 студзеня пачалося абмеркаванне творчасці маладых у семінарах. Усіх паэтаў падзялілі на восем груп. Мы, беларусы (Гаўрусёў, Макаль і я) трапілі ў апошнюю, восьмую, — пад кіраўніцтвам не надта шанаванага намі паэта-песенніка Льва Ашаніна... Абмеркаванне маіх вершаў ішло добра, спакойна, спагадліва, пакуль не ўзяўся за мяне Кучар. Дам слова пурпуроваму нататніку: «Не пашанцавала мне, як і тады, у 1953-м, у Мінску: з'есць з кішкамі! Бо праклінцце на маю галаву!.. Ну, давай, давай, Айзік! Можа, папярхнешся нарэшце. Але ж і гад! І сюды прыехаў з'есці мяне! Дома было мала». А. Куляшоў як майстар-прафесіянал зрабіў некалькі канкрэтных па маёй творчасці заўваг, але ад кучараўскай лютасці ні словам не абараніў. Ну, нічога. Мы ж не грузіны, не армяне, не татары... Мы — беларусы. Нас «паважаюць і любяць»...

У апошні дзень, вечарам, мне трэба было выступаць у ЦДЛ на сустрэчы чытачоў з маладымі паэтамі, удзельнікамі нарады. У вялікай каляровай афішы значылася маё прозвішча, але хлопцы (Сцяпан і Артур) угаварылі махнуць рукой і дзеля гэтага не заставацца яшчэ на цэлы дзень, да заўтрашняга вечара, у Маскве. І я паехаў разам з імі дадому. Так ляснула ў мяне першая і апошняя магчымасць пачытаць свае вершы масквічам — болей за ўсё жыццё такога выпадку не надарылася.

2006

*Друкуецца ў скароце*

ВЕРШЫ

# СЛОВЫ НІ ДЛЯ ЧАГО



Анатоль ІВАШЧАНКА

## Спын

*Каля Усходніх могілак сталіцы*
*штоночы валтузня і шмат машын.*
*Тут спын аўтобусаў з маскоўскае шашы*
*(няведама, як пад такое спіцца*
*тым, хто займеў тут свой заслужаны спачын).*

*Баулы, скрыні, кайстры і валізы,*
*чачэны, туарэгі, п'яны смех...*
*Ці скажуць вам пра штосьці там, унізе,*
*імёны, што прысыпаў надмагільны снег?..*

*Сівы туман плыве сабе з нізіны,*
*як той казаў, і быццам бачу я:*
*вось паўстае з астылых дамавінаў*
*былая сакаліная сям'я.*

*Усе ў выдатных чорных гарнітурах,*
*з метафізічным сумам у вачох*
*глядзяць на тых закладнікаў шоп-тураў,*
*што выгружаюць кілі кілек і панчох.*

*Вось Караткевіч на сваім пагосце*
*пацягвае бясконцы «Беламор»,*
*чакаючы кагось на госці, —*
*адзін з нямногіх, хто напраўду не памёр.*

*Ля агароджы Быкаў і Мулявін*
*гамоняць, пазіраючы на ўсход,*
*дзе каралеўны ходніку гуляюць,*
*шукаючы на задніцы прыгод.*

*А па начной шашы ляціць таксоўка,*
*падвозячы сталічных жыхароў.*
*На хвілю робіць спын ля стометроўкі –*
*і пазірае з-за стырна сівы Харон...*

*Непадалёк ад могілак усходніх*
*здзяйсняюць самадайкі аўтаспын,*
*а побач несупынны хэлоўін*
*запальвае нябачныя паходні*
*для тых, хто выйшаў з цесных дамавін...*

## Жывы

*гляджу на сваё далоні*
*счышчаю з іх зямлю*
*назіраю*
*як месцамі лопаецца скура*
*і ўтвараюцца новыя барозны*
*лініяў лёсу й жыцця...*

*цякуць (насы, тасол, кран, вочы —*
*патрэбнае закрэсліць)*
*спакушае грэхлама*
***асцярожна, зверы,***
***зачыняюцца дзверы!***
*цяпер урытмаваны*
*дзеткамі, светлафорамі,*
*парадкам слоў у сказе,*
*набрыньялы паглядамі,*
*разраджаюся ў нікуды;*
*інерцыя выпадковасцяў*
*трохі карэктуе маршрут,*
*але Закон вяртае да ранейшае ростані...*

*медытацыя на пральную машыну*
*на перыферыі сну*
*сігнал выключэння*
*як кодавае слова*
*для сустрэчы з сабой...*

*«Будзем уважлівымі» —*
*кажуць святар і светлафор.*
*Хто б і што ні казаў —*
*слухаю маці.*

*Мухі, пачакайце йшчэ*
*сядаць на мяне...*

## Творчаскі напал(м)

*Пранізлівыя пахі*
*перадвячэрняй вуліцы*
*мяшаюцца ў пакоі*
*з сандалам напалам*
*карнізавыя птахі*
*глядзяць як трэніруецца*
*ў сваёй сабачай школе*
*хадзіць па жэрдцы колі*
*ў той час як у пакоі*
*на коўзкім падваконні*
*павольна маркітуюцца*
*дзвюхногія й любуюцца*
*на галубоў і колі*
*ўдыхаючы сандал*
***P.S.***
*(яны іржуць бы коні*
*няйначай па прыколе*
*ці можа па ўколе*
*няўхільна павышаючы*
*мой творчаскі напал(м))*

## Дзеткі маршыруюць

*Дзеткі маршыруюць*
*шыхтуюцца ў пары*
*бяруцца за ручкі*
*раз-два раз-два аць-два...*
*выхавацелька з фізкультурніцай*
*выводзяць дзетак на зарадку*
*фізкультурніца паперадзе —*
*паказвае куды бегчы дзе пералазіць*
*кажа да якой прыступкі можна ўзлезці*
*выхавацелька — замыкае. Чэ-*
*злыя вочкі*
*крытычна аглядаюць*
*стракатую калону...*
*дзетак шмат,*
*мо тры дзесяткі*
*дзеткі маршыруюць*
*заклаўшы рукі за галаву*
*з боку гэта выглядае алегарычна*
*але выхавацелька з фізкультурніцай*
*пра тое не ведаюць*
*як яны спраўляюцца бедныя*
*з такой вялікай групай? — шэпчуцца мамкі*
*вельмі проста, паверце!*
*яны не ўмешваюцца*
*не перашкаджаюць дзейнічаць Закону*
*старажытнаму Закону зграі...*
*вось дзеткі пераадольваюць жардзіну*
*трэба ісці распляўшы ручкі*
*як канатаходнік*
*спрытнейшыя засковаюць першыя*
*тых хто адстае ад тэмпу*
*хто не можа шпарка ўскочыць*
*падштурхоўваюць дзеткі з чаргі*
*незадаволена шыпяць:*
*«Давай, давай же, залазь!..» —*
*імітуючы раздражнёны голас*
*фізкультурніцы*
*фізкультурніца пляскае ў ладкі:*
*«В темпе, в темпе,*
*раз-два, раз-два»...*
*і вось тут —*
*на жардзіны,*
*на лесвічцы,*
*на гэтай дзетсадаўскай пляцоўцы*
*у іх як і ў нас*
*у нашых дзетак*
*забіваюцца ўласныя рытмы*
*і ўласныя жаданні.*
*Раз і назаўжды.*

## Ад тыгра да малпы

*пракладаю свой шлях*
*па снах*
*патанаю ў абдоймах неба*
*па птушыных брыду слядах*
*па няз'едзеных крышках хлеба*

*пракладаю свой шлях*
*па днях*
*распісаных празрыстымі фарбамі*
*бачу дрэвы ў дарожных слупах*
*спапялёныя стрэчнымі фарамі*

*пракладаю свой шлях*
*па касцях*
*улагоджваю гожага звера*
*у гаршках на святарных пнях*
*стыне прысак змарнелае веры*
*пракладаю свой шлях праз пяскі*
*без кампасу ды зорнае мапы*
*нацянькі да чаканай ракі*
*па трыядах — ад тыгра да малпы*

## Сырадой

*як добра зрэдку*
*пабачыць збоку*
*якім напраўду*
*усё тут ёсць*
*прачнуцца зранку*
*не торгаць жонку*
*і выйсці вонкі*
*нібыта госць*

*пракрочыць паркам*
*звярнуць у арку*
*на лаўку ўзлезці*
*цяжкім катом*
*дастаць запалкі*
*раздзьмуць цыгарку*
*схаваўшы голаў у палітон*

*галінка гнецца*
*дзе тоўста — рвецца*
*назад — да шляху*
*пустой рукі*
*не з гумы сэрца*
*усё мінецца*
*ды вырашаюць*
*не кулакі*

*між гэтых словаў*
*нямала ловаў*
*наставіў хтосьці*
*маёй рукой*
*жыцця палову*
*зліжа карова*
*нагбом другую*
*бы сырадой*

## Бярозавік

***«И может быть, я найду ту строку,***
***которую еще никто не прочел...»***
***Вольга Арэф'ева***

*абдымаю дрэва*
*прыхінаюся скронню да яго цела*
*слухаю наш супольны*
*старажытны пульс...*
*падыходзіць ззаду дачка*
*«тата тата што ты робіш?*
*табе дрэнна тата?»*
*«не. абдымі з таго боку.*
*слухай»...*
*укладаю яе пальчыкі*
*ў стыгматы бярозы.*
*«тата адкуль гэтая рана?»*
*«ад сякераў».*
*ёсць словы для чытання*
*слухання занатоўвання...*
*а ёсць — ні для чаго.*
*так, усе сапраўдныя словы*
*ні для чаго...*
*дзядуля бярэ калаўрот*
*малаток бляшаныя жалабкі*
*свідруе дзірачкі*
*убівае жалабкі*
*падвязвае пластыкавыя бутэлькі...*
*дома нас чакае працэджаны бярозавік.*
*але дачка не п'е...*

## Так, Стакгольм

*Так, я закахаўся ў цябе*
*з першага погляду*
*(сціхніце, гора-філолагі*
*й абаронцы маралі,*
*так, закахаўся),*
*а можа — яшчэ раней,*
*калі дзесяткі тваіх лепшых дзяцей*
*вітальна ўсміхаліся мне*
*са сцэнаў аэрапорту «Арланда»,*
*калі цудоўная Ан*
*везла нас у гатэль*
*і чамусьці хвалявалася,*
*хаця хвалявацца мусілі б мы,*
*бо гэта ж мы — іншапланетнікі*
*(і вочы таксёра ў люстэрку*
*ўсміхаліся гэтак жа ветла,*
*як і ў людзей са сцэнаў).*
*Так, ты вельмі хутка завербаваў мяне*
*ў асабовы склад*
*сваіх неганаровых месцічаў,*
*знёс дах,*
*зрабіў лабатамію,*
*засяліўшы сюды рагатых чалавечкаў*
*з прапелерамі, сякерамі, рудымі барадамі*
*і ў розных панчохах.*
*Так, ты адкрыў мне,*
*што нам з дзяцінства хлусілі,*
*быццам бы тут жыве*
*гарэзлівы абжора*
*ў поўным росквіце сіл,*
*які насамрэч апынуўся*
*дзіцячай шызафрэніяй.*
*Вось яна —*
*страшная праўда:*
*тут ненавідзяць Карлсана!*
*Так, ты ўсё змяшаў.*
*Гэты міні-Бабілон,*
*што скача па тваіх вулках,*
*насамрэч цалкам упарадкаваны:*
*кожнаму тут ужыўлены*
*мікрачып з адмысловым заданнем*
*і нават сарока*
*ў дворыку нашага Арт-гатэлю*
*ведае, на якім суку ёй трэба сярыць!..*
*Дарэчы, мяне пераследуе думка,*
*што мікрачып ушыты і ў мяне.*
*(Так, гэта матрыца, куды трапляеш,*
*надкусіўшы лакрыцу!)*
*Так, Стакгольме,*
*пэўна, і я выконваю заданне,*
*а не проста бадзяюся ранкамі*
*па тваіх пустых прысадах*
*са здымачом,*
*фоткаючы й так да дзірак зафотканыя*
*фрагменты:*
*вось заходжу ў маркет,*
*набываю асадку «Bic» за 7 кронаў,*
*сядаю ля кірхі*
*(унутры якой*
*на касе сядзіць*
*праколатая дзяўчынка-гот,*
*(о майн Гот!)*
*а звонку,*
*абняўшы сцяну,*
*спіць нейкая ці то валацужка,*
*ці то проста прасветленая)*
*і пачынаю занатоўваць...*

*«Так, так, так, так...» —*
*шапчу я табе па-шведску.*
*«Дзякуй».*

*Але паслухай:*
*каму патрэбны гэты*
*наш з табою досвед?*
*Тыя, у каго замест сэрцаў —*
*палымяныя маторы,*
*не зробяць аніякіх высноў,*
*нават пражыўшы тут*
*некалькі жыццяў.*
*Гэтыя ёлупы свята вераць,*
*што ўсе вакол ім вінаватыя,*
*і нават ты.*
*Іх савецкія заточкі*
*адразу вытыркаюцца*
*ў тваіх стракатых натоўпах.*
*«Тут па ходу есть такая тема!..»*
*Даруй ім.*
*І даруй мне за іх.*
*Так, Стакгольме,*
*адзінае, што мне застанецца,*
*вярнуўшыся ў свае цудоўныя гомлі,*
*якія гэтыя гомліны засяляюць, —*
*У-вэй.*
*Інакш мне давялося б*
*стаць тэрарыстам...*
*Таск, Stockholm.*

**АПАВЯДАННЕ**

## Пятая калонка Марыі Мартысевіч

Ад сённяшняга дня вакол пятай старонкі «Ь» (з магчымым працягам на старонцы шостай) будзе разгортвацца маладая беларуская літаратура большай ці меншай ступені правакатыўнасці. Яе мэты — унядрыцца і падарваць, хоць і ёсць надзеі, што некаторыя аўтары, якіх мы будзем прэзентаваць, проста гуляюцца ў вайнушку. Напрыклад, літаратарка, якая падпісвае сваю іранічную прозу псеўданімам Анка Упала, унядрылася ў фінал конкурса маладых літаратараў імя Карласа Шэрмана (глядзі матэрыял НЧ «Літаратура на конкурснай аснове» ад 8 мая 2009 г.) і цалкам падарвала ўяўленне сябраў журы што да свайго іміджу, выступіўшы з сур'ёзным, па-майстэрску зробленым мастацкім перакладам. Гэты твор быў адзначаны спецыяльным прызам газеты «НЧ», а цяпер у вас ёсць выдатная магчымасць ацаніць яго самастойна. Друкуем у нязначным скарачэнні. У наступных нумарах «Ь» мы працягнем знаёміць вас з творамі пераможцаў конкурса.

# СКУРА

**Руал Дал (Roald Dahl)**

У тым годзе — 1946-ым — зіма затрымалася надоўга. Не глядзячы на тое, што ішоў красавік, ільдзяны вецер гуляў па вуліцах горада, а па небе паўзлі снежныя хмары. Стары, якога звалі Дрыалі, шорхаў па тратуары вуліцы Рывалі. Змёрзлы і бездапаможны ён, як вожык, хаваў нос у заношанае чорнае паліто, па-над узнятым каўнерам былі бачныя толькі вочы і макаўка.

Адчыніліся дзверы кафэ і запахла смажанай курыцай — страўнік адгукнуўся на гэта балючым спазмам. Стары пайшоў далей, без цікавасці сузіраючы тавары на вітрынах: парфума, ядвабныя гальштукі і кашулі, брыльянты, парцалянавыя сервізы, антыкварная мэбля, кнігі ў выдатна аздобленых вокладках... А вось мастацкая галерэя. Яму заўжды падабаліся мастацкія галерэі. Тут, на вітрыне, было выстаўлена толькі адно палатно. Ён спыніўся паглядзець. Ужо было павярнуўся, каб ісці далей. Але затрымаўся, зірнуў назад; і неспадзявана адчуў лёгкае хваляванне, штосьці варухнулася ў памяці, цьмяная ўзгадка пра нешта, падалося, што недзе некалі ён гэта ўжо бачыў. Ён паглядзеў ізноў. Гэта быў пейзаж: купка дрэваў звар'яцела хілілася ў адзін бок, нібыта ад жахлівага ветру, вакол крывілася і круцілася неба. Да рамы была прышпіленая картка з подпісам: «Хаім Суцін (1894-1943)».

Дрыалі разгублена ўзіраўся ў карціну, не разумеючы, што менавіта падавалася ў ёй знаёмым.

«Нібыта вар'ят маляваў, — падумаў ён, — па-дзівацку неяк, але мне падабаецца... Хаім Суцін... Суцін...

Гэта ж калмык, дальбог! — выкрыкнуў ён раптоўна, — Вось хто гэта! Карціна калмычка выстаўляецца ў найлепшай краме Парыжа! Падумаць толькі!»

Стары шчыльней прыціснуўся тварам да вітрыны. Ён памятаў хлопца. Так, памятаў даволі добра. Але калі яны маглі сутыкацца? З падрабязнасцямі было цяжэй. Даўнавата гэта было. Наколькі даўно? Дваццаць? Ды не, болей, недзе трыццаць год таму... Чакайце хвілінку. Так — гэта было за год да вайны, першай сусветнай, у 1913-тым годзе. Дакладна. А гэты Суцін, гэты нязграбны калмычок, замкнёны, задумлівы хлопец, які яму падабаўся, якога нават амаль любіў праз тое — іншай прычыны ён не бачыў, — што юнак умеў маляваць.

«Дзіўна, — падумаў Дрыалі. — Як лёгка ўсё ўспомнілася, як



Руал Дал (Roald Dahl) (1916 — 1990) — брытанскі празаік нарвежскага паходжання. Быў асам Брытанскай Каралеўскай авіяцыі падчас другой сусветнай вайны. Пасля вайны стаў паспяховым пісьменнікам. Пісаў раманы і апавяданні для дзяцей і дарослых. Яго навэлы славяцца чорным гумарам і нечаканымі развязкамі.

кожная ўзгаданая дэталь адразу ж пацягнула за сабой іншы ўспамін.»

Недарэчнасць з татуяванкай, напрыклад. Ну і дурасць яны тады зрабілі! З чаго ж усё пачалося? О так, аднойчы ён разбагацеў, дакладна, і купіў шмат віна. (Як цяпер памятае, увайшоў у майстэрню з пакункам бутэлек пад пахай. Хлопец сядзеў побач з мальбертам, а ягоная (Дрыалі) жонка стаяла пасярэдзіне пакоя — пазіравала для партрэта.

— Сёньня мы будзем святкаваць, — сказаў ён. — Маленькае свята для нас траіх.

— Свята ў гонар чаго? — запытаўся хлопец, нават не ўзняўшы вачэй. — Вырашыў развесціся з жонкай, каб яна магла выйсці за мяне?

— Не, — адказаў Дрыалі. — Сёння мы святкуем, бо мая праца прынесла мне вялікія грошы.

— А мая не прынесла ніколькі. Таксама можам адзначыць.

— Як скажаш.

Дрыалі стаяў ля стала, разгортваў пакунак. Ён стаміўся і хацеў дабрацца да віна. Дзевяць кліентаў за адзін дзень — гэта, вядома, добра, але для вачэй пякельнае выпрабаванне. Ніколі раней ён не рабіў дзевяць. Дзевяць п'яных салдафонаў, і, што незвычайна, не менш за сем з іх змаглі заплаціць гатоўкай. Гэта зрабіла яго надзвычайна багатым. Але на вачах праца адбілася жахліва. Вочы Дрыалі былі прыплюшчаныя ад стомы, на паверхні бялкоў праступіла чырвоная сетка. Прыкладна на цалю за кожным вочным яблыкам было па кропцы, дзе канцэнтраваўся боль. Але цяпер быў вечар, і ён быў багаты, што кажух валахаты, а ў пакунку — тры бутэлькі: адна — для жонкі, другая — для сябра, трэцяя — для сябе. Ён знайшоў каркоўнік і павыцягваў коркі з бутэлек, кожная з іх зрабіла маленькі «хлоп», калі пакідала рыльца.

Хлопец адклаў пэндзаль убок.

— Божухна! — сказаў ён. — Як можна працаваць у такіх умовах?

Дзяўчына падышла паглядзець на малюнак. Дрыалі — таксама, у адной руцэ трымаючы бутэльку, у другой — шклянку.

— Не! — закрычаў хлопец, раптоўна прыйшоўшы ў лютасць. — Нельга!

Ён сарваў палатно з мальберта і разгарнуў да сцяны. Але Дрыалі паспеў яго убачыць.

— Мне падабаецца.

— Гэта пачварна.

— Чароўна. Як і астатнія твае працы. Проста чароўныя. Я ў захапленні ад усіх.

— Праблема ў тым, — нахмурыўся хлопец, — што імі нельга харчавацца, для страўніка ніякай карысці.

У любым выпадку яны чароўныя.

Дрыалі працягнуў яму куфаль, поўны светла-бурштынавага віна.

— Выпі, гэта зробіць цябе шчаслівым.

«Ніколі, — падумаў ён, — я не сустракаў чалавека больш няшчаснага, і твара больш змрочнага.»

Сем месяцаў таму ён звярнуў на яго ўвагу ў кавярні, бо хлопец піў у самоце і выглядаў, як расеец ці нейкі азіят. Дрыалі падсеў за яго столік і загаварыў.

— Ты рускі?

— Так.

— Адкуль будзеш?

— Менск.

Дрыалі падскочыў, каб абняць яго і закрычаў, што таксама нарадзіўся ў гэтым горадзе.

— Дакладней не зусім Менск, — дадаў хлопец, — але даволі блізка.

— Адкуль?

— Смілавічы, гэта ў васемнаццаці вёрстах.

— Смілавічы! — крыкнуў Дрыалі, абдымаючы яго зноў. — Калі я быў маленькі, быў там некалькі разоў!

Ён прысеў, з замілаваннем разглядаючы твар новага знаёмца. «З выгляду ты не падобны да заходняга расейца. Хутчэй татарын, ці калмык. Выкапаны калмык.»

Цяпер у майстэрні Дрыалі зноў разглядаў хлопца: той узняў шклянку і, перакуліўшы, уліў яе змесціва сабе ў горла. Так, у яго сапраўды быў калмыцкі твар, вельмі шырокі, з высокімі скуламі і буйным пляскатым носам. Адтапыраныя вушы рабілі твар яшчэ больш шырокім. Да таго ж у яго былі вузкія вочы, чорныя валасы, тоўстыя, незадаволена выгнутыя калмыцкія вусны, але вось рукі... Рукі кожны раз здзіўлялі, такія мініятурныя і белыя, як у паненкі, з маленькімі тонкімі пальцамі.

— Налі мне яшчэ, — папрасіў хлопец. — Калі ўжо мы святкуем, дык давай зробім гэта як мае быць.

Дрыалі разліў віно па шклянках і сеў на крэсла. Хлопец — на старую канапу побач з жонкай Дрыалі. Бутэлькі паставілі паміж імі на падлогу.

— Сёння будзем піць, пакуль не лопнем, — сказаў Дрыалі. — Я дзіка багаты. Думаю, можа, мне варта пайсці і набыць яшчэ некалькі бутэлек. Толькі не ведаю, колькі.

— Бяры шэсць, — параіў хлопец. — Дзве на кожнага.

— Добра, зараз здабуду.

— Я табе дапамагу.

У бліжэйшым бары Дрыалі купіў шэсць бутэлек белага віна і прынёс у майстэрню. Паставілі іх на падлогу ў два шэрагі, Дрыалі адкаркаваў усе шэсць. Яны селі зноў і працягнулі піць.

— Толькі вельмі заможныя людзі, — заўважыў Дрыалі, могуць дазволіць сабе святкаваць гэтак!

— Так і ёсць, — падтрымаў хлопец. — Ты згодная, Жазі?

— Вядома.

— Жазі, ты як?

— Нармальна.

— Пойдзеш ад Дрыалі, каб ажаніцца са мной?

— Не.

— Цудоўнае віно, — адзначыў Дрыалі, — Добра п'ецца.

Праз пэўны час ён узняўся, каб уключыць святло. Было дзіўна бачыць, што ногі пайшлі разам з ім, асабліва таму, што ён не адчуваў, як яны дакранаюцца да падлогі. Гэта выклікала прыемнае адуванне лунання ў паветры. Потым ён пачаў хадзіць па пакоі, цішком кідаючы позіркі на карціны, прыстаўленыя да сцен.

— Паслухай, — сказаў ён пасля доўгай паўзы. — Я сёе-тое прыдумаў.

Дрыалі прайшоў праз пакой да канапы і стаяў, злёгку пахістваючыся.

— П-паслухай, мой калмычок.

— Ну, што?

— Я прыдумаў геніяльную рэч. Ты слухаеш, увогуле?

— Я слухаю Жазі.

— Ты мяне паслухай, калі ласка. Ты мой сябар, мой брыдкі калмычок з Менску, і ты для мяне такі мастак, што я хацеў бы мець тваю карціну, прыгожую карціну...

— Бяры ўсе. Усе, што знойдзеш, толькі не перашкаджай мне размаўляць з тваёй жонкай.

— Ды не, не, ты толькі паслухай. Я маю на ўвазе карціну, якая б засталася са мной назаўжды... Куды б я не пайшоў... што б не здаралася... заўсёды са мной... карціна, намаляваная табой.

Ён падышоў бліжэй і патрос хлопца за калена. «Ну, паслухай мяне, калі ласка.»

— Выслухай яго, — сказала дзяўчына.

— Вось што. Намалюй карціну на маёй скуры, на спіне. А паверх таго, што намалюеш, зрабі татуаж, каб яна засталася там назаўжды.

— Ты ашалеў.

— Я пакажу табе, як рабіць тату. Гэта лёгка. Нават дзіця зможа.

— Я не дзіця.

— Ну, калі ласка.

— Ты вар'ят. Што ты ад мяне хочаш? — Мастак паглядзеў у п'яныя, цёмныя, бліскучыя ад віна вочы суразмоўцы. — Што, напраміль бог, табе трэба?

— Ты б лёгка мог гэта зрабіць! Мог бы!

— Татуяванку маеш на ўвазе?

— Так, татуяванку! За дзве хвіліны цябе навучу!

— Немагчыма!

— Па-твойму, я не ведаю, пра што кажу?

— Я проста думаю, — сказаў хлопец, — Што ты п'яны, і ідзі ў цябе такія самыя.

— Жазі магла б папазіраваць, а ты б яе намаляваў на маёй спіне. Я што, не маю права мець партрэт жонкі на спіне?

— Жазі?

— Так. — Дрыалі ведаў, што варта яму ўзгадаць жонку, як цёмныя вусны хлопца перастануць быць такімі суровымі, і ён завагаецца.

— Не, — сказала дзяўчына.

— Жазі, мілая, калі ласка. Дапі гэтую бутэльку — і ты палагоднееш. Ідэя проста супер, ніколі ў жыцці мне не прыходзіла ў галаву нічога лепей!

— Якая ідэя?

— Каб ён намаляваў цябе ў мяне на спіне. Няўжо нельга?

— Мяне?

— У аголеным выглядзе, — удакладніў хлопец, — Тады ідэя нішто сабе.

— Толькі не голай, — не пагадзілася дзяўчына.

— Ідэя супер, — паўтарыў Дрыалі.

— Ідэя, чорт яе бяры, ідыёцкая, — запярэчыла дзяўчына.

— Так ці інакш, гэта ідэя, — сказаў хлопец. — Ідэя, якая патрабуе, каб яе адзначылі.

Яны распілі яшчэ адну бутэльку. Затым хлопец сказаў:

— Нічога не атрымаецца. Я, напэўна, не здолею зрабіць тату. Лепей проста намалюю гэты партрэт у цябе на спіне, і ён будзе з табой, пакуль ты не прымеш ванну і не змыеш яго. Калі ты ўвогуле больш не будзеш мыцца, ён застанецца з табой назаўсёды, да канца тваіх дзён.

— Не, — адказаў Дрыалі.

— Так, і ў той дзень, калі ты вырашыш памыцца, я буду ведаць, што мая карціна табе болей не патрэбная. Пагляджу, наколькі ты цэніш маё мастацтва.

— Мне гэты варыянт не даспадобы, — умяшалася дзяўчына. — Ён у такім захапленні ад твайго мастацтва, што шмат гадоў не будзе мыцца. Лепей ужо татуаж, але не ў голым выглядзе.

— Тады толькі твар, — сказаў Дрыалі.

— У мяне не атрымаецца.

— Гэта надзвычай лёгка. Бяруся навучыць цябе за дзве хвіліны. Вось паглядзіш. Зараз дастану прылады. Іголкі і атрамант. Там шмат розных колераў. Столькі ж колераў, колькі ў цябе фарбаў, і яны нашмат прыгажэйшыя...

— Немагчыма.

— У мяне шмат атраманту. Жазі, хіба ў мяне няма вялікай колькасці атраманту розных колераў?

— Ёсць.

— Вось убачыш, — сказаў Дрыалі. — Зараз прынясу.

Ён узняўся з крэсла і мэтанакіраванай, хоць і няцвёрдай хадой, падаўся з пакоя.

Праз паўгадзіны Дрыалі вярнуўся, размахваючы карычневай валізай, крыкнуў: «Я ўсё прынёс! Тут, у торбе, усе прылады для тату!» Паставіў валізу на стол, адчыніў і павыцягваў электрычныя іголкі і маленькія бутэлечкі каляровых чарнілаў. Уключыў іголку і націснуў на гузік. Іголка загула, верхняя яе частка стала мягка вібраваць уверх-уніз. Мастак скінуў куртку і закатаў рукаў. «Цяпер сачы за тым, што я буду рабіць, пакажу табе, наколькі гэта проста. Зраблю малюнак на руцэ, вось тут.»

Ягонае перадплечча ўжо было прыкрытае блакітнымі значкамі, але ён адшукаў кашто́ўны лапік чыстай скуры, каб паказаць, як гэта робіцца.

Хлопец быў заінтрыгаваны.

— Давай я паспрабую на тваёй руцэ.

Прыладай, якая гула, як пчала, ён правёў блакітныя лініі на руцэ Дрыалі.

# ПЯТАЯ КАЛОНКА



— Гэта проста. Падобна да малявання чарнільнай асадкай. Розніцы аніякай, апроч таго, што гэта марудней.

— Няма тут нічога складанага. Ты гатовы? Можам пачынаць?

— Зараз жа.

— Так, мадэль! — крыкнуў Дрыалі. — Хадзі сюды, Жазі! — Ён нецвяроза хістаўся па пакоі ў запале, аддаючы распараджэнні, падобны да дзіця, якое рыхтуецца да нейкай захапляльнай гульні. — Куды ты хочаш, каб яна стала?

— Няхай становіцца каля туалетнага століка, распусціць валасы па плячах і возьме грабянец. Намалюю, як яна расчэсвае валасы.

— Грандыёзна, ты геній!

Дзяўчына, не выпускаючы з рук шклянкі з віном, неахвотна прайшла да туалетнага століка.

Дрыалі сцягнуў кашулю і вылез са штаноў. З вопраткі на ім засталіся толькі майткі, шкарпэткі і пантофлі. Ён стаяў крыху хістаючыся, цела драбнаватае, мускулістае, беласкурае і амаль безвалосае. «Цяпер... — сказаў ён, — я палатно. Куды ты мяне змесціш?»

— Як заўжды, на мальберт.

— Ты ў сваім розуме? Я ж палатно!

— Адпаведна запрашаю на мальберт, туды, дзе ты і павінны быць.

— Але якім чынам?

— Дык ты палатно, ці не?

— Зразумела, палатно. Ужо пачынаю сябе адчуваць цалкам палатном.

— Тады, калі ласка, на мальберт. Складанасцяў тут не мусіць быць.

— Сур'ёзна, гэта немагчыма.

— Добра, сядай на крэсла, задам наперад. Так ты зможаш пакласці сваю п'яную галаву на спінку. Паспяшайся, бо я ўжо пачынаю.

— Я гатовы. Чакаю.

— Спачатку, — сказаў хлопец, — я намалюю звычайную карціну. Потым, калі яна мяне задаволіць, паверх зраблю татуаж. — Шырокім пэндзлем ён пачаў маляваць на голай скуры.

— А-яй! — закрычаў Дрыалі. — Гіганцкі вусень маршыруе па маёй спіне!

— Цішэй! Сядзі ціха! — Хлопец імкліва клаў празрыстыя, каб потым не заміналі рабіць тату, мазкі блакітнай акварэлі. Як толькі ён пачаў маляваць, ягоная засяроджанасць неяк выцесніла сабой нецвярозасць. Мазкі ён клаў хуткімі ўдарамі пэндзля, трымаючы запясце нерухома, і меней чым за паўгадзіны малюнак быў скончаны.

— Вось і ўсё, — сказаў ён дзяўчыне, якая вярнулася на канапу, легла і адразу ж заснула.

Іголка гула і не спыняла працу яшчэ доўга пасля надыходу раніцы. Дрыалі ўзгадаў, што, калі хлопец адышоў і прамовіў «Гатова», за вокнамі ўжо зусім развіднела, і было чуваць, як людзі ішлі на працу.

— Хачу бачыць, што атрымалася, — сказаў Дрыалі.

Мастак патрымаў люстэрка пад вуглом, і Дрыалі выгнуў шыю, каб паглядзець.

— Сюр! — выгукнуў ён.

Відовішча было дзівоснае. Уся спіна, ад верху плячэй да самага нізу зіхацела фарбамі: і залатой, і зялёнай, і блакітнай, і чорнай, і пурпурнай. Татуаж быў накладзены так шчыльна, што выглядаў практычна намаляваным алеем. Хлопец як мага больш дакладна трымаўся лініяў пэндзлю і надзвычай удала пабудаваў кампазіцыю: так, што выгін спіны і выступ лапатак пайшоў малюнку на карысць. Да таго ж, пры ўсёй маруднасці працэсу, ён неяк здолеў дасягнуць непасрэднасці. Партрэт атрымаўся даволі жывым. Акурат у той самай вывернутай пакутлівай манеры, адметнай для Суціна. Не проста партрэт, а хутчэй схоплены настрой: твар мадэлі смутны і п'янаваты, фон віецца вакол галавы вялікай колькасцю цёмна-зялёных завіткоў.



Фота Алены Ганчаровай

Алена Казлова (Анка Упала) нарадзілася ў 1981 г. у Магілёве. Скончыла факультэт замежных моваў МДУ ім А.А. Куляшова. Жыве ў Магілёве, працуе журналісткай.

— Неверагодна!

— Мне і самому падабаецца. — Хлопец адступіў на крок, крытычна сузіраючы малюнак. — Ведаеш, — дадаў ён, — думаю, ён варты таго, каб я паставіў свой подпіс.

Ізноў узяўшы джала, мастак вывеў сваё імя з правага боку, над тым месцам, дзе была нырка Дрыалі.

Стары, якого звалі Дрыалі, стаяў у своеасаблівым стане трансу, утаропіўшыся ў карціну на вітрыне мастацкай гелерэі. Усё гэта было так даўно, нібыта адбывалася ў мінулым жыцці.

А мастак... Што з ім здарылася? Цяпер Дрыалі здолеў узгадаць: пасля таго, як вярнуўся з вайны, першай сусветнай, ён сумаваў па хлопцы і пытаўся ў Жазі пра яго:

— Дзе мой калмычок?

— З'ехаў, — адказала яна. — Не ведаю, куды, але чула, што ўладальнік галерэі адправіў яго ў Сэрэ, каб ён маляваў больш.

— Магчыма, ён вернецца.

— Магчыма. Хто ведае?

Гэта быў апошні раз, калі яны ўзгадвалі пра яго ў размове. Неўзабаве яны пераехалі ў Гаўр, дзе было больш маракоў і справы ішлі лепей. Стары ўсміхнуўся, узгадаўшы Гаўр. Гэта былі прыемныя гады, час паміж войнамі. Маленькі салон каля доку, утульныя пакойчыкі, і заўжды багата працы: кожны дзень прыходзілі тры-чатыры, а то і пяць маракоў, якія хацелі тутуіроўку на плячы. Сапраўды добрыя часы...

Потым пачалася другая сусветная, і забілі Жазі, і прыйшлі немцы, і гэта быў канец для ягонага бізнесу. Пасля гэтага ўжо ніхто не хацеў малюнкаў на плячах. І на той момант ён ужо быў занадта стары для якой-небудзь іншай працы. У роспачы ён вярнуўся ў Парыж, спадзеючыся на тое, што ў вялікім горадзе справы пойдуць лепш, але памыліўся.

Цяпер, як вайна скончылася, у яго не засталося ні сілаў, ні прыладаў. Не так проста старому чалавеку знайсці выйсце, асабліва пры ўмове, што прасіць міласціну яму не даспадобы. Але чым яшчэ можна было жывіцца?

Паддаўшыся раптоўнаму імпульсу, Дрыалі павярнуўся, штурхнуў дзверы ў галерэю і ўвайшоў.

Гэта быў доўгі пакой з тоўстым дываном віннага колеру. Божа, які прыгожы і цёплы! І ўсе гэтыя людзі хадзілі і разглядвалі карціны, ахайныя і прыстойныя наведвальнікі, кожны трымаў у руцэ каталог. Дрыалі стаяў перад дзвярыма, нервова разважаючы, ці хопіць яму адвагі зрабіць яшчэ адзін крок наперад. Але раней, чым ён наважыўся, пачуў голас: «Што вам трэба?»

Дрыалі застыў.

— Калі вам не цяжка, — сказаў спадар, — выйдзеце вон з маёй галерэі!

— Мне нельга паглядзець на карціны?

— Я вас папрасіў выйсці.

Нечаканая знявага не на жарт раззлавала.

— Давайце не будзем ствараць праблем, — шыпеў спадар. — Калі ласка, на выхад.

Пухлай белай лапай ён схапіў Дрыалі за руку і настойліва пачаў выпіхваць таго за дзверы. І тут Дрыалі сарваўся:

— Рукі прыбяры ад мяне! — Ягоны голас празвінеў нават у канцы галерэі, і наведвальнікі здрыгануліся. — У мяне таксама!.. — крыкнуў Дрыалі, — у мяне таксама ёсць карціна гэтага мастака! Ён быў маім сябрам, і ў мяне ёсць карціна, якую ён мне падарыў!

— Нейкі вар'ят.

— Псіх, проста трызніць.

— Хто-небудь, выклічце паліцыю!

Дрыалі раптоўна выкруціўся з рук, якія яго трымалі, і, пакуль яго не паспелі схапіць ізноў, ірвануў уздоўж галерэі з крыкам «Я пакажу вам! Пакажу вам! Пакажу!». Ён садраў з сябе паліто, затым — камізэльку і кашулю і павярнуўся да людзей так, каб была бачная яго голая спіна.

— Вы бачыце? Вось яна!

У залі раптоўна ўсталявалася напружаная цішыня. Шакаваныя людзі нерухома глядзелі на тое, што ён рабіў. Глядзелі на татуяванку. Яна ўсё яшчэ была там. Колеры не пабляклі, але спіна старога цяпер была худзейшай, лапаткі вытыркаліся болей, і праз гэта карціна выглядала недарэчна зморшчанай і памятай.

Хтосьці сказаў: «Божа, але ж гэта праўда!»

Усхваляваныя людзі рушылі наперад, каб паглядзець, загаманілі.

— Беспамылкова!

— Ягоная ранняя тэхніка, так?

— Ашаламляльна, ашаламляльна!

— Паглядзіце, яна падпісаная!

— Разгарніце плечы, дружа, каб карціна нацягнулася.

— Старая... Калі яна была зробленая?

— У 1913-тым, — сказаў Дрыалі, не паварочваючыся. — Увосень 1913-га.

— Хто навучыў Суціна рабіць тату?

— Я.

— А жанчына хто?

— Гэта мая жонка.

Уладальнік галерэі праціскаўся праз натоўп да Дрыалі. Цяпер ён быў лагодны, надзвычай засяроджаны, на твары — усмешка.

— Месье, — сказаў ён. — Я яе купляю.

Дрыалі мог бачыць, як трэсліся тлустыя складкі на твары, калі ён адкрываў рот.

— Кажу: «Я купляю яе, месье!»

— Як вы можаце яе купіць? — запытаўся Дрыалі ціха.

— Даю за яе дзвесце тысячаў франкаў.

Вочы дылера былі маленькімі і цёмнымі, ноздры пачалі раздзьмувацца.

— Не рабіце гэтага! — выгукнуў хтосьці з натоўпу. — Яна ў дваццаць разоў даражэйшая!

Дрыалі адкрыў рот, каб штосьці сказаць, і не знайшоў слоў... Потым ізноў адкрыў і марудна вымавіў:

— Але якім чынам я магу яе прадаць?

У ягоным голасе адчувалася сусветная туга.

— Паслухайце, — сказаў дылер, наблізіўшыся. — Я вам дапамагу, зраблю вас багатым. Наконт карціны мы з вамі зможам дамовіцца ў прыватным парадку, так ці не?

Дрыалі разгублена глядзеў на яго спалоханымі вачыма.

— Але як вы яе купіце, месье? Што вы зробіце з ёй, калі купіце? Дзе будзеце захоўваць?

Дылер пастукаў сябе па пераноссі тоўстым белым пальцам.

— Падобна на тое, — сказаў ён, — што калі я набываю карціну, то набываю і вас таксама. Гэта нейкім чынам не зусім зручна... — Ён зрабіў паўзу і зноў пастукаў сябе па носе. Сама па сабе карціна не вартая нічога, пакуль вы не памерлі. Колькі вам гадоў, дружа?

— Шэсцьдзесят адзін

— Але здароўе, відаць, не самае лепшае?

Дылер адпусціў свой нос і агледзеў Дрыалі з галавы да пят, уважліва, як фермер ацэньвае старога каня.

— Мне гэта не падабаецца, — сказаў Дрыалі, незаўважна адсунуўшыся.

Ён адступіўся проста ў абдымкі да нейкага высокага спадара, які выцягнуў рукі і далікатна схапіў яго за плечы.

— Паслухаце, дружа, — сказаў незнаёмец, усё яшчэ ўсміхаючыся, — вы любіце плаваць і загараць?

Дрыалі паглядзеў на яго збянтэжана.

— Вы любіце добрую ежу і чырвонае віно з вінаграднікаў замка Бардо?

Спадар усё яшчэ ўсміхаўся, паказваючы здаровыя белыя зубы. Словы ён вымаўляў мякка і пранікнёна, рука ў пальчатцы ляжала на плячы Дрыалі.

— Ну... так, — адказаў Дрыалі, усё яшчэ збіты зпанталыку, — вядома.

— А кампанія прыгожых жанчын?

— Чаму не?

— А пампушка-манікюрка, якая б клапацілася пра вашыя пазногці?

Хтосьці ў натоўпе хіхікнуў.

— А званочак каля вашага ложку, каб выклікаць пакаёўку са снеданкам? Вы б гэтага хацелі, мой дружа? Вас гэта прываблівае?

Дрыалі моўчкі глядзеў на яго.

— Рэч у тым, што я — уладальнік гатэля «Брыстоль» у Канах. Запрашаю вас туды жыць у раскошы і камфорце да канца вашых дзён!

Дрыалі глядзеў на гэтага высокага спадара ў жоўтых пальчатках з недаверам.

— Ідэя камічная, — вымавіў ён марудна.

— Гэй, пачакайце! — умяшаўся дылер. — Слухайце сюды, дзядуля. Вось рашэнне нашай праблемы: я куплю карціну і найму хірурга, які выража скуру ў вас са спіны. Вы зможаце ісці куды хочаце і распараджацца вялікімі грашыма, якія я вам заплачу!

— Без скуры на спіне?

— Не, не, калі ласка! Вы не так зразумелі. Хірург прышые новы кавалак скуры на месца старога. Гэта проста.

— Хіба ён можа такое зрабіць?

— А нічога асаблівага ў гэтым няма.

— Немагчыма! — сказаў спадар у жоўтых пальчатках. — Ён занадта стары, каб перанесці такую вялікую перасадку скуры. Гэта яго заб'е. Гэта заб'е вас, дружа!

— Гэта заб'е мяне?

— Натуральна. Вы не выжывеце. Застанецца толькі карціна.

— Божа літасцівы! — крыкнуў Дрыалі.

Рука ў ярка-жоўтай пальчатцы зноў паляпала Дрыалі па плячы.

— Ну, — казаў спадар, расцягваючы рот у белазубай усмешцы, — вы і я зараз пойдзем добра павячэраем і яшчэ пагамонім пра гэтую справу. Як вам прапанова? Хочаце есці?

Дрыалі слухаў яго, насупіўшы бровы. Яму не падабалася доўгая гнуткая шыя гэтага фацэта і тое, як ён па-змяінаму выцягваў яе наперад, калі штосьці казаў.

— Смажаная качка і сухое шамбэртэн, — працягваў спадар. Словы ён вымаўляў з асаблівым націскам, глыбока і сакавіта, смакуючы кожнае. — І, магчыма, суфле з каштанаў, лёгкае і далікатнае.

Дрыалі ўзвёў вочы да столі, ягоныя вусны сталі бязвольнымі і вільготнымі. Бачна было, што гаротны стары ажно захлёбваецца слінай.

— Як вы хочаце, каб для вас пасмажылі качку? — працягваў спадар, — моцна, да залацістай скарынкі, ці каб...

— Я іду, — хутка сказаў Дрыалі. Ён ужо падабраў з падлогі кашулю і рашуча нацягваў яе на сябе праз галаву. — Пачакайце мяне, месье, я іду з вамі!

Літаральна праз хвіліну яго і ягонага новага знаёмца ўжо не было ў галерэі.

Не больш чым праз некалькі тыдняў на аўкцыёне ў Буэнас-Айрысе ўсплыла карціна Суціна: выкананы ў незвычайнай манеры жаночы партрэт, змешчаны ў цудоўную раму і пакрыты дарагім лакам. Гэта і той факт, што ў Канах няма гатэлю «Брыстоль», прымушаюць крыху насцярожыцца і памаліцца за здароўе старога. І моцна спадзявацца на тое, што дзе б ён цяпер не знаходзіўся, пампушка-манікюрка паліруе ягоныя пазногці, а пакаёўка прыносіць зранку сняданак у ложак.

**Пераклала з ангельскай мовы**
**Алена Казлова (Анка Упала)**

▸ **АПОВЕДЫ**

# ДАБРАНАЧ, КАХАНАЯ

Усевалад СЦЕБУРАКА



## Перажыць святога Валянціна

...Прачнуцца рана ранкам, зірнуць у вакно і пабачыць ясны дзень, пабачыць сняжок, што блішчыць на лёгкім марозцы. Удыхнуць поўныя грудзі, затрымаць дых і глядзець у далечыню... Пакінуць фортку расчыненай і пайсці зрабіць каву. Вярнуцца да вакна, падставіць твар пад ласкавыя промні сонца, зрабіць першы глыток і не запаліць... Усміхнуцца сабаку, які рады вам, як ніхто іншы на ўсім гэтым свеце, рады нават зранку... Прызнацца сабе, што і вы радыя яму, бо ён шчыры і кожны ягоны дзень — гэта прызнанне ў любові да вас. Выйсці з ім на двор у ірваных хатніх джынсах і куртцы, накінутай на саколку, уздрыгануць ад холаду і пазяхнуць, зляпіць снежку і шпурнуць з усяе моцы...

Вярнуцца дахаты, дапіць каву, памыцца і перарабіць за колькі гадзін усю хатнюю справу, што няўмольна назапашвалася напрацягу месяца і наводзіла скруху нават адной толькі думкай аб сабе. Працаваць, атрымліваць асалоду ад кожнай хвіліны, проста ад таго, што дыхаеш, адчуваць сваё паслухмянае цела, думаць пра добрае... Зрабіць прыборку, выкінуць смецце, пасцяліць белы абрус, перавесіць фіранкі, памяняць месцамі карціны і змяніць фота ў рамцы на пісьмовым стале.... Выпадкова знайсці ў сакратэры калісьці важныя, а цяпер проста незразумелыя паперы, рахункі, чэкі, паштоўкі старых сяброў, гарантыйныя квіткі на рэчы, якія ўжо даўна адслужылі сваё... Засумаваць. Уключыць музыку. Доўга шукаць, амаль перадумаць... і ўсё ж уключыць! Нібы па пакліканні, штo-небудзь адтуль, з юнацтва, калі сэрца соладка замірала і, збіваючыся з рытму, збягала ў пяткі ад аднаго погляду ўбок смешнай дзяўчынкі з паралельнага класа. Не думаць пра тое, што яна ўжо карова і разведзеная, проста пасміхнуцца мінуламу.

Улезці ў ванну і, лежачы ў пене, узгадваць і марыць. Выйсці чыста паголеным і памаладзець гадоў на пяць. Падміргнуць люстэрку і адзначыць пра сябе, што калі не піць і высыпацца, то ў адлюстраванні цябе сустрэне цалкам нармальны персанаж...

Затым пайсці на працу і там не выматацца, а сыходзіць з пачуццём задавальнення і шчырым здзіўленнем, што гэтак, аказваецца, яшчэ бывае...

Ісці па вулках свайго горада і не спяшацца сесці ў маршрутку. Ісці і разглядаць усё як турыст, што трапіў на гэтыя вуліцы ўпершыню. Прыйсці да высновы, што места зусім нічога сабе і жыць можна... Пасля ў бары на рагу сустрэць добрага сябра і выпіць кавы, паразмаўляўшы пра дробязі і чужых дзяцей, што хутка растуць...

Вярнуцца ўвечары дахаты... Моўчкі пачухаць за вухам сабаку і, не распранаючыся, стомлена плюхнуцца ў фатэль, ціхенька ўключыць радыё і зірнуць у тое ж, але ўжо цёмнае вакно. Пабачыць агеньчыкі ў далёкіх і блізкіх будынках, унізе — самаходы, што спяшаюцца адвезці дамоў сваіх гаспадароў, агледзецца навокал... Падняцца, дастаць прыхаваную да нагоды і цудам яшчэ нераспітую пляшку каньяку... Зварыць каву, удыхнуць тонкі пах з бакала, выпіць, напляваўшы на алкаголь, вялікі глыток, і тут ужо запаліць ад душы, пускаючы дым у нерухомае паветра перад сабой... Наліць яшчэ і з пяшчотай і болем падумаць пра яе, тую, дзеля якой, па сутнасці, калі прызнацца шчыра, усё і рабілася сёння з самага ранку; пра яе, якая за сотні кіламетраў у іншым горадзе таксама пражыла сваё 14 лютага...

Сядзець да глухой ночы, запаліць свечку і глядзець у цемру, дапіць каньяк і халодную каву, прыбраць рэшткі банкету на адну персону... Легчы ў такі вялікі для цябе аднаго ложак і, перад тым, як заплюшчыць вочы, сказаць услых, так, нібы яна побач і здольная пачуць твой шэпт: «Дабранач, каханая. З днём святога Валянціна»...

## Альфа і чаравічкі

У пэўны час мой бацька з тэрапеўта перакваліфікаваўся ў эндаскапіста і распачаў працаваць з новай тэхнікай у выглядзе разнастайных зондаў. Медычныя прычындалы мелі непрыемную асаблівасць псавацца і патрабавалі рамонту, які рабілі не бліжэй як у «калысцы рэвалюцыі» — Ленінградзе. Заадно, там жа праходзілі і курсы па падвышэнні новай бацькавай кваліфікацыі. І ён досыць часта наведваў «паўночную Пальміру».

Найбольшыя выгоды з ягоных камандзіровак мелі мы з братам. Нам штоaccess раз перападала безліч цацак і прэзентаў: пачынаючы ад дэфіцытных у нас плытак з цікавымі казкамі вытворчасці «Ленінградскай студыі гуказапісу» ды заканчваючы дартсам, лялечнай чыгункай і арбалетам.

Аднойчы, пасля чарговага вяртання, разбіраючы пакункі (як усе дзеці, пачынаючы з найбуйнейшага), мы з братам лёталі па хаце, гучна выказваючы свае эмоцыі. Бацька, які назіраў за гэтым вэрхалам, моўчкі раптам схіліўся, падняў з падлогі зусім невялічкую шэраньку картонную пушку і працягнуў яе нам... Усе цацкі былі паадкіданыя, бо на дне той, скруціўшыся на шалiку, ляжаў маленечкі шчанючок і салодка спаў.

Ці варта казаць, што новы жыхар нашай кватэры стаў самым любімым і прыцягнуў усю нашую ўвагу і заняў вольны час. Для бацькоў жа спаніэль Альфа ператварыўся ў трэцяга капрызнага дзіцёнка. Як высветлілася, да палявання сабака не меў аніякага інтарэсу, хварэў не меней за нас, еў пераборліва, як кароль, і палюбляў спаць выключна на бацькоўскім ложку ў спальні.

Але ж усё гэта было дробязямі ў параўнанні з адным выбітным яго выкрунтасам.

На той час я ўжо меў непрыемны абавязак пяць дзён на тыдзень зранку атрымліваць веды ў бліжэйшай да нашага дому СШ №2 горада Жлобіна. Мой жа малодшы браток пры гэтым шчасліва бавіў вольны час дома — пры цацках, тэлеку і цюці. Застаючыся дома, школы брат і сабака прыносілі звычайна аднолькава, і, што характэрна, у сукупнасці значна менш, чым паасобку. Высветлілася гэта акалічнасць, калі аднойчы Толюсь, засумаваўшы ў кампаніі Альфы, пайшоў сустракаць мяне са школкі.

Выбегшы пасля якіх чатырох урокаў з будынку, я пабачыў малога на арэлях у двары — ужо тады чарвячок прадчування непапраўнага варухнуўся ў мяне недзе пад левай нагруднай кішэняй сіняга форменнага спінжачка. Сам незалежна-бесклапотны выгляд брата пацвярджаў горшыя думкі — незавязаныя шнуркі і несіметрычна зашпіленыя гузікі на кашулі яскрава сведчылі пра тое, што з хаты выйшаў ён цалкам самастойна і пакінуў яе на сваю сяброўку Альфу!!! Зразумеўшы, што наступствы безумоўна не прымусяць сябе чакаць, я схапіўшы Толю за рукаво, пабег да пад'езда і адным скокам заляцеў на другі паверх. Як і трэ' было чакаць, дзверы ў хату Толя не зачыняў — навошта? Злодзеі б безумоўна спалохаліся страшэннага вартавога ваўкарэза...

З трымценьнем у каленях я ўвайшоў у вітальню, і адразу з цемры да мяне кінулася, круцячы куртатым хвосьцікам, Альфа. Я наважыўся распрануцца і скамянеў: на падлозе ля шафы з адзеннем ляжала нашая супольная з сабакам смерць — згрызеныя ўшчэнт бясцэнныя лакаваныя імпартовыя (швейцарскія), мо толькі раз апранутыя, матуліны чаравічкі!!!

...Пад вечар з працы дахаты вярнуліся бацькі. Іх прыходу я чакаў як Армагедону, якога не пазбегнуць і ў якім нельга перамагчы. І мае прадчуванні спраўдзіліся. Апускаючы падрабязнасці гвалту і ляманту, які стаяў у кватэры нумар 77 недзе з паўгадзіны, паведамлю толькі вырак: школьная і сацыяльна небяспечная жывёліна Альфа жыве ў хаце апошнюю ноч. Безумоўна, пачуўшы такое, мы з малым прапанавалі замяніць прысуд цюцю нашым, хоць і самым балючым фізічным пакараннем, — прапанова была прынятая, але і рашэнне аб дэпартацыі сабакі не скасавалі. У адказ на гэта я заявіў, што пайду па белым свеце разам з гаротнай выгнанніцай і, задаволены такой самаахвярнасцю, пайшоў разам з ёй спаць...

Ранкам, не пабачыўшы сабакі побач, я падскочыў як мячык і адчуў жудасны страх і роспач — канец! Гаўняны з мяне цімуравец, калі я не ўпільнаваў сябра ад расправы. Дзе ўжо мой сабачка — страшна было падумаць. Я саскочыў з ложка і ... наступіў на нешта цёплае, якое незадаволена рыкнуўшы, пацягнулася, пазяхнула і пачало лашчыцца, просячыся ісці сікаць на двор. Жах трохі адпусціў, але я не спяшаўся святкаваць перамогу — меў падазрэнні, што бацькі задумалі нешта іншае ці проста часова адклалі абяцаную ўчора помсту...

Гэтак у напружаным чаканні правёў я некалькі дзён. Драпежная знішчальніца абутку паводзіла сябе як звычайна, робячы дробную шкоду, але да шафы ў вітальні не падыходзіла і блізка. Канфлікт аціх неяк сам сабой і адышоў у сямейны фальклёр.

Прайшлі гады, і матуля забылася на тыя чаравічкі, памерла Альфа, малодшы брат скончыў універсітэт, а я ва ўласнай хаце маю сябра сям'і — рудога, як медзь, добрага і сімпатычнага сабаку Эмі, дарэчы, таксама спаніэля. І ён, як колішняя гераіня аповеду, яшчэ той шкоднік і неслух, але гэта, як кажуць, зусім іншая гісторыя.

## Virtuti Military

*Дзяцінству дзеда Анатоля прысвячаецца*

У мястэчку Крывічы, што нездарма за Польшчай з'яўлялася цэнтрам гміны, было ўсё. Царква, касцёл, сінагога, кірмаш, крамы, заезныя дамы, пошта, бальніца, аптэка і чатыры млыны. Недалёка ад мястэчка праходзіла чыгунка, што яшчэ больш ажыўляла і так не маруднае жыццё. Дзеля паўнаты карціны ўжо намаляванага дабрабыту дадамо, што меліся ў Крывічах таксама рэстаран Стасінскага і нават майстэрня па рамонце і пракаце ровараў.

Адпаведна палітыцы дзяржавы, гэтую інфраструктуру дапаўнялі ўстановы адукацыі. Школа ў мястэчку месцілася ў ладным будынку, зробленым якасна і трывала. Дырэктарам у ёй служыў пан Эймант. У Крывічах ён лічыўся чалавекам адметным. Як шмат хто з начальніцтва, пан Эймант апранаўся па тагачаснае модзе: хромавыя боты, галіфэ, фрэнч. Сваёй кавалерыйскай паставай і выключна бравай хадой дырэктар, хоць і выкладаў ён адно толькі фізічнае выхаванне, выклікаў у вучняў і дарослых павагу. Яго колішнія смаркатыя вучні, цяпер сівыя дзяды, памятаюць выпадак, калі дырэктар, дапамагаючы нешта рамантаваць на даху школы, сарваўся долу. Імгненна зарыентаваўшыся, ён спрытна, нібы кот, здолеў перавярнуцца ў паветры, згрупавацца і саскочыць на зямлю без траўмаў і пашкоджанняў. Памятаюць яны і як збіралася палова мястэчка паглядзець, як пан Эймант ранкам скідае кажух ля палонкі і тройчы запар у любую сцюжу бултыхае ў зімную ваду Сэрвачы...

1939 навучальны год для пана Эйманта стаўся вельмі непрацяглым. Разам з новым палітычным парадкам на далучаных землях і крывіцкая школка займела новага «правільнага» кіраўніка. Восеньскія месяцы былы настаўнік сядзеў без справы. Тым часам партыя нястомна шукала шкодны элемент сярод навадалучаных заходніх братоў. Напрыканцы восені, калі ранкам на траве ўжо пракідвалася шэрань, у дзверы дома рукой лейтэнанта НКУС пагрукалася савецкая Фэміда. Нельга сказаць, што зборы былі доўгімі, бо пан дырэктар разумеў сітуацыю і не дужа здзівіўся прыходу гасцей. Гэтак яны і пайшлі па мястэчку: пругкай бадзёрай хадой, апрануты ў свой вайсковы строй Эймант, далей — афіцэр, за імі два жаўнеры з вінтоўкамі.

Будынак мясцовых камісараў знаходзіўся непадалёк у польскім паліцэйскім пастарунку, прыгожым дамку з мансардай. На ганку іх сустрэў дзяжурны і прапусціў у сярэдзіну. З калідора канвой рушыў у свой пакойчык, афіцэр — з дакладам да начальніка, а спакойнага, паслухмянага затрыманага пакінулі на лаўцы пад дзвярыма.

Гмінны пастарунак ужо не быў тым ціхім месцам, што раней, калі ў ім трымалі двух-трох дробных злодзеяў ці п'янчуг. За апошнія месяцы сюды на допыты перацягалі вялікую колькасць людзей рознага веку і занятку. І не шмат каму шчасціла вяртацца дадому пасля наведвання гэтае ўстановы. Усё часцей небаракаў адвозіў на станцыю чорны фургон... Кароткая дарога па мястэчку, палахлівыя позіркі мінакоў, злавесная цішыня за чорнымі дзвярыма кабінетаў — ніштo не абяцала добрае развязкі. Эксдырэктар гэта адчуў і зразумеў, што ёсць адзінае выйсце...

Прайшло некалькі імгненняў, як цёмны калідор спусцеў. Пан Эймант рэзка скінуў з плячэй кажух, падняўся, спрактыкаваным рухам паправіў форменны строй і цвёрдым поступам пайшоў, не азіраючыся, па калідоры да выхаду. Крокі гулкім рэхам разносіліся па памяшканні пастарунка і паміралі ў цёмных кутах. Перад дзвярыма ён яшчэ раз хутка агледзеў сябе і рашуча выйшаў на ганак. Павольна, але не спыняючыся, спусціўся па прыступках паўз вартавога. Жаўнер павярнуўся да яго. На хвілю падалося, што чалавек нагадвае таго, каго нядаўна ўводзілі пад канвоем... але не... гэты ідзе так упэўнена...

Чаканячы крок, як на дэфілядзе па пляцы, незнаёмец з вайсковай выпраўкай прайшоў праз двор і знік за будынкам.

Далей гэты дзіўны афіцэр мітулем пераскочыў праз высокі плот, ірвануў па вуліцы і хутка знік з Крывічоў, разам — і з поля зроку ўсюдыіснае канторы.

Праўда, чуткі пра яго ўцёкі доўга хадзілі па наваколлі. Пазней нехта нібы бачыў яго ў няўлоўных аддзелах АК, іншыя казалі, што ён служыў у Арміі Людовай. Так было ці па-іншаму, але мой дзед і цяпер з непрыхаваным захапленнем і павагай узгадвае свайго колішняга дырэктара, які на сваім простым вайсковым гарнітуры на рочныя святы з шляхецкай годнасцю насіў узнагароду легіянера Пілсудскага — крыж Virtuti Military.

ПАЛІЦА

# «ЦЭНТР ЕЎРОПЫ» АД НЯКЛЯЕВА

**Саюз беларускіх пісьменнікаў распачаў літаратурна-выдавецкую серыю «Кнігарня пісьменніка».**

Выйшла першая кніга — зборнік прозы Уладзіміра Някляева «Цэнтр Еўропы». Гэта аповесці і апавяданні, напісаныя ў замежжы і па вяртанні з эміграцыі, многія з якіх у розныя гады друкаваліся ў часопісах ды газетнай перыёдцы.

У прадмове да кнігі Андрэй Федарэнка робіць слушную выснову, што «нельга стварыць праўдападобную ілюзію падарожжа ў далёкія заморскія краіны, калі ўсе твае вандроўкі — да бліжэйшага газетнага шапіка. Дык вось у гэтым плане і выйгрыш, і плюс, і элементарная павага, і давер да аўтара «Цэнтра Еўропы»».

Уладзімір Някляеў нязмушана стварае атмасферу поўнага даверу паміж чытачом і героямі сваіх празаічных твораў. Аўтар змясціў у кнігу аповесці «Вяртанне Веры», «Прага», «Вежа», «Мірон ды Мірон», «Няхай жыве 1 Мая!», а таксама больш за дзесяць апавяданняў.

Зборнік прозы Уладзіміра Някляева «Цэнтр Еўропы» выйшаў накладам 700 асобнікаў і ўжо паступіў у продаж.

## ДАКУМЕНТЫ СУПРАЦІВУ

**У сваёй кнізе-даследаванні «Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20–30-я гады XX ст.): дакументы і матэрыялы» (Мінск, «Медысонт», 2009. — 192 с.) Ігар Пушкін асвяціў прычыны, сутнасць і гістарыяграфію беларускага ўзброенага ўздыму.**




Зборнік змяшчае больш за 110 дакументаў, якія аб'ектыўна асвятляюць тагачасныя грамадска-палітычныя падзеі. Аснову кнігі складаюць дакументы з дзяржаўных архіваў Беларусі. У кнізе, выдадзенай пры падтрымцы МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», ёсць бібліяграфія па тэме даследавання.

У якасці навуковых рэцэнзентаў кнігі выступілі доктар гістарычных навук, прафесар А. П. Грыцкевіч і кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. Р. Агееў.

ЦЫТАТНІК

**«Народная воля», 15.05.2009, №73-74:**

«Нядаўна ў Слуцку праводзілі выязны семінар Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, якое ўзначальвае Мікалай Чаргінец. Групу літаратараў узначальваў старшыня гэтага аддзялення Рыгор Сакалоўскі, былы «афганец». Госці мелі сустрэчу з кіраўнікамі раёна, якія падарылі ім герб нашага горада, а Р.Сакалоўскі перадаў для раённай бібліятэкі некалькі сваіх кніжак. У 307-й асобай чыгуначнай брыгадзе ўдзельнікі семінару выступілі перад вайскоўцамі, гаварылі аб патрыятычным выхаванні моладзі, чыталі свае вершы. Усе — у стылі 60–80-х гадоў мінулага веку…

А вось сябры старэйшага Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» на чале з нашым земляком Алесем Пашкевічам ужо гадоў пяць не маюць магчымасці прыехаць у Слуцк і свабодна сустрэцца з чытачамі, перадаць свае новыя творы. З падачы Міністэрства адукацыі ім забаронена наведваць школы, бібліятэкі, Дамы культуры… Кіраўнікі раёна выкананцы такую недарэчную «ўказіўку», да якой не дадумаліся ў свой час нават вельмі пільныя камуністы. Апошні раз сам Алесь Пашкевіч, яго сябры па літаратурнай суполцы, у якой налічваецца каля 600 чалавек, пераважна з багатым літаратурным багажом — такія, як Уладзімір Арлоў, Наталка Бабіна, Анатоль Сідарэвіч, мусілі збірацца на прыватнай арандаванай кватэры, дзе мелі сустрэчу з членамі мясцовай Рады ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны». Праз нейкі час гаспадар адмовіўся пускаць такіх гасцей — збаяўся пераследу мясцовых улад.

Як вядома, тры гады таму пісьменніцкая арганізацыя краіны распалася на два саюзы. Першы, Чаргінцовы, мае ад улад бюджэтную падтрымку, літаратурныя выдавецтвы, часопісы і газету «ЛіМ», права сустракацца з чытачамі ва ўсіх раёнах. Другі, Пашкевічаў, не мае ні падтрымкі, ні магчымасці збірацца ў былым, адабраным Адміністрацыяй прэзідэнта, Доме літаратараў, ні права выступаць перад народам, для якога яны ствараюць свае творы. Вось і прыпомніўся адзін з дарэвалюцыйных вершаў Якуба Коласа «Асадзі назад!», у якім бедаку, куды б ён ні звяртаўся, чулася казённа-злоснае «Асадзі назад!»

**Алесь КАРНІЦКІ, жыхар г. Слуцка»**

БЫЛІЦА

# ЖЫД ПАД ВОКЛАДКАЙ

## ПРА НЕБЯСПЕКУ КНІГ НА МЫТНІ

**Сяргей АСТРАВЕЦ**




**Мацёрая мытніца перш хапаецца за кніжку, што ляжыць у заплечніку зверху. «Друкаваная прадукцыя» — не меншая мара для цяперашніх мытнікаў, чымсьці для колішніх: рукапісы, машынапісы, дысідэнцкія тэксты, нелегальшчына. На вышыні пільнасці, службовага абавязку, з віжунскім нюхам, не горшым за рэксавы! Граматы, прэміялкі, дошка гонару, наплечнікі, прозвішча ў агульным загадзе, у святочным дакладзе на ўрачыстым сходзе з нагоды прафесійнага дня працаўніка мытнай службы…**

Кніжка, аднак, у цэлафане. І, да жалю, не на мове падпольшчыкаў і партызанаў! Хаця, хаця, шаноўная мытніца, не забывайцеся, што дыверсанты і шпіёны ў любімыя вашыя савецкія часы, хрэстаматыйны прыклад! — пад бяскрыўднай вокладкай правозілі іншы друкаваны змест, антысавецкі! Больш за тое, яны рабілі хованкі з кніжак, пад цвёрдай вокладкай выразалі ў мязе старонак дуплы ў форме забароненай рэчы, пісталета, напрыклад. Або фотакасеты хаця б… Ці пачка жуйкі. Нечакана для Акінчыц мытніца, аднак, вымаўляе: «Жыд», усяго толькі… Апазнаць у Gide Жыда? На першае вока, адразу? Не такая яна простая! Але самая, самая мацёрая, дальбог. Мацёршай не бывае. Спытайце ў любога кантрабандыста. Яны нібы агню баяцца яе. Не дай Божа трапіць менавіта да яе, не дай!

Яна пачынае задаваць Акінчыцу зусім наіўныя, простыя пытанні, якуюсьці элементаршчыну. Напрыклад: для чаго лыжка або відэлец? Што рабіць з кніжкай? Чытаць? Вы чытаеце не па-руску? Навошта? Калі ёсць вялікія Талстой і Пушкін, Горкі і Дзям'ян Бедны, Шолахаў і Сямён Бабаеўскі?! Якія пісалі на вялікай мове, на якой размаўлялі Ленін і г.д. Але раптам, зусім нечакана мытніца капітулюе, мабыць, нечакана нават для самой сябе: вы першы парадачны чалавек, які мне трапіўся са 102-х… (Сёння ці цяпер?) О, Акінчыц быў ажно 102-м! Яна, аказваецца, і падлік вядзе дакладны, прычым відавочна ў думках, блакноціка або запісу на далоні Акінчыц не заўважыў. А вы яшчэ сумняваліся ў ейнай мацёрасці?

І ў яго ўсяго Жыд, у якім яна вось жа не бачыць крамолы, адразу выкасоўвае са спісаў, хаця кнігі на яе дзейнічаюць як чырвоная ануча. Дзіва што: спачатку 101 цётка, як Калабкі, на якіх па пяць мінімум кофтаў, швэдраў, зверху куртка. Круглыя, потныя, запараныя, якіх Акінчыцу нават шкада. Хаця купіць потны швэдар здаецца не вельмі прываблівай перспектывай. І вось першая кніжка! Але якая зусім не пахне партызанскай мовай, дзяржаўнай у паасобных памяшканнях, свабодных ад таталітарнай савецкай улады, ад чэпкіх вачэй, вострага нюху жанчын-дэгустатарак тытунёвай фабрыкі, часам ад вялікіх вушэй, узмоцненых жучкамі-павучкамі.

Вось і спытай Акінчыц сам сябе: навошта табе быў той Жыд? Як навошта? Гэта табака для Рэкса, звычайная нават махорка. Бо мэта Акінчыца — збор матэрыялу, вострыя жывыя ўражанні, свяжынка. Пакуль яны вылятваюць цябе, ты назіраеш, ты прынюхваешся, мацаеш уражанні, вызначаеш смак, ствараеш, выбудоўваеш, прадумваеш, пераважваеш пачуцці, ты ў творчай лабараторыі (ах, як жа табе не падабаецца гэтае штучнае словазлучэнне!), твае вочы фатаграфуюць, робяць сухую праяўку, выдаюць здымкі. Ты моўчкі друкуеш, табе гэтае слова значна прыемнейшае за «набіраеш», чорныя ланцужкі літарынак, сказаў, агранцы абзацаў.

Гэта эксперымент на сабе, выпрабаванне новай вакцыны, дакладная фіксацыя амаль па секундах таго, што адчуваеш, што малюе табе твая ўява, якія прадчуванні ўзнікаюць. На жаль, спазненне фатальнае. Страчанага не нагнаць, не вярнуць, не аднавіць. Акінчыц добра ўсведамляе, што аповесці перасячэння мяжы яму цяпер ніколі не напісаць, бо ён не фіксаваў уражанні, яны сцёрліся, забыліся, зніклі. Цяперашні выпадак — не больш за гульню, абзац, старонка. На жаль.

На жаль, бо мяжа для савецкага (хай нават пост-) чалавека не тое ж самае, што для проста еўрапейскага, дакладней праходжанне самой мяжы. Бо гэта савецкая мяжа, на якой савецкія парадкі, не кажучы пра службоўцаў. Дзе чалавек не чалавек нават… Хай там у Еўропе ўсчалі сваё вар'яцтва з цюбікамі зубной пасты ў аэрапортах, з дэзадарантамі, успрымаецца гэта ўсё ж весялей, чымсьці на мяжы дзвюх сістэмаў, дзе на жалезную заслону адно наклеілі арнамент. Там, у Еўропе, кніжкі, прынамсі, не выклікаюць падазрэнняў. Сёння не 1933-ці, маўляў.

«Жыд, усяго толькі? Вы першы парадачны чалавек…» Магчыма, такі эпіграф надрукуе Акінчыц, будучы па-ранейшаму пад уражаннем, здзіўляючыся неспадзяванай найвышэйшай, можна сказаць, адзнацы, атрыманай ім калісьці падчас праходжання мяжы.

Зусім забыўся: усе гэтыя лісты да сабакі, тутэйшыя, самасуі, жывагі, архіпелагі ў Акінчыца ў галаве, на прыродных носьбітах, карацей. Так-так, усе гэтыя тэксты. Машынапісы, рукапісы ў яго ў галаве. А галовы яшчэ не прызначылі прасвечваць на мытні разам з валізкамі і торбамі. Зрэшты, у нашым разе нічога ўвогуле не прасвечваюць, па старому корпаюцца ўнутры. Ручная работа, словам, hand made.

Ён, Акінчыц, мусіць гуляць згодна з правіламі, зацверджанымі на Алімпе ці на Лысай гары, няважна дзе, і ўсё ж не можа пазбыцца няўтульнасці, непрыемнага здзіўлення, ніякаватасці ад усведамлення: кніжка — самы небяспечны, забаронены для ўвозу — і вывазу таксама — тавар у XXI стагоддзі, у асобна ўзятай, зразумела ж, краіне. У яго ў галаве гараць словы-таўро «друкаваная прадукцыя». А калі заплюшчыць вочы, то й гараць, гараць арыштаваныя на мяжы кнігі, разам з газетнымі тыражамі. Паводле рашэння суда, зразумела, на самай законнай падставе, законней не прыдумаць! Чым не 33-ці, га? Кніжкам, ва ўсякім разе, зусім не весялей, што цяпер не паляць таксама «аднафамільцаў» французскага нобелеўскага лаўрэата, якога ўдалося правезці праз пільныя кардоны Акінчыцу.

О, Першадрукар наш, якога жалезным дзеркачом вымелі з цэнтральнага праспекта! Ці мог ты ўявіць, што такое паўторыцца амаль праз паўтысячы гадоў, але гэтым разам не на Красным пляцы, а ў тваёй роднай старонцы?

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 5 ЧЭРВЕНЯ, ПЯТНІЦА

**05.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.10** Гатуем разам.
**08.25** Сфера інтарэсаў.
**08.45** Выпускны іспыт па матэматыцы за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных установах. Выпускныя іспыты па рускай і беларускай мовах за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных установах.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладраматычны серыял «Тэрарыстка Іванова» (Расія).
**10.00** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**10.50** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні» (ЗША).
**13.05** Камедыйны дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Шпілька.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Меладраматычны серыял «Дзве сястры» (Расія).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Меладраматычны серыял «Тэрарыстка Іванова» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**23.30** Містычны трылер «Сем дзён да смерці» (ЗША - Германія - Чэхія).
**01.15** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Шальны анёл». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Дакументальны дэтэктыў».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Вялікая розніца».
**22.10** Фільм «Сястрычка Бэці».
**00.15** «Наша Belarussia».
**00.50** Трылер «Забойцы на замену».
**02.20** Нашы навіны.
**02.35-02.45** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Гаішнікі». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Дарагая перадача».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Каханне Аўроры». Украіна, 2007г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.40** Фільм «Бездань». Германія, 2008г.

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Угон» (Расія).
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Час футболу.
**10.40** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.35** «Лабірынты:сеча пад Хоцінам або апошні бой гетмана».
**12.05** Вясковы дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы-2» (Расія). Заключная серыя.
**12.55** Серыял «Адно каханне душы маёй» (Расія). 4-я серыя.
**13.55** Мультфільм.
**14.05** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**14.25** Пазакласная гадзіна.
**14.40** Школа рамонту.
**15.30** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.25** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.55** Медычныя таямніцы.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Усё аб бяспецы.
**19.20** Бітва экстрасэнсаў.
**20.20** Калыханка.
**20.40** Экспедыцыя.
**20.45** Камедыя «Крутая кампанія» (ЗША).
**22.35** Гістарычны дэтэктыў «Начны дазор» (Галандыя-Канада- Вялікабрытанія).

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2», Расія, 2008 г..
**12.20** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Андрэй Бітаў. Крок у бок ад агульнага струменя». Фільм 4-ы. Дак.серыял.
**14.50** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.40** Фільм «Дуброўскі». 4-я серыя.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.25** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.15** Навіны - Беларусь.
**22.25** Фільм «Свая чужая сястра», Расія.
**00.15** Фільм «Меланхалічны вальс».
**01.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Галоўны герой».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Шнур вакол свету».
**10.50** «Авіятары».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Пагоня за анёлам».
**12.05** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** «Асоба небяспечны!».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі...».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.50** Прэм'ера. Фільм «Шпількі».
**22.45** Любоўна-эратычная меладрама «Лэдзі Чатэрлей».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**10.00** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Партугалія - Чылі.
**11.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР.
**12.15** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Паўфінал.
**14.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**19.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**19.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Нідэрланды - ААЭ. Прамая трансляцыя.
**21.15** Футбол. Еўрагалы.
**21.30** Футбол. Еўрагалы.
**21.45** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Аргентына - Егіпет. Прамая трансляцыя.
**23.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Паўфінал.
**01.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**01.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**19.05** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**19.30** «Па кім маўчыць звон?», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**20.00** «Без рэтушы»: «Чырвоны беларус», 2009 г., Польшча.
**20.25** Кружэлка (сусветная музыка).
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).
**21.15** Госць «Белсату».
**21.30** «Познань'56», маст. фільм, 1996 г., Польшча.
**23.20** «Апошні сезон», серыял.
**00.10** Аб'ектыў (навіны).

## 6 ЧЭРВЕНЯ, СУБОТА

**06.25** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.55** Брытва Окама.
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05, 12.10** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.00** Здароўе.
**10.35** Шпілька.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.20** Гістарычная меладрама «Сказ пра то, як цар Пётр арапа ажаніў» (СССР).
**14.05** Дакументальны цыкл «Мая праўда. Уладзімір Высоцкі» (Украіна).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Ваенная кінааповесць «Пайсці і не вярнуцца» («Беларусьфільм»).
**17.25** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**17.45** Відэафільм АТН «Слаўгарад» цыклу «Зямля беларуская».
**18.20** «Ваша лато».
**19.10** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Рамантычная камедыя «Як знайсці ідэал» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**22.10** Крымінальная меладрама «Краіна глухіх» (Расія - Францыя).
**00.15** Уласны персонал.
**00.45** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Турцыі. Кваліфікацыя.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.35** «Здароўе».
**10.20** «Смак».
**11.00** Камедыя «Афоня».
**12.40** Мультфільм «Вяртанне блуднага чыюка».
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.40** «Кінаметры вайны». «Прыбыццё цягніка. Глыбокая плынь».
**14.10** «Глыбокая плынь». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Вялікая палітыка.
**16.50** «Вялікія дынастыі: Пушкіны».
**17.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.50** АНТ прадстаўляе: «Футбол. Адборачны матч чэмпіянату свету. Беларусь - Андора». Прамая трансляцыя.
**21.00** Нашы навіны.
**21.20** Навіны спорту.
**21.25** «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.05** «Што? Дзе? Калі?».
**23.30** Фільм «8 міліметраў».

**06.40** «Турысты». Камедыйны серыял.
**07.30** Фільм «Фантазіі Вяснухіна». СССР, 1977г.
**09.35** «Я - вандроўца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.00** Фільм «Выкраданне чарадзея». СССР.
**14.30** «Дарагая перадача».
**15.05** «Рэальны спорт».
**15.20** «Ваенная таямніца».
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Нашы рэкорды».
**18.10** «Top Gear. Руская версія».
**19.05** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Утоеная пагроза». ЗША.
**21.55** Канцэрт М.Задорнава.
**23.05** Фільм «Ашалелыя сабакі». ЗША, 1992г.
**00.50** Фільм «Запал». ЗША, 2003г.

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.15** Серыял для дзяцей «Філ з будучыні» (ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**09.25** Таемны густ.
**10.35** Жансавет.
**11.00** Школа рамонту.
**11.55** Невытлумачальна, але факт.
**12.55** «Лабірынты: Грыгорый Цамблак - мітрапаліт Кіеўскі».
**13.20** Запал па культуры. Ток-шоў.
**14.00** Меладрама «Бомж» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
**15.55** Гандбол. Плэй-офф чэмпіянату свету. Жанчыны. Беларусь - Румынія. Прамая трансляцыя.
**17.35** Дэтэктыў «Я - целаахоўнік» (Расія). 1 - 4 серыя, заключная.
**20.50** Жаночая ліга.
**21.20** Хакей. НХЛ. Кубак Стэнлі. Фінал. 1-ы матч.
**23.05** Казанова.
**23.35** Драматычны баявік «Бітва ў Сіэтле» (ЗША-Канада- Германія).

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Весткі.
**07.15** Фільм «Чакаю і спадзяюся». 1-я серыя.
**08.25** «Каменная кветка». Мультфільм.
**08.50** «Суботнік».
**09.30** «Ранішняя пошта».
**10.05** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Пакой смеху».
**13.00** Тэлесерыял «Каменская».
**14.00** Весткі.
**14.20** «Таблетка ад старасці. Міфы і рэальнасць». Дакументальны фільм.
**15.20** Вострасюжэтны фільм «Кур'ер на ўсход».
**17.10** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Суботні вечар».
**21.30** Фільм «Індзі», Расія, 2007 г.
**23.25** Авантурная камедыя «Вышукное бюро «Фелікс».
**01.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Казкі Бажэнава».
**08.45** Мультфільм.
**09.00** «Агляд».
**09.30** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Асоба небяспечны!».
**14.10** Баявік «Пастка».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Жаночы погляд».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**19.55** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**21.00** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**21.55** «Ты не паверыш!».
**22.50** Прэм'ера. Прыгодніцкі баявік «D. O. A. Жывы або мёртвы».
**00.15** Любоўная драма «Спытай у пылу».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**10.00** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Аргентына - Егіпет.
**11.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР. 8-ы тур. КНДР - Іран. Прамая трансляцыя.
**13.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР.
**14.00** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Нідэрланды - ААЭ.
**15.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Жанчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**18.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**18.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР.
**19.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Групавы этап. Францыя - Партугалія. Прамая трансляцыя.
**21.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР. 8-ы тур. Катар - Аўстралія.
**21.45** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР. 8-ы тур. Катар - Чылі. Прамая трансляцыя.
**23.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 у ПАР. Агляд.
**00.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адчынены чэмпіянат Францыі (Парыж). Жанчыны. Фінал.
**01.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**02.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Total Knock Out.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**18.40** «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, 2003 г., ЗША.
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** YoLife! (моладзевая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).
**21.10** Невядомая Беларусь: «Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**23.35** «Мой свет нарадзіўся ў кузні», рэпартаж, 2008 г., Беларусь.
**00.00** Аб'ектыў (навіны).

РЭФОРМЫ

# ДРУГАЯ АНГЛІЙСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

Алег НОВІКАЎ

**26 мая ў інтэрв'ю газеце «Guardian» Дэвід Камеран, лідэр партыі торы — адназначны фаварыт наступных парламенцкіх выбараў, падтрымаў ідэю палітычнай рэформы ў краіне.**



«За апошні год брытанцы сталі сведкамі краху двух самых старых сваіх інстытутаў — банкаўскай і палітычнай сістэмаў», — нядаўна горка падсумавала газета «The Independent».

З гэтым мінорным рэзюме цяжка не пагадзіцца. З пачатку фінансавага крызісу Сіці — банкаўскі цэнтр Лондана — на вачах губляе прэстыж і аўтарытэт. Банкіры сталі героямі народных анекдотаў і аб'ектамі жартаў сатырыкаў. Цяпер прыйшла чарга палітыкаў. Буйны карупцыйны скандал, у які аказаўся ўцягнуты спікер ніжняй палаты, шакаваў краіну. Негатыў быў такі моцны, што размова ўжо не ідзе пра пазачарговыя выбары або больш жорсткую форму кантролю за растратаю дэпутатамі публічных фондаў. Падданыя Яе Вялікасці хочуць перамен — змянення базавых прынцыпаў сучаснай палітычнай мадэлі Вялікабрытаніі.

«Брытанскі парламент — маці ўсіх парламентаў», — кажа старая прымаўка. Гэта праўда. Нават самы неадукаваны чалавек можа акрэсліць асноўныя прынцыпы палітычнай сістэмы Вялікабрытаніі. Па-першае, ёсць манарх, які выконвае прадстаўнічыя функцыі. Па-другое, існуе парламент, у якім дэпутацкая большасць фармуе ўрад.

У прынцыпе, гэта сапраўды так, хаця механізм працы парламента і выбарчая сістэма змяняліся на працягу амаль дзесяці стагоддзяў. Спачатку гэта была рада буйных феадалаў пры каралі. Пасля падпісання Вялікай хартыі вольнасці сябры парламента пачалі абірацца. У 1295 годзе парламент падзяліўся на палату лордаў і палату абшчынаў. Пасля «Слаўнай рэвалюцыі» 1688 года пачала складацца сістэма канстытуцыйнай манархіі, калі цэнтр улады паступова пераходзіў ад караля да парламента. «Біль аб правах» 1689 года канчаткова замацаваў у краіне рэжым канстытуцыйнай манархіі. Паступова аформіліся дзве палітычныя партыі — вігі, што баранілі інтарэсы арыстакратыі, звязанай з вярхамі буржуазіі, і торы, што абапіраліся на зямельную арыстакратыю і кансерватыўнае дваранства. Напрыканцы XVIII стагоддзя ў парламенце засядалі ў большасці зямельныя арыстакраты. Гэтаму садзейнічала архаічная сістэма нарэзкі выбарчых участкаў. Напрыклад, ад вёскі Самрун з насельніцтвам сем чалавек у парламент абіраліся два дэпутаты, што дазваляла багацеям за кошт банальнага подкупу выбаршчыкаў лёгка атрымаць дэпутацкі мандат. Выбарчыя ўчасткі кшталту Самрун, якія называліся «гнілыя месцы», былі ліквідаваныя дзякуючы славутаму Выбарчаму акту 1832 года. Гэта была першая парламенцкая рэформа, падчас якой выбарчае права займела буйная і сярэдняя буржуазія, стала ўзаконьвацца двухпартыйная сістэма: вігі трансфармаваліся ў ліберала ў, торы, адпаведна, — у кансерватараў. Пасля быў уведзены прынцып агульнага галасавання, праўда, спачатку толькі для мужчын. У 1910 годзе лібералы скарацілі кампетэнцыю палаты лордаў. У прыватнасці, пазбавілі яе права затрымліваць закон на тры сесіі, пасля чаго той аўтаматычна ўступаў у сілу. Апошнія рэформы мелі месца ў 1999 годзе, калі пэрам забаранілі перадаваць месцы ў палаце па дынастычнаму прынцыпу (выключэнне зрабілі для 92 сем'яў).

Цяпер чакаюцца новыя глабальныя рэформы. Практычна кожнае салíднае выданне ў краіне стварыла рубрыку, дзе абмяркоўваюцца праекты рэформы. Сярод іх ёсць вельмі радыкальныя: так, прапануецца, напрыклад, пакінуць цэнтральнаму парламенту сімвалічную ўладу і перадаць як мага больш кампетэнцый мясцовым камунам. Іх адміністрацыі, як сцвярджаюць аўтары канцэпцыі, змогуць: а) размяркоўваць грамадскія сродкі па больш справядліваму прынцыпу; б) кантраляваць маштабы выкідаў парніковых газаў у атмасферу (тэма кліматычных зменаў для брытанцаў — пытанне вельмі важнае, паколькі іх востраў можа стаць адной з першых ахвяр узняцця ўзроўню акіяну — наступства глабальнага пацяплення). Аднак гэта хутчэй выглядае як утопія.

Вось асноўныя прапановы па будучай рэформе, якія агучаныя ў цяперашніх дэбатах:

- Прыняцце канстытуцыі. Цяпер правілы дзейнасці ўрада і парламента шмат у чым не прапісаныя. Так, дату наступных выбараў прызначае прэм'ер. Натуральна, ён можа абвесціць іх у час, калі яго партыя мае добры рэйтынг.
- Прапарцыянальная выбарчая сістэма. Зараз дэпутаты абіраюцца па мажарытарнаму прынцыпу.
- Выбарчая сістэма, калі выбаршчык галасуе не за аднаго, а адразу за групу з двух-трох кандыдатаў, якія ў якасці дэпутатаў свае функцыі мяняюць па чарзе. Напрыклад, адзін засядае ў парламенце, другі займацца міжнароднай праблематыкай, трэці — лакальнымі пытаннямі на сваім выбарчым участку.
- Барацьба з такімі наступствамі глабальнага капіталізму, як ізаляцыя асобы ад грамадства, што вядзе да абыякавасці да сусветных праблем, спажывецкай формулы жыцця. Гэта патрабуе, у сваю чаргу, пакінуць у руках дзяржавы і грамадства сістэму адукацыі, медычнай дапамогі, сістэму асноўных медыя.
- Дэмакратызацыя вядучых партый.
- Абмежаванне заробкаў для чыноўнікаў і дэпутатаў.

Якія б праекты ні прапаноўваліся, відавочна, што ў выніку іх канкрэтная рэалізацыя залежыць ад кансерватараў. Пры ўсім радыкалізме цяперашніх настрояў, брытанцы галасуюць па старой традыцыі: або за лейбарыстаў, або за кансерватараў, або за лібералаў. Як сведчаць апытанні выбаршчыкаў, менавіта торы выйграюць наступныя выбары (папярэдняя дата выбараў — 2010 год). Сам Камеран у згаданым вышэй артыкуле піша пра фармат магчымых рэформ наступнае: «Я лічу, што ў цэнтры новай палітыкі павінен быць радыкальны перадзел улады. Улада павінна перайсці ад дзяржавы да грамадзян, ад ураду — да парламенту, ад Вайтхола (урадавы квартал у Лондане) — да камунаў. Ад Еўрасаюза — да Брытаніі, ад суддзяў — да народу, ад бюракратаў — да дэмакратыі. Праз дэцэнтралізацыю, празрыстасць, давер мы можам забраць уладу ў палітычнай эліты і перадаць яе людзям з вуліцы».

Самае цікавае, што тэзісы Камерана шмат у чым паўтараюць пункты перадвыбарчага Маніфеста лейбарыстаў 1997 года, у выніку якіх тыя на дзесяць гадоў прыйшлі да ўлады, і, натуральна, менавіта на іх большасць насельніцтва ўскладае адказнасць за цяперашнюю крызісную сітуацыю.

Хаця ў адным цяперашнія торы і тагачасныя лейбарысты дакладна разыходзяцца. Напрыканцы 90-х інтэрнэт быў яшчэ вельмі слабым. Таму Тоні Блэру (ён быў у 1997 годзе старшынёй лейбарысцкай партыі) у галаву не магла прыйсці ідэя Камерана. Зараз лідэр торы прапануе здымаць пасяджэнні парламенцкіх камітэтаў, якія непасрэдна дзеляць бюджэтныя грошы, і выкладваць тыя відэакадры на інтэрнэт-рэсурс *You Tube*.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

У Беларусі разлічваюць на актывізацыю эканамічнага супрацоўніцтва з ЕС. Некаторыя палітолагі сцвярджаюць, што Беларусь мае надзею мадэрнізаваць свой індустрыяльны сектар, выкарыстоўваючы еўрапейскія тэхналогіі і прыцягваючы заходнія інвестыцыі. Аднак у такім выпадку Еўропа можа ўцягнуць Беларусь у сферу свайго ўплыву. Між тым, Лукашэнка пакуль не здолеў знайсці разумны баланс паміж заходнімі і ўсходнімі кампанентамі сваёй палітыкі. Ні для каго не сакрэт, што інтарэсы Расіі і ЕС часам дыяметральна супрацьлеглыя і істэблішменту Беларусі раней ці пазней давядзецца рабіць выбар на карысць таго ці іншага накірунку.

**«FinTimes» (Расія)**

Няцяжка прадказаць, што хутка ўся прагрэсіўная грамадскасць хорам пачне праслаўляць Бацьку як самага вялікага дэмакрата і ліберала, адукаванага аўтакрата. Пабачыце, што гуманістычная інтэлігенцыя пачне марыць пра тое, каб Лукашэнка, якога на Захадзе пачнуць называць дэмакратам, стаў прэзідэнтам Расіі. Хаця за апошнія гады яго рэжым абсалютна не змяніўся. Усе гэтыя дзіўныя палітычныя трансфармацыі сталі вынікам палітычнай паразы пуцінскага рэжыму ў Грузіі. Заходнія стратэгі прыйшлі да думкі, што пуцінскія чэкісты не здольны кантраляваць сітуацыю. Каб не рызыкаваць і не атрымаць дэстабілізацыю, давядзецца найбольш вялікія часткі браць пад непасрэдны кантроль. Пачалі з Беларусі — працэс пайшоў. Як ні парадаксальна гучыць, у недалёкай будучыні пад цвёрдым кіраўніцтвам Бацькі прасавецкая Беларусь мае большыя шансы аказацца прынятай у ЕС і NATO, чым хаатычная Украіна.

**АПН (Расія)**

Прычына праблемы (расійска-беларускія гандлёвыя войны) — у эканамічнай палітыцы Беларусі. Беларускія прадпрыемствы, якія атрымліваюць субсідыі і прэферэнцыі, маюць магчымасць дэмпінгаваць на расійскім рынку, выклікаючы лагічнае незадавальненне мясцовых калег. Другая прычына абмежаванняў на шляху беларускіх прадуктаў у Расію — гэта нежаданне Беларусі прадаваць долі расійскаму капіталу. Ствараючы праблемы для імпарту беларускага малака, Расія штурхае Беларусь да думкі, што аб'яднанне капіталаў непазбежнае. Аднак лозунг «прадпрыемствы не прадаваць» — яшчэ адна з прыкметаў эканамічнай палітыкі Александра Лукашэнкі.

**«Независимая газета» (Расія)**

Мінск бярэ ўдзел у праекце ЕС, антырасійскі характар якога больш чым відавочны. Па-сутнасці, размова ідзе пра стварэнне новага санітарнага кардону вакол нашай краіны. Лукашэнка шукае алібі для змены знешнепалітычнага курсу сваёй краіны. У якасці такога ён не знайшоў нічога лепшага, чым смешныя абвінавачанні ў дыскрымінацыі беларускіх тавараў на расійскім рынку. Можа, Бацька лічыць, што беларускія тавары патрэбныя на рынках краін ЕС? (...) З Лукашэнкам усё ўжо зразумела. Яго «раман» з Ватыканам ясна дэманструе, што дзеля падтрымкі свайго рэжыму ён гатовы прадаць радзіму каталікам. Аднак галоўнае пытанне для нашай краіны ў тым, што сярод апазіцыі мінскаму рэжыму няма лідэраў, якія маюць прарасійскія сантыменты. Калі цяперашняя дынаміка захаваецца, асабліва розніцы паміж Лукашэнкам і беларускай апазіцыяй, якая корміцца на Захадзе, не будзе.

**«Сегодня.Ру» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### **РАСІЯ.** СТВАРАЕЦЦА ПАРТЫЯ ЛІПАВЫХ КАМУНІСТАЎ

У той час, як у Беларусі камуністы спяшаюцца пазбавіцца іміджу партыі марксістаў-ленінцаў, у суседняй Расіі сітуацыя іншая. Паколькі КПРФ Генадзя Зюганава захоўвае брэнд галоўнай партыі апазіцыі, слова «камуніст» мае попыт на электаральным рынку. Натуральна, Крэмль час ад часу стварае фіктыўныя партыі, каб адцягнуць ад КПРФ частку галасоў прыхільнікаў левых поглядаў. Так, у мінулыя выходныя ў Маскве абвясціла пра сваё нараджэнне партыя «Камуністы Расіі» (КР), старшынёй якой абралі Канстанціна Жукава. Працэс нараджэння партыі сабраў шмат журналістаў. Аднак прыйшлі яны толькі для таго, каб задаць кіраўнікам расійскіх камуністаў адно пытанне: ці ваша партыя праект Крамля? Таварыш Жукаў радыкальна адмаўляўся прызнаць сябе марыянеткай Пуціна—Мядзведзева, выкарыстоўваючы пры гэтым радыкальную камуністычную рыторыку. Аднак у аргументы Жукава мала хто паверыў. Сам Жукаў — заможны бізнесмен, уладальнік параходнай кампаніі на Камчатцы. Большасць дэлегатаў — яўна нанятыя за грошы студэнты. Праўда, не выключана, што стварэнне КР замовілі лідэры «Справядлівай Расіі», якая зараз намагаецца стаць галоўнай партыяй левай альтэрнатывы да адзінаросаў.

### **ІСПАНІЯ.** ЕТА БУДЗЕ ДУМАЦЬ ДА ВОСЕНІ

Два прадстаўнікі падпольная тэрарыстычнай арганізацыі ЕТА, якая змагаецца за незалежнасць Краіны Баскаў вайсковымі сродкамі, далі інтэрв’ю газеце «*Gara*». Яны заявілі, што нягледзячы на апошнія рэпрэсіі працягнуць вайну з Мадрыдам і на пачатку восені, па выніках цяперашняй палемікі ўнутры арганізацыі, прадставяць новую тактыку барацьбы за незалежнасць краю. Змена стратэгіі, безумоўна, звязаная з апошнім зменамі канфігурацыі палітычных сіл у Краіне Баскаў. Пасля выбараў у сакавіку ўрад аўтаноміі ўпершыню за трыццаць гадоў узначалілі сацыялісты. Былая ўрадавая Нацыянальная баскская партыя сышла ў апазіцыю і зараз спрабуе эксплуатаваць вобраз нацыяналістаў. Сектар грамадства, які падтрымліваў ЕТА, раскалоўся. Другім моцным ударам па пазіцыях прыхільнікаў ЕТА стаў поспех левай нацыяналістычнай партыі «*Arala*», якая выступае за прыпыненне тэрарызму як сродку дасягнення незалежнасці. Сыходзячы з лексікону заяў сяброў ЕТА, думаецца, што іх новая праграма наўрад ці атрымае шырокую падтрымку. Так, цяперашні ўрад аўтаноміі яны называюць «урадам іспанскіх фашыстаў», хаця самі сацыялісты былі забароненыя ў часы дыктатуры Франка. Міністр унутраных спраў Іспаніі назваў заяву ЕТА «бессэнсоўнай». Па яго словах, адзінае, што ён можа сказаць, гаварылася ім і раней: ЕТА павінна скласці зброю.

### **ЗША.** У СТАЛІЦЫ КУ-КЛУКС-КЛАНА БУДЗЕ ЧАРНАСКУРЫ МЭР

Іронія гісторыі. Іншыя словы цяжка знайсці для характарыстыкі вынікаў выбараў у горадзе Філадэльфія (штат Місуры). Філадэльфія з насельніцтвам некалькі тысяч чалавек доўгі час лічылася цэнтрам расістаў. Менавіта тут у 1967 годзе мела месца адно з самых крывавых злачынстваў на расавай глебе ў гісторыі ЗША. Сябры арганізацыі Ку-клукс-клан забілі двух чарнаскурых падлеткаў і белага студэнта, які прыехаў у Філадэльфію абараняць грамадзянскія правы афраамерыканцаў. Тая падзея лягла ў аснову сюжэта вядомага фільма Алана Паркера «Місісіпі ў агні». І вось зараз унукі тых расістаў абралі гарадскім галавою чарнаскурага палітыка — 53-гадовага Джэймса Юнга. Па прафесіі ён пастар. На думку пераможца, яго трыумф не быў бы магчымы без перамогі Барака Абамы ў мінулым годзе. Высокая папулярнасць першага чарнаскурага прэзідэнта Штатаў, здаецца, дапамагла Юнгу. Трэба дадаць, што 60 працэнтаў гараджан Філадэльфіі — белыя.

### **КУБА.** ДЭПАРТАВАНЫ ДЫПЛАМАТЫ

Кубінскі ўрад запатрабаваў ад чатырох супрацоўнікаў іспанскай амбасады неадкладна пакінуць краіну. Па словах кубінскага МЗС, усе яны — тайныя агенты іспанскай разведкі. Мадрыд нечакана мякка адрэагаваў на ўчынак Гаваны. Прадстаўнік іспанскага дыпламатычнага ведамства назваў інцыдэнт нармальнай зменай персаналу пасольства. Між тым, правая іспанская газета «*El Mundo*» змясціла артыкул, у якім пішацца, што ўсе высланыя з Выспы Свабоды агенты працавалі на службу *CNI*, якая займаецца барацьбой з актывістамі баскскай тэрарыстычнай групоўкай ЕТА. На Кубе супрацоўнікі спецслужб выконвалі місію нагляду за баскскай грамадой. Акрамя таго, падчас дыктатуры Франка Гавана ахвотна давала палітычны прытулак сябрам груповак, якія змагаліся з дыктатурай. Па дадзеных Мадрыда, цяпер на востраве жыве каля 30 актывістаў ЕТА.

### **ВЕНЕСУЭЛА.** ВЯДОМАМУ ЛІТАРАТАРУ ЗАГАДАЛІ ЛЮБІЦЬ ЧАВЕСА

Альвара Варгас Ллоса — адзін з самых славутых пісьменнікаў сучаснасці, быў затрыманы ў аэрапорце Каракаса падчас пашпартнага кантролю. Яго адвялі ў асобны пакой і на працягу трох гадзінаў чыталі лекцыю пра палітычную сітуацыю ў краіне. Сэнс лекцыі: літаратар павінен устрымацца ад спроб умяшання ў палітычны працэс. Варгас Ллоса, які прыбыў у Венесуэлу для ўдзелу ў канферэнцыі супраць беднасці, сапраўды займае вельмі крытычную пазіцыю адносна рэжыму Чавеса. Яго лічаць адным з ідэйных лідэраў лацінаамерыканскага лібералізму. Міністр унутраных спраў Венесуэлы пракаментаваў інцыдэнт наступным словамі: «Усе іншаземцы абавязаны паважаць нашага прэзідэнта Уга Чавеса». Між тым, напярэдадні візіту пісьменніка старшыня галоўнай афіцыйнай партыі Аб’яднаная сацыялістычная партыя Венесуэлы (PSUV) Дэвід Медзіна назваў Ллоса правакатарам. Праўда з літаратарам яшчэ мякка абышліся: у мінулым годзе іншага вядомага антыкамуніста, заснавальніка «Салідарнасці» Леха Валенсу памежнікі нават не выпусцілі з аэрадрома. Адразу адправілі дахаты.

НАЦЫЯ

# МАЛДАЎСКІЯ, РУМЫНСКІЯ, САВЕЦКІЯ

**Апошнія падзеі ў Малдове, а менавіта моладзевыя пратэсты за ўваходжанне краіны ў склад Румыніі, зноў актуалізавалі пытанне нацыянальнай ідэнтычнасці малдаван. Пра палеміку на гэты конт у кантэксце агульнай сітуацыі ў Малдове журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Наташай Сіняевай, праваабаронцаю з Кішынёва.**



***— Гледзячы з Беларусі цяжка зразумець логіку паводзін малдаўскіх школьнікаў і студэнтаў, якія, з аднаго боку, называюць сябе патрыётамі, з другога — патрабуюць інкарпарацыі ў склад іншай дзяржавы.***

— Праблема сапраўды парадаксальная, таму што Малдова мае сваю дзяржаўную традыцыю. Аднак пасля атрымання незалежнасці краіна сутыкнулася з праблемай ідэнтычнасці ў новых умовах. Амерыканскі палітолаг Чарльз Кінг назваў Малдову «адзіным еўрапейскім краем, дзе асновы нацыянальнай ідэнтычнасці дасюль застаюцца спрэчнымі». Можам гаварыць як мінімум пра тры мадэлі малдаўскай ідэнтычнасці, хаця з улікам прысутнасці розных меншасцяў, думаю, што такіх мадэляў значна больш. Такім чынам, частка насельніцтва лічыць сябе румынамі, другая — малдаванамі, трэцяя — савецкімі малдаванамі.

***— Якія галоўныя аргументы ў прыхільнікаў канцэпцыі «малдаване — гэта румыны».***

— Панраманізм абапіраецца на моўнае адзінства румын і малдаван, на агульнае гістарычнае і этнічнае паходжанне насельніцтва Малдовы і Румыніі. Ужо ў VI стагоддзі прарумынскія плямёны мелі пэўныя элементы дзяржаўнага ладу. А потым, як сцвярджаюць панраманісты, адбылася катастрофа. У 1812 годзе малдаўская частка румынаў была адарвана ад Маці-Румыніі ў выніку чарговай расійска-турэцкая вайны і ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Рымейк меў месца ў 1940 годзе, калі савецкія войскі акупавалі край.

Слабыя месцы міфу панраманізму наступныя: на пачатак XIX стагоддзя, кажучы словамі аднаго з малдаўскіх гісторыкаў, «адзінага румынскага народнага цела» не існавала, паколькі адсутнічала румынская ідэнтычнасць. Існавалі асобныя правінцыі — Валахія і Малдова (не блытаць з Бесарабіяй). Ідэнтычнасць «мы — румыны» з’явілася толькі ў другой палове XIX стагоддзя, калі тыя правінцыі аб’ядналі і стварылі дзяржаву Румынія.

Агульныя этнічныя вытокі ніхто не аспрэчвае. Аднак Бесарабія не брала ўдзел у працэсе фармавання ідэнтычнасці румынаў, пайшла іншым шляхам. На мясцовую палітычную культуру больш паўплываў палітычны працэс у Расійскай імперыі.

***— Якое месца ў міфалогіі румынскіх малдаван займае мова?***

— Каласальнае. Па-сутнасці, гэта адзінае, што звязвае румын і малдаван, якія фактычна два стагоддзі жылі ў розных культурных, прававых, палітычных каардынатах. Мова выступае як ключавы элемент ідэнтычнасці. Таму панраманісты ставяць пад сумнеў існаванне асобнай малдаўскай мовы, папулярызуюць румынскую літаратурную мову, змагаюцца за чысціню мовы. Пры такім падыходзе мова — не толькі сродак камунікацыі, аднак і сродак выяўлення ідэнтычнасці. Як кажа лідэр Румынскага хрысціянска-дэмакратычнага фронту (галоўнай прарумынскай партыі), «пытанне мовы не можа разглядацца асобна ад румынскага пытання». Гіпербалізацыя моўнага чынніка прывяла да цікавай палемікі. Ці мова можа быць сродкам нацыянальнай ідэнтычнасці? У Бельгіі і Швейцарыі (шматнацыянальныя краіны, як Малдова) мова — толькі адзін з элементаў ідэнтычнасці, аднак не самы важны.

***— Наколькі папулярная ідэя уніфікацыі?***

— Трэба прызнаць, што панраманскія міфы вельмі папулярныя сярод нацыянальнай інтэлігенцыі, універсітэцкага асяроддзя. Важным фактарам ёсць выкладанне ў школах «Гісторыі румын». Сур’ёзна ўплывае румынская знешняя палітыка, якая не хавае, што мае за мэту далучэнне Малдовы да Румыніі. Безумоўна, сваімі крокамі Бухарэст дэстабілізуе палітычную сітуацыю ў Малдове і замінае працэсу адбудовы малдаўскай ідэнтычнасці, кансалідуе гэтак званых савецкіх малдаван.

***— Якія базавыя ідэі ў савецкіх малдаван?***

— Вельмі простыя. Працэс мадэрнізацыі краю адбываўся менавіта ў часы СССР. Дарэчы, іншага выйсця ў Масквы не было, калі яна хацела інтэграваць Малдову ў імперыю. Адсюль і настальгія. Так ці інакш, на момант распаду СССР прасавецкія сантыменты былі вельмі моцныя. Цікава, што яны характэрныя не толькі для старых, аднак часткова і для маладых людзей, якія ад бацькоў пераня лі міф пра краіну, дзе не было беспрацоўя, дзе адукацыя была бясплатнай, дзе больш-менш вырашалася праблема жылля. Асобная катэгорыя прыхільнікаў СССР — нацыянальныя меншасці. Яны ідэалізуюць савецкую інтэрнацыянальную палітыку, паколькі баяцца экспансіі румынскага нацыяналізму. Праўда, апошнім часам у гэтым лагеры відавочны раскол. Частка савецкіх малдаван пачынае ідэалізаваць цяперашні палітычны рэжым у Расіі і ідэнтыфікуе сябе больш з рускімі, чым з савецкімі людзьмі.

***— Нарэшце, засталіся малдаўскія малдаване...***

— Малдаўскі нацыяналізм базіруецца на гісторыі малдаўскай дзяржавы, якая існавала ў сярэднявеччы. Малдавіністы спрабуюць знайсці гістарычную спецыфіку краю, які не падобны на Расію і Румынію. Яны спрабуюць абараняць тэзіс пра тое, што ў часы знаходжання ў складзе Расіі і Румыніі край захоўваў сваю адметнасць, а яго жыхары мелі сваю ідэнтычнасць. Для нас, праваабаронцаў, вельмі важна, што малдавіністы разглядаюць Малдову як шматэтнічны рэгіён, выступаюць за дыялог культур, за мадэль «палітычнай нацыі», што, на нашу думку, спрыяе развіццю грамадзянскай свядомасці. Аднак нават самыя вялікія энтузіясты малдаўскага праекту прызнаюць, што колькасць яго прыхільнікаў сярод малдаван не больш за 20 працэнтаў. Гэта яшчэ адзін парадокс: 78 працэнтаў малдаван, па выніках апытанняў, супраць далучэння да Румыніі, аднак малдаўскімі нацыяналістамі пры гэтым сябе не лічаць. У любым выпаду, на цяперашні момант усе рэсурсы прыхільнікаў незалежнай Малдовы, якімі б рознымі яны ні былі, трэба кінуць на абарону незалежнасці ад расійскага і румынскага ўплываў. Ведаеце, некалькі год таму я назвала наш край «заляю чакання» і, на жаль, больш адпаведнага тэрміну для апісання сітуацыі я дасюль знайсці не магу.

ЦІКАВА

# ПІРАТЫ РАДЫЁЭФІРУ

Іван БІЧ

**У пракат выйшаў фільм «Рок-хваля» (арыгінальная назва «The Boat That Rocked»), які абавязкова трэба паглядзець усім супрацоўнікам беларускіх незалежных радыёстанцый.**



Фільм цікавы не толькі таму, што яго здымаў Рычард Кёрціс — кароль новай брытанскай камедыі. Раней ён стварыў такія вядомыя карціны, як «Містэр Бін», «Дзённік Брыджыт Джонс», «Нотынг Хіл», «Чатыры вяселлі і адны хаўтуры», «Чорная гадзюка».

«Рок-хваля» прысвечана цікаваму эпізоду гісторыі Брытаніі. У сярэдзіне 1960-х вакол вострава плавалі караблі, на якіх знаходзіліся нелегальныя пірацкія радыёстанцыі. Аўдыторыя слухачоў тых радыёстанцый вымяралася дзесяткамі мільёнаў.

Пірацкія радыёстанцыі існавалі ў Вялікабрытаніі яшчэ нават да другой сусветнай вайны. Прычына простая — манапольнае права кампаніі BBC на радыётрансляцыі. Толькі ў 1973 годзе ўлады дазволілі адчыняць камерцыйныя радыёстанцыі. Канцэпцыя перадач *BBC* да пачатку 70-х была вельмі кансерватыўнай. Яе сфармуляваў адзін з першых дырэктараў *BBC* лорд Рэйз: «Праграмы павінны навучаць, інфармаваць і рабіць больш папулярнай высокую культуру, а не масавую». Яшчэ ў 1923 годзе былі першыя спробы арганізацыі трансляцыі на Брытанію з тэрыторыі Нідэрландаў. Асаблівага рэзанансу яны не мелі, пакуль не пачалася другая сусветная вайна.

За некалькі дзён да яе пачатку з Брытаніі на кантынент выехаў Вільям Джойс. Лепш нават сказаць, не выехаў, а збег. Джойс быў адным з лідэраў Брытанскага саюза фашыстаў, кіраўніцтва якога ў кантэксце напружанай міжнароднай сітуацыі ўлады Альбіёну вырашылі інтэрніраваць. Аднак Джойсу ўдалося пазбегнуць арышту.

У Германіі яму прапанавалі ўзначаліць англамоўную праграму, якая транслявалася на Англію са станцыі *Radio Luxembourg* (Брусель). Так у брытанскім эфіры з'явілася праграма з пазыўнымі *«Germany Calling»*. Яе ведала ўся краіна дзякуючы саркастычнаму стылю вядучага — лорда Гаў-Гаў (такі псеўданім узяў сабе Вільям Джойс). Аднак папулярнасць праграмы хутчэй садзейнічала маральнаму адзінству жыхароў Вялікабрытаніі.

Апошні раз Джойс выйшаў у эфір 20 красавіка 1945 года, калі Берлін штурмавала Чырвоная армія. Ён застаўся верным сабе да канца: прагназаваў хуткае паражэнне Англіі, прамовіўшы на развітанне са слухачамі заклятае: «Хайль Гітлер». Пасля падзення нацызму Джойс падаўся было ў Данію, аднак яго запамінальны голас, які ведаў кожны брытанец, выдаў яго. Джойса арыштавалі, судзілі і прыгаварылі да смяротнага пакарання за здраду каралю, дапамогу ворагам караля і непасрэдную працу супраць караля на радыёстанцыі *Radio Luxembourg*.

Вердыкт дасюль выглядае вельмі супярэчлівым з пункту гледжання права. У 1940 годзе Джойс атрымаў нямецкае грамадзянства і, адпаведна, у адносінах да караля мог паводзіць сябе як захочацца. Аднак на той час прававыя тонкасці мала каго цікавілі. 3 студзеня 1946 года здраднік быў павешаны, а яго цела пахавана ў магіле, на якой не пакінулі ніводнага надпісу.

Вайна закончылася, а звычка слухаць радыё з Еўропы ў англічан засталася. Паколькі на кантыненце было шмат амерыканскіх салдат, *Radio Luxembourg* пачало транслявацць для іх лёгкі джаз, а пазней рок-н-рол. Лондан быў вельмі не задаволены, што *Radio Luxembourg* вяшчае на Брытанію. Чэрчыль нават патрабаваў, каб *Radio Luxembourg* перастала круціць музыку і пачало весці антыкамуністычную прапаганду на Усходнюю Еўропу.

У 1964 годзе некалькі дыджэяў, незадаволеных тым, што *BBC* аддавала перавагу сумнай музыцы, вырашылі заснаваць сваё радыё. Нарадзіліся ўжо згаданыя пірацкія радыёстанцыі. Звычайна студыямі для іх былі каюты невялікіх караблёў, якія дрэйфавалі па-за межамі акваторыі Вялікабрытаніі.

Канцэпцыя пірацкіх радыё спачатку вельмі нагадвала формулу *BBC*: днём навіны, а вечарам музыка. Розніца была толькі ў тым, што *BBC* перадавала сур'ёзную музыку з канцэртных залаў, дзе ігралі салідныя аркестры. Піраты ж, наадварот, папросту ставілі пласцінкі з запісамі рок-гуртоў. Аднак хутка сітуацыя змянілася. Адчуўшы залатую жылу, нейкі амерыканскі прадпрымальнік набыў адразу тры караблі пад пірацкія станцыі. Ён таксама навязаў ім фармат амерыканскіх камерцыйных радыё (фармат сучасных FM-студый). І гэта стала сапраўднай рэвалюцыяй. Пакуль радыёжурналісты *BBC* упарта падкрэслівалі рэспектабельнасць карпарацыі, піраты захапілі моладзевую аўдыторыю. Некалькі мільёнаў чалавек слухалі афшорныя радыё. Самым славутымі караблямі-радыёстанцыямі былі *Radio Caroline* і *Wonderful Radio London*. Іх палубы наведвалі нават рок-зоркі.

Натуральна, улады хутка вырашылі пакласці гэтаму канец. Закон пад назвай *«Marine Broadcasting Offences Act»* ад 1967 года забараняў весці радыёвяшчанне з караблёў. Адным з аргументаў быў такі: у выпадку міжнароднага крызісу ворагі могуць захапіць караблі і выкарыстаць іх для прапагандысцкай вайны супраць Альбіёну. Так ці інакш, большасць пірацкіх радыёстанцый былі вымушаны зачыніцца. Паралельна, праўда, змяніўся стыль вяшчання *BBC*. Ён стаў менш фармальным. Шмат былых вядучых пірацкіх каналаў прыйшлі на *BBC* і адчынілі новую, магчыма, самую славутую эпоху ў гісторыі легендарнай станцыі.

Аднак не ўсе пагадзіліся здавацца. Калектыў згаданай вышэй станцыі *Radio Caroline* вырашыў працягнуць вяшчання. *Radio Caroline* перабазіравалася з берагоў Паўночнага мора да берагоў Нідэрландаў і працягвала трансляцыю адтуль. Так пачалася яшчэ адна цікавая гісторыя.

З-за скарачэння рэкламы праект праваліўся, і *Radio Caroline* сышло з эфіру. Аднак у 1972 годзе здолела зноў вярнуцца ў эфір, і нават дзякуючы таленавітым дыджэям увайсці ў спіс самых папулярных станцый Брытаніі. У 1974 годзе ўрад Нідэрландаў забараніў пірацкія радыё. *Radio Caroline* пачало весці трансляцыі, заходзячы ў розныя еўрапейскія парты. Цяпер супраць станцыі сталі змагаецца ўжо не толькі брытанскі, а ўсе ўрады Заходняй Еўропы. Бельгійскі суд вынес завочны прысуд уладальніку і дыджэям радыёстанцыі да турэмнага зняволення.

У 1978 годзе здарыўся новы фінансавы крызіс. *Radio Caroline* на паўны час замоўкла. Аднак у 1983-м яно зноў выходзіць у эфір. У 1989-м галандская і брытанская паліцыі праводзяць рэйд супраць станцыі і яе супрацоўнікаў. Карабель *«Ross Revenge»*, дзе знаходзілася студыя, быў захоплены. Але праз шэсць тыдняў пасля рэйду *Radio Caroline* зноў аднавіла свае перадачы. У 1991-м карабель зноў быў арыштаваны. Толькі пасля гэтага піраты пагадзіліся на рэгістрацыю. Зараз студыя *Radio Caroline* знаходзіцца ў Кенце (Паўднёвая Англія).

Між тым, паводле інфармацыі брытанскай паліцыі, сёння на тэрыторыі Аб'яднага каралеўства дзейнічае 150 нелегальных радыёстанцый.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ХАСЭ ЛУІС САПАТЭРА



Прэм'ер Іспаніі, лідэр іспанскай сацыялістычнай працоўнай партыі *(PSOE)*, Сапатэра атрымаў сімвалічную палітычную паразу. Упершыню за час знаходжання сацыялістаў пры ўладзе Канстытуцыйны суд стаў на бок палітычнай фармацыі, забароны якой патрабаваў урад. Гаворка ідзе пра партыю «Міжнародная ініцыятыва — Салідарнасць з народамі» *(II–SP)*, якая хоча ўдзельнічаць у выбарах у Еўрапарламент. Сапатэра выступіў за тое, каб абвесціць *II–SP* па-за законам, паколькі партыя быццам звязана з тэрарыстычнай групоўкай баскскіх сепаратыстаў ЕТА. Раней на падставе падазрэнняў у кантактах з ЕТА Канстытуцыйны суд ужо забараніў некалькі баскскіх партый (напрыклад, партыю «Батасуна»). Аднак на гэты раз суддзі вырашылі, што запісваць *II–SP* у прыхільнікі баскскіх тэрарыстаў — гэта ўжо занадта. *II–SP*, у адрозненні ад той жа «Батасуны», мае статус агульнанацыянальнай партыі. Акрамя таго, левыя партыі дружна падтрымалі *II–SP* у перасцярозе, што можа быць створаны прававы прэцэдэнт для пераследу левых. Праўда, нягледзячы на пазітыўны для сябе вердыкт удзел *II–SP* у выбарах застаўся пад пытаннем. Каб трапіць у ліст партый — кандыдатаў на выбары ў Еўрапарламент, прыхільнікам міжнароднай ініцыятывы трэба сабраць 250 тысяч подпісаў.

### ФІЛІПЕ КАЛЬДЭРОН ІНАХОСА



25 мая прэзідэнт Мексікі правёў нараду з прадстаўнікамі культурнай, спартыўнай, навуковай элітаў. На парадку дня стаяла адно пытанне: як рэабілітаваць імідж Мексікі, якую цяпер ва ўсім свеце лічаць радзімай і рассаднікам свінога грыпу. У выніку ўвесь мексіканскі турыстычны цэнтр апынуўся на мяжы краху. «Размова ідзе пра тое, каб кожны з вас дапамог нам прывабіць у Мексіку як мага больш наведвальнікаў. Мільёны людзей у краіне жывуць дзякуючы турызму, і іхні стан цяпер вельмі цяжкі», — сказаў прэзідэнт. Увогуле, Кальдэрон не хаваў эмоцый: «Падумайце пра таксістаў з маленькіх гарадоў, супрацоўнікаў і прыбіральшчыцах у гатэлях, пра іх сем'і». У выніку пасяджэння было абвешчана пра пачатак спецыяльнай кампаніі ў замежжы. На яе з бюджэту будзе выдзелена прыкладна 65 мільёнаў еўра. Апошнія словы кіраўніка дзяржавы аўдыторыя вітала стоячы. «Мы павінны давесці ўсяму свету, што мы — нацыя моцных людзей. Мексіка застанецца адзінай, і Мексіка будзе ісці наперад».

### САЙ ФРУМКІН



Адзін з самых радыкальных актывістаў за правы савецкіх яўрэяў на эміграцыю памер у ЗША. Яму было 78 гадоў. Нарадзіўся Сай ў Каўнасе ў сям'і прадаўца аўтамабіляў. Падчас вайны ўся сям'я Фрумкіных трапіла ў канцлагер. Сай і ягонага бацьку адправілі ў Дахау. За 20 дзён да прыходу саюзнікаў бацька памёр. Сын і маці пераехалі ў ЗША. У 1968 годзе Сай заснаваў Савет Паўднёвай Каліфорніі за правы савецкіх яўрэяў. Камітэт набыў вядомасць ва ўсёй краіне дзякуючы сваім акцыям прамога дзеяння. Падчас гастроляў маскоўскага Вялікага тэатра ў ЗША Фрумкін надрукаваў спецыяльныя тэатральныя праграмкі, у якіх ішла размова пра стан яўрэяў у СССР. Падчас сустрэчы Брэжнева і Ніксана каманда Фрумкіна выпусціла ў неба недалёка ад месца саміту 5000 паветраных шароў з надпісам *«Let My People Go»*. Напярэдадні *Super Bowl* — фінальнага матча ў чэмпіянаце па амерыканскаму футболу, камітэт наняў самалёт, які лятаў над стадыёнам з вялікім плакатам «Выратуйце савецкіх яўрэяў». Цяжка пералічыць, колькі разоў Фрумкін паліў чырвоны сцяг каля амбасады СССР або пікетаваў турыстычныя фірмы, якія арганізоўвалі туры для амерыканцаў у Савецкі Саюз. У 1976 годзе 72 тысячы яўрэяў СССР атрымалі правы выехаць у ЗША. Фрумкін актыўна дапамагаў эмігрантам. У апошнія гады жыцця Сай займаўся правамі яўрэяў у Эфіопіі. «Фрумкін зрабіў у ЗША больш за ўсіх, каб прыцягнуць увагу да барацьбы яўрэяў СССР за свае правы», — напісала газета *«Los Angeles Times»*, калі стала вядома пра смерць актывіста.

▸ СВЯТА

# ПАМІЖ МІНСКАМ І ПІНСКАМ

## З ГІСТОРЫІ ШВЕДСКА-БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Алесь ГІНЗБУРГ, Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Швецыя ў нечым падобная да Беларусі, і, відаць, гэтым можна патлумачыць інтэнсіўныя культурныя стасункі, якія звязваюць дзве дзяржавы. Плённасць жа гэтых стасункаў, я думаю, можна патлумачыць тым, што існуюць рэчы, у якіх краіны непадобныя. Горы і мора. У Швецыі яны ёсць. Я думаю, уся справа ў гарах і моры.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Шведскі амбасадар Стэфан Эрыксан

Традыцыйнае ўжо мерапрыемства — Дні культуры Швецыі ў Беларусі, як заўсёды, трымаецца на трох кітах: літаратура, кіно, музыка. І калі два апошнія віды шведскага мастацтва чакаюць беларусаў у чэрвені, май шведы зрабілі літаратурным. З 20 па 23 мая мелі месца шведска-беларускія літаратурныя дні. У межах даволі разнапланавых мерапрыемстваў перад гледачамі выступілі беларусы Анатоль Вярцінскі, Андрэй Хадановіч, Алесь Разанаў, Людміла Рублеўская, Валярына Кустава і шведы Мікаэль Ніемі, Петэр Фродберг Ідлінг, Андрэас Матсан і Аніка Нурлін, Улінэ Сціг ды рухавік культурнага абмену паміж нацыямі — шведа-беларус Дзмітры Плакс. Былі прэзентаваныя кнігі «Сучаснае шведскае апавяданне» выдавецтва «Галіяфы» і «Трыццаць тэкстаў» (бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў») Дзмітрыя Плакса.

З Плакса, уласна, усё і пачалося.

### Паміж выявай і гукам

(Ева Вайтоўская)

20 мая ў Музеі М. Багдановіча супрацоўнік беларускай рэдакцыі «Шведскага радыё» перакладчык Дзмітры Плакс выступаў як аўтар беларускамоўнай паэзіі. Усім, хто завітае на прэзентацыю, было абяцана паказаць вершы, «незвычайныя нават у святле найноўшых эксперыментаў творчай моладзі». І «паказаць» тут — не проста сучасны літаратурны слэнг у значэнні «прачытаць на вечарыне». У густоўным, квадратным па фармаце выданні звычайная паэзія спалучаецца з фота, графікай, візуальнай паэзіяй. Зірнуць — і сапраўды люба-дорага. Але падчас прэзентацыі Дзмітрыя найперш слухалі. І гэта выявілася іншым вымярэннем яго кнігі. На адпаведнае ўспрыманне наладжвала музычнае афармленне вечарыны — гурт *«Drum Ecstasy»* з яго барабаннай феерыяй.

Прыемны сам па сабе, творчы вечар, аднак, не прыўнёс ніякіх адкрыццяў у беларускую літаратуру. Паводле яго беларускіх вершаў (раней ён быў вядомы як адно рускамоўны паэт), Дзмітры Плакс — стандартны паэт беларускага вершавага авангарду. Найбліжэйшым яму па духу ёсць, відаць, Арцём Кавалеўскі з яго зборнікам вершаў «АдмыСЛОВЫя гульні». У галоўным мастацкім прыёме паэта — нанізванні сугучных словаў — прасочваецца радасць неафіта беларускай пазіі: здаецца, што Дзмітры наўмысна сабраў самыя знакамітыя рыфмы і прыёмы славянскага вершавання: «Няма і нема капітана Нема», «турботы залішніх боты» «падковы выпадковы» і асабліва «без сонца бясконца» — усё гэта або ўжо недзе было, або наўпрост — паэтычныя штампы. Але абаяльнасць вершаў Плакса ў тым, што аўтар пра гэта не здагадваецца, аранжыруючы старыя песні ў абсалютна новай танальнасці. Ёсць падазрэнне, што Плакс складае тэксты для беларускага рэгі: «...цагляным шляхам вузкім паміж рускім і ляхам заўжды са страхам».

Галоўная рыса паэзіі Плакса — спалучэнне еўрастандарту і беларускага каларыту. Аўтар, добра знаёмы са шведскай і беларускай паэтычнымі традыцыямі, свядома ці не, скамбінаваў іх. І ў Швецыі, і ў Беларусі «Трыццаць тэкстаў» гучаць даволі нефарматна, а таму вабяць.

### Паміж human rights і copyrights

(Алесь Гінзбург)

21 мая пачался для ўдзельнікаў літаратурных дзён з камернага мерапрыемства — «круглага стала» па абмене досведам паміж шведскімі і беларускімі літаратарамі. Мадэратар — Андрэй Хадановіч — задаў тэму: «Аднойчы, беручы ўдзел у літаратурнай канферэнцыі ў Амстэрдаме, я заўважыў, што я ў асноўным гавару пра «правы чалавека» *(human rights)*, а мае заходнія — пра «аўтарскія правы» *(copyrights)*. Прапаную высветліць, у чым палягаюць асаблівасці існавання літаратара на Захадзе і ў Беларусі?» І літаратары ахвотна пачалі абмяркоўваць. Уладзімір Арлоў эпатаваў шведскіх літаратараў гісторыямі, як у 1980-я спецслужбы абвінавачвалі яго ва ўтрыманні дома лякарні падпольных абортаў, як з яго кнігамі, выдадзенымі ўжо ў 1990-я, папрацавала цэнзура. Пісьменнік Мікаэль Ніемі зрэагаваў на гэтыя аповеды так: «Не думайце, што на Захадзе няма цэнзуры. Яна папросту хаваецца пад законы рынку. Пераклад майго рамана на англійскую мову выйшаў у ЗША і Вялікабрытаніі. Гэта былі вельмі розныя кнігі, бо ў ЗША выданнем займалася маленькае незалежнае выдавецтва, якое магло дазволіць сабе што заўгодна. А брытанскае выдавецтва было монстрам паліграфіі. Яны друкавалі вялізны наклад, і таму я быў змушаны пагадзіцца, каб з перакладу выкінулі грубыя, «непрыстойныя» словы і сцэны».

Літаратарка і крытык Людміла Рублеўская дзялілася досведам папулярызацыі беларускай літаратуры на старонках выдання «Беларусь сегодня»: «Мая мэта — зрабіць сучасную беларускую літаратуру больш актуальнай, прывабіць да яе чытача. Не сакрэт: «сваё — маргінальнае». Беларускае для беларуса не можа быць добрым. На жаль, мае высілкі амаль марныя. Я пыталася ў бібліятэкараў і прадаўцоў у кнігарнях. Так, пасля маіх рэцэнзій пэўная цікавасць да кніг і аўтараў з'яўляецца, але невялікая і непрацяглая»… Дзмітры Плакс, медыум паміж Швецыяй і Беларуссю ў галіне літаратуры, падзяліўся сваімі назіраннямі: «У Швецыі — наадварот, поспех літаратуры наўпрост залежыць ад крытыкі. Дзяржава цэнтралізавана закупляе наклады самых значных па водгуках спецыялістаў кніг. Мае пераклады Данііла Хармса на шведскую мову спачатку амаль не заўважылі. Але напрыканцы года кніга трапіла ў рэйтынг салідных газеты — і ўжо праз тры гадзіны пасля таго, як газета трапіла ў шапікі, у выдавецтва патэлефанавалі з міністэрства культуры і замовілі 600 асобнікаў для бібліятэк Швецыі…»

### Паміж Карлсанам і Эрыксанам

(Ева Вайтоўская)

Увечары 21 мая адбылася вялікая вечарына шведскай і беларускай літаратуры ў Акадэміі мастацтваў. Па яе выніках можна сказаць адно: калі ў наступным годзе ад Швецыі на «Еўрабачанне» паедзе амбасадар Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан, у яго будуць усе шанцы калі не заняць першае месца, то, прынамсі, атрымаць найвышэйшы бал ад беларусаў. Бо Стэфан Эрыксан — другі паводле папулярнасці грамадзянін скандынаўскай краіны ў Мінску пасля Аляксандра Рыбака. Найперш таму, што, у адрозненні ад спевака з Нарвегіі, Эрыксан выдатна размаўляе па-беларуску.

Ужо на вечарыне паэзіі Дзмітрыя Плакса ў паветры лунала нешта не тое. Выступоўцы выходзілі прывітаць паэта з новай кнігай, але віншавалі чамусьці не яго, а Стэфана Эрыксана. Госці з прыемнасцю смакавалі поўны яго тытул з усімі «надзвычайнымі і паўнамоцнымі». Хтосьці, агаварыўшыся, назваў Эрыксана «Яго Вялікасцю». Потым нехта яшчэ — ужо наўмысна — «Яго Вялебнасцю». Трэба аддаць належнае сціпласці і мужнасці дыпламата, яму ўдавалася годна прымаць усю гэтую «асанну», якая пачынала ўжо ператварацца ў камедыю.

Хваласпевы на адрас Эрыксана дасягнулі апагею ў вялікай зале Акадэміі мастацтваў. Анатоль Вярцінскі прысвяціў спадару Эрыксану верш. Алесь Разанаў падарыў спадару Эрыксану кнігу. Калі ж на сцэну выйшла Валярына Кустава, зала канчаткова зразумела, што ў выступоўцаў са Стэфанам Эрыксанам усё дамоўлена — дзеля смеху, — і пачала адкрыта рагатаць, у той час як раней толькі ціха пахіхіквала. «Я ўсё жыццё марыла, што за мной прыляціць на белым верталёце мой прыгожы прынц — і вось я пабачыла амбасадара Швецыі. У дзяцінстве маім кумірам быў Карлсан, а цяпер — Эрыксан!» — прызналася Валярына.

Трэба аддаць належнае працы пасольства Каралеўства Швецыя і Шведскага інстытута па папулярызацыі шведскай мовы, шведскай літаратуры ў Беларусі. Харызматычная постаць спадара пасла, бясспрэчна, цэнтральная ў поспеху гэтай папулярызацыі.



Але ўвечары 21 мая ўдзячнасць беларусаў шведу за выдатную працу наўпрост межавала з абсурдам. На гэтым фоне шведскія літаратары выявіліся адзінымі, хто быў не ў курсе, кім ёсць для беларусаў іх пасол, і таму не паспелі падрыхтаваць яму кампліментаў, а проста выступілі. Перад публікай.

### Паміж Вітулай і Пнампенем

(Алесь Гінзбург)

У падарожнай кніжцы «Усё, што вы хацелі ведаць пра Швецыю» раздзел «літаратура» прысвечаны амаль выключна Астрыд Ліндгрэн. Але адзін з удзельнікаў шведска-беларускіх чытанняў прысутны ў кнізе на значна больш крутым для пісьменніка ўзроўні — на ўзроўні цытаты. Раздзел «Музыка» ў гэтай кнізе называецца «Папулярная музыка са Швецыі» — перыфразам назвы самага вядомага рамана Мікаэля Ніемі «Папулярная музыка з Вітулы». Перакладзеная на 31 мову свету, гэтая кніга вядомая беларускай моладзі ў рускім перакладзе. Некаторыя беларусы прыйшлі на вечарыну дзеля таго, каб на свае вочы пабачыць куміра.

Напісаўшы гісторыю свайго дзяцінства ў забытым Богам мястэчку Паяла, Ніемі прачнуўся знакамітым. Ён не дазваляе перакладчыкам мяняць фінскія словы, што трапляюцца ў шведскім тэксце, — гэта для яго даніна павагі свайму народу — турнэдальскім фінам, адной з нацменшасцяў Швецыі. Самым вясёлым падарункам аднавяскоўцам ад Ніемі было... слова «Вітула» на вокладцы. Па-фінску яно азначае жаночы палавы орган, чаго ў астатняй Швецыі не разумеюць. Гэта рэальная назва мясцовасці на мяжы з Фінляндыяй. Яе жыхары сапраўды пачынаюць як «адтуль» (у нас кажуць «Засранск») і ўсімі сіламі спрабуюць з'ехаць падалей ад праклятай радзімы. Пачаўшы гаварыць пра комплексы свайго народа адкрыта, Ніемі прымусіў яго пасмяяцца з сябе — і такім чынам перааддолець комплексы. Дальбог, там ёсць пра што пачытаць беларусам. «Дзякуй, вы вельмі цярплівы народ», — сказаў Ніемі гледачам, якія трэцюю гадзіну без антракту сядзелі ў залі.

Жаночую паэзію Швецыі прадставілі адна з кіраўніц Шведскага саюза пісьменнікаў Улінэ Сціг і… поп-выканаўца Аніка Нурлін, якая ў 2007 годзе атрымала ў Швецыі музычную прэмію *«Grammis»* як аўтар найлепшых тэкстаў песень. Выступ поп-спявачкі на шведскім літаратурным вечары — з'ява абсалютна арганічная. У плане спеваў шведы — скандынаўскія ўкраінцы. Праз свабоднае веданне англійскай мовы гэта трэцяя нацыя ў свеце пасля амерыканцаў і брытанцаў па колькасці пастаўленых на сусветны рынак зорак музыкі. Шведы спяваюць усе і паўсюль. У тым ліку і паэткі. Аніка (у тутэйшым разуменні яна хутчэй бард-рок,

чым поп-спявачка) заспявала дзве прыгожыя і сумныя балады пра жаночую долю, чым скарыла мінскую публіку.

Петэр Фродберг Ідлінг дэбютаваў у 2006 годзе з дакументальна-мастацкім раманам «Усмешка Пол Пота». Гэта кніга пра самыя страшныя гады з гісторыі Камбоджы, калі ў часы камуністычнага рэжыму загінула траціна насельніцтва краіны. Урывак гэтай прозы (як і творы іншых шведскіх удзельнікаў, яе пераклаў Дзмітры Плакс, а агучыла па-беларуску акторка Алена Іваннікава) стаў самым змрочным акцэнтам вечара.

### Паміж ІКЕА і «Пінскдрэвам»

(Ева Вайтоўская)

Але асноўныя літаратурныя падзеі разгорталіся 22–23 мая ў Пінску. Раней, дарэчы, дні шведска-беларускай літаратуры праходзілі толькі там, не выклікаючы асаблівага рэзанансу ў сталіцы. Для шведскіх літаратараў паездка ў Пінск цікавая тым, што горад звязаны з імем Карла XII. Маўляў, падчас Паўночнай вайны, забраўшыся на дах езуіцкага сабору ў Пінску, той агледзеў балоты, што цягнуліся да далягляду за Прыпяццю, і прамовіў: «Тут мая смерць». Але не памёр, а абрабаваў горад і пайшоў на поўдзень, у кірунку Палтавы. Мінула тры стагоддзі, шведы нясуць у Пінск не меч, але мір.

У Швецыі вынайшлі самае цікавае літаратурнае спаборніцтва ў свеце — Нобелеўскую прэмію; заканамерна, што самае азартнае літаратурнае шоу Беларусі таксама звязана са Швецыяй. Конкурс юнацкай паэзіі (арганізатары — НГА «Калегіюм»), пераможца якога атрымлівае паездку ў Швецыю, ужо каторы год ставіць на вушы ўвесь раён. Вершы на Піншчыне ператварыліся ў від спорту. Дзяўчатак (а ва ўзросце з 15 да 18 год вершы пішуць збольшага паненкі) маці ўбіраюць на чытанні, як на першы баль. На выступ даецца максімум 4 хвіліны — проста як на слэме. У ход ідуць абаяльныя ўсмешкі і музычнае суправаджэнне. У залі сядзіць суровае журы, інтрыга трымаецца да самага канца. Пераможца вішчыць ад радасці, «праклятыя паэткі» не тояць рыданняў. Сёлета ў конкурсе ўзяла ўдзел рэкордная колькасць юных талентаў — 42, задачай якіх было раскрыць у творах тэму Радзімы і тэму ВАВ.

Адметнасцю Дзён культуры Швецыі–2009 годзе было тое, што насустрач мерапрыемству ўпершыню пайшлі гарадскія ўлады. Частка літаратурных захадаў адбывалася ў Палескім драматычным тэатры, беларускім і шведскім паэтам паказалі пінскі лядовы палац і юных хакеістаў, прадпрыемства «Пінскдрэў» і тыя балоты, якія напужалі караля Карла XII.

ПАЗІЦЫЯ

# РОДНАЯ ЗЯМЛЯ БЕЗ РОДНАЙ МОВЫ — ЧУЖЫНА

Алег ТРУСАЎ, старшыня ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны»

**Зараз, фактычна, мы перажываем жорсткі крызіс моўнай, нацыянальнай і культурнай самаідэнтыфікацыі беларускага народа.**



### Што маем

Гэты год указам прэзідэнта абвешчаны Годам роднай зямлі. Указ выйшаў «у мэтах зберажэння і пашырэння нацыянальнага, духоўнага і культурнага набытку, гістарычнай спадчыны і прыродных багаццяў краіны». Адразу ўзнікае рытарычнае пытанне: «А ці можна існаваць родная зямля без роднай мовы, якая, несумненна, наш асноўны духоўны і культурны набытак?»

Адказ просты — не, не можа, бо спачатку было слова, а спрадвечнае беларускае слова, выток якога сягаюць у першае тысячагоддзе нашай эры, аб'яднала і захавала наш народ як еўрапейскі этнас, што здолеў аднавіць сваю незалежнасць у межах сённяшняй Рэспублікі Беларусь.

На працягу апошніх 14-ці гадоў у Беларусі адбываецца няўхільнае скарачэнне колькасці беларускамоўных школ, класаў, дзіцячых садкоў. З года ў год змяншаецца колькасць вучняў, якія навучаюцца па-беларуску, колькасць дашкольнікаў, якія чуюць беларускую мову ў садках, колькасць студэнтаў, якія слухаюць беларускамоўныя лекцыі ў ВНУ. З года ў год змяншаецца колькасць вучняў, якія ідуць у беларускамоўныя першыя класы. Па звестках Міністэрства адукацыі, на пачатак 2008–2009 навучальнага года ў агульнаадукацыйных установах з беларускай мовай навучання ўсіх тыпаў вучыцца 18,4 працэнта вучняў. У гарадскіх школах краіны ў першых класах на беларускай мове вучыцца толькі 1,9 працэнта вучняў. Мы бачым моцны крызіс моўнай і нацыянальна-культурнай самабытнасці нашага народа.

Негатыўныя тэндэнцыі ў беларускамоўнай адукацыі яшчэ ў 2001 годзе былі прызнаныя Міністэрствам адукацыі, якое для паляпшэння сітуацыі 27 жніўня выдала Пастанову № 48 разам з «Праграмай дадатковых мер па пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі». Аднак гэтыя дакументы засталіся, за некаторым выключэннем, толькі на паперы, як і праграмы аналагічнага зместу абласных выканаўчых камітэтаў.

Разам з тым, беларускае грамадства рэальна губляе навыкі беларускага маўлення. Страчваецца нацыянальная тоеснасць і адметнасць. Па-сутнасці, узнікае касмапалітычны соцыум, што ў эпоху глабалізацыі нясе рэальную пагрозу існаванню беларускага этнасу і беларускай дзяржавы.

### Што патрабуем

У сувязі з гэтым Рада ТБМ заўсёды выказвала крайнюю занепакоенасць тымі наступствамі, якія нясе Беларусі страта моўнай самабытнасці. Быў заяўлены рашучы пратэст супраць бяздзеяння ўладаў у галіне беларускамоўнай адукацыі і выказана патрабаванне неадкладна вярнуцца да поўнага выканання «Праграмы дадатковых мер па пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі» 2001 года.

ТБМ канстатуе гатоўнасць усіх рэгіянальных структур нашага аб'яднання аказаць на месцах самую дзейсную дапамогу ўстановам адукацыі ў выкананні вышэйназванай праграмы і звяртаецца да ўсіх грамадзян Беларусі, асабліва да бацькоў будучых першакласнікаў, каб яны ўжо зараз падавалі заявы пра жаданне навучаць сваіх дзяцей на беларускай мове. ТБМ прапануе беларускім студэнтам таксама патрабаваць з верасня гэтага года беларускамоўнага навучання і ўжо зараз аб'ядноўвацца ў адпаведныя групы і плыні ў сваіх ВНУ.

Крызіс нацыянальнай самабытнасці беларускага этнасу не менш страшны і цяжкі, чым фінансавы або эканамічны, і патрабуе самай пільнай увагі з боку дзяржавы і ўсяго грамадства.

### Чаго дамагліся

Трэба сказаць, што сябры і прыхільнікі ТБМ таксама не сядзяць склаўшы рукі. Дзякуючы ТБМ у ВНУ захаваны абавязковы курс «Беларуская мова. Прафесійная лексіка», а гісторыю і геаграфію ў рускамоўных школах са згоды бацькоў, вучняў і настаўнікаў зноў можна выкладаць па-беларуску.



Напрыканцы жніўня 2006 года ўлады абвясцілі пра будучыя змены ў беларускім правапісе, але абмеркавання ў грамадстве па гэтым пытанні не прапанавалі. Дзякуючы намаганням ТБМ, такое абмеркаванне адбылося ў нашай сядзібе. Прапанаваныя дадаткі і заўвагі былі накіраваныя ў Адукацыйную камісію Палаты прадстаўнікоў. Некаторыя з іх былі ўлічаны, і дзякуючы гэтаму апошняя версія закона, прынятая ў мінулым годзе, стала больш прыдатнай для карыстання.

З ініцыятывы ТБМ распачалося грамадскае абмеркаванне ідэі стварэння беларускамоўнага спадарожнікавага тэлеканалу. 10 снежня 2007 года «Белсат» пачаў сваё вяшчанне.

Дзякуючы нашым захадам зараз гучаць у эфіры дзве цалкам беларускамоўныя радыёстанцыі — «Еўрапейскае радыё для Беларусі» і «Радыё Рацыя»; загаварылі па-беларуску «Нямецкая хваля» і «Радыё Швецыі», пашыралася сфера выкарыстання беларускай мовы на транспарце; родная мова загучала ў метро, трамваях, аўтобусах, тралейбусах і электрацягніках. Уся філатэлістычная прадукцыя суправаджаецца тэкстамі на беларускай мове.

### Сумеснымі намаганнямі

Жыццядзейнасць ТБМ, станоўчыя вынікі яго працы наўпрост звязаныя з пастаяннымі стасункамі ўнутры структуры — ад абласных арганізацый да кожнай суполкі і асобных сяброў, а таксама з іншымі грамадскімі арганізацыямі (ЗБС «Бацькаўшчына», Саюз беларускіх пісьменнікаў, ТБШ, ГА «Ветэраны адраджэння», суполка мастакоў «Пагоня», грамадскі рух БНФ «Адраджэнне»), і нават з уладнымі структурамі рознага ўзроўню.

Працягваюцца літаратурныя сустрэчы пісьменнікаў з мінчукамі. Яны адбываюцца на сядзібе ТБМ, у школах, навучальных установах, бібліятэках Мінска. Сустрэчы, што праходзяць на сядзібе ТБМ, загадзя анансуюцца ў незалежных СМІ: газетах «Новы час», «Наша слова», «Народная воля», «Наша ніва». Слухачы атрымліваюць бязвыплатна шмат асобнікаў розных цікавых кніг і брашураў.

На курсах беларускай мовы, якія ладзіць Алена Анісім, прысутныя спасцігаюць навуку быць беларусамі: знаёмяцца з каляндарна-абрадавымі святамі, даведваюцца пра цікавыя, але малавядомыя мясціны ў Беларусі, практыкуюцца ў карыстанні беларускай мовай у розных сітуацыях. І з гэтага практычнага вопыту выразна праступае наступная задача ТБМ — неабходнасць стварэння беларускамоўных асяродкаў, магчыма, у выглядзе розных клубаў ці чагосьці падобнага. А калі глядзець далей і шырэй — арганізацыя моладзевага руху ўнутры ТБМ. Вядома, без залішняй фармалізацыі, але з рэальнымі цікавымі для моладзі справамі і акцыямі. Гэта, у сваю чаргу, дапаможа вырашыць справу з кадрамі.

Акрамя таго, на курсах беларускай мовы выпрашана распачаць працу над стварэннем размоўнікаў «Як гэта сказаць па-беларуску». Удзельнікі курсаў рыхтуюць беларускую частку. А для ажыццяўлення перакладных частак — нямецкай, італьянскай, шведскай, англійскай — будзем шукаць партнёраў.

### Будзьма!

З 1 кастрычніка ТБМ у супрацоўніцтве з ЗБС «Бацькаўшчына», Саюзам беларускіх пісьменнікаў і іншымі грамадскімі арганізацыямі бярэ актыўны ўдзел у грамадскай культурніцкай кампаніі «Будзьма». У аснове акцыі — пашырэнне ўяўлення маладых пра сябе як прадстаўнікоў беларускай нацыі, пачуванне сябе беларусамі. Лічым, што менавіта сёлета, у год чарговага перапісу насельніцтва, вельмі важна несці ў народ роднае слова. У межах кампаніі ТБМ арганізавала сустрэчы ў розных гарадах Беларусі: Мінску, Баранавічах, Лідзе, Наваполацку, Магілёве, Валожыне, а таксама ў Дзятлаўскім, Лідскім, Нясвіжскім, Мінскім і іншых раёнах.

Да 200-х угодкаў В. Дуніна-Марцінкевіча мы надрукавалі кішэнны каляндар на 2008 год. Па нашай прапанове ўлады выдалі паштовую марку і адмысловы канверт з выявай класіка беларускай літаратуры, у Бабруйску быў пастаўлены адпаведны помнік.

У красавіку 2008 года ўлады Беларусі падвысілі арэндную плату за офісы ТБМ у 10 (!) разоў. Такім чынам, існаванне нашай арганізацыі стала праблематычным. Мы мусілі адмовіцца ад аплаты сядзібы ТБМ у Салігорску і звярнуліся праз СМІ да грамадзян Беларусі па фінансавую дапамогу.

Мы вельмі ўдзячныя рэдакцыі газеты «Новы Час» за друкаванне нашых зваротаў з нумарам банкаўскага рахунка ТБМ. Людзі адгукнуліся, неслі і дасылалі свае ахвяраванні і складкі. Дзякуючы ім мы існуём у сённяшніх умовах і змаглі правесці Х з'езд Таварыства беларускай мовы.

Я прашу прабачэння ў тых, каму мы не здолелі даслаць асабістую падзяку і не паспелі надрукаваць іх імёны ў «Нашым слове». Усім нашы найлепшыя зычэнні і нізкі паклон.

Дарагія сябры, дзякуючы вашай падтрымцы сабраных грошай хапіла, каб плаціць высокую арэндную плату пачынаючы з красавіка мінулага года. На прычыне дэвальвацыі беларускага рубля, зараз мы сталі плаціць за арэнду значна больш, чым у мінулым годзе. Але ж выстаялі.

**Я зноў звяртаюся да чытачоў «Новага Часу», сяброў і прыхільнікаў роднага слова з просьбай ахвяраваць на наш рахунак (№ 3015212330014 у гардырэкцыі ААТ «Белінвестбанк», код 764) некалькі тысяч рублёў.** Пакуль мы разам, мы жывём! Дык будзем з нашай мілай, роднай мовай і любай Бацькаўшчынай у любое надвор'е. Тады, упэўнены, абавязкова распагодзіцца.

БЕЛАРУСКІ РОК

# «BELAMUSIC–2009». ДОБРЫ ПАЧАТАК

Генадзь КЕСНЕР

**Адбылася падзея, якую чакалі, бадай, многія, калі не ўсе заўзяраты беларускай рок-музыкі. У «Баравой» — ёсць такая авіяцыйная база ДТСААФ пад Мінскам — 23 мая ладзіўся першы нацыянальны фестываль рок-музыкі *«BelaMusic–2009»*. І гэты «першы блін», спечаны непадробным лідэрам, напэўна, самага беларускага фолк-рок-гурта «Палац» Алегам Хаменкам, не стаўся камяком.**






Гэта было сапраўднае свята беларускае музыкі пад адкрытым небам, цяпер, дзякуй Богу, на тэрыторыі Беларусі. З сярэдзіны 1990-х, калі ў Мінску пры канцы лета ладзіла рок-фэсты газета «Беларуская маладзёжная», што стала, на вялікі жаль, гісторыяй, такіх падзеяў, прынамсі ў сталіцы ці побач з ёй, не было.

Арганізавана ўсё было насамрэч па-еўрапейску (мне даводзілася бачыць падобныя імпрэзы ў Даніі, Германіі, Польшчы, Літве). *«BelaMusic–2009»* — сапраўды фестываль еўрапейскага ўзроўню, і дзякуй за гэта яго арганізатарам, у першую чаргу лідэру «Палаца» і мастацкаму кіраўніку фэсту Алегу Хаменку і адказнаму за тэхнічнае забеспячэнне Уладзіміру Шаблінскаму.

Нягледзячы на праанансаванае ўсімі дзяржаўнымі і недзяржаўнымі СМІ «штармавое папярэджанне», а таксама на тое, што ў дзень правядзення фестывалю над галоўным праспектам Мінска былі зняты ўсё рэкламныя расцяжкі, у Бараву прыехалі каля дзвюх тысяч аматараў беларускай музыкі, якія не пашкадавалі, што наведалі *«BelaMusic»*. Сваімі выступамі парадавалі «Крама», «Нейра Дзюбель», «Без білета», «Палац», «Дзеці Дзяцей», *«J:Mors»*, «Гарадскія», а таксама легендарныя ветэраны беларускае рок-сцэны Аляксандр Растопчын, Аляксей Казлоўскі і Кірыл Шывандо.



Двойчы нябёсы раскрываліся залеваю, але і гэта не напалохала тых, хто прыехаў на фестываль: практычна ніхто не пакінуў пляцоўку перад сцэнаю. А ўзнагародай з неба можна лічыць для Алега Хаменкі («Палац» пачаў свой выступ, калі ішоў моцны дождж) дзве неверагодныя па прыгажосці і яркасці вясёлкі, якія паўсталі акурат побач са сцэнай пасля скончэння залевы.

**Лідэр «Палацу» Алег Хаменка адказвае на пытанні «Новага часу».**

***— Чаму ўзнікла ідэя фестывалю? Падаецца, існуюць ужо і «Рок-кола», і «Басовішча», і «Рок-каранацыя»?***

— Вельмі адчувальны недахоп такога «фестывалю фестываляў«, дзе маглі б сабрацца героі ўсіх музычных прэміяў, узнагарод, цырымоніяў, што праводзяцца ў Беларусі ці за яе межамі, але маюць дачыненне да нашай музыкі. Да таго ж, «Рок-кола» і «Рок-каранацыя» адбываюцца ў канцэртных залах, а «Басовішча» — па-за межамі сучаснай Беларусі. І жывая музыка на адкрытым паветры — гэта ўсё ж такі больш натуральная форма існавання актуальнай музыкі. Тут я маю на ўвазе, што, калі свята ў беларусаў было вялікім, музыкі выходзілі з палацаў ды сядзіб на вуліцу, да «натуральнага ландшафту», і там давалі волю пачуццям.

***— Твае асабістыя ацэнкі: што з задуманага атрымалася і над чым яшчэ давядзецца працаваць, бо, паводле першых водгукаў і меркаванняў нават адмыслоўцаў, гэты фэст мае перспектыву стаць самым выбітным святам беларускай — альтэрнатыўнай і не толькі — музыкі?***

— Свята адбылося. Так бы мовіць, дзіця нарадзілася, і тут паўстае цэлы шэраг новых клопатаў: пялюшкі ды памперсы, як выхаваць ды адукаваць. Канешне, мы маем свае ўласныя думкі на гэты конт, аднак будзем усім удзячны за карысныя парады. Ёсць цэлы шэраг (нават процьма) недахопаў, якія для мяне відавочныя, аднак як умоўны татка гэтага дзіцяці не хацеў бы пра гэта зараз казаць. Ну і, канешне, як кожны з бацькоў хоча выхаваць і даць свайму дзіцяці самае лепшае, я хачу таго ж самага. Тут чамусьці згадалася старая прымаўка — «Дай Бог нашаму цяляці ваўка з'есці».

***— Мы ўбачылі сапраўдных зорак — звыклых для аматараў беларушчыны і ўжо ўлюбёных выканаўцаў. Каго б ты сам хацеў убачыць на сцэне «BelaMusic», апроч айчынных выканаўцаў?***

— У тым і сэнс, што я асабіста хацеў бы бачыць толькі айчынных… Усіх не пералічу, бо гуртоў багата, а музычнай індустрыі ўвогуле бракуе, дый нават музычнага бізнесу пакуль замала. Але калі зараз нічога не рабіць — дык нават спадзяванняў на гэты конт не будзе. Мне здаецца, што *«BelaMusic»* здольны звярнуць увагу на гэту праблему».

***— Яшчэ не так даўно існаваў так званы «чорны спіс» выканаўцаў, якіх немагчыма было ўбачыць на розных фэстах, прынамсі, дзяржаўных. Сёння ўлюбёнцы публікі вярнуліся нават на экраны БТ. Ці насамрэч музыкам стала жыць прасцей у новых варунках?***

— Прасцей? Ну, можа, гэта не тое слова. Я маю на ўвазе, што на сацыяльна актыўную частку грамадства і моладзі беларускія гурты ўплывалі ва ўсе часы найноўшай гісторыі Беларусі. А вось на тую моладзь, скажам, звычайную, пасіўную, якая за мінулыя гады прызвычаілася да музыкі замежнай, рускай ды беларускай «фанернай», што панавала і пануе ў СМІ, мы перасталі хоць неяк уплываць. Аднавіць гэты ўплыў, мне здаецца, вельмі цяжка, можа і немагчыма, аднак спрабаваць усё роўна трэба. Я ўпэўнены, неабходна. Зразумела, што нашу музыку ўспрымуць зараз не тысячы, а сотні, аднак і гэта будзе важна праз пэўны час. Таму я і мае паплечнікі, якія гэта разумеюць, маюць рацыю, калі сцвярджаюць, што нам стала значна больш складана, бо гэта дадатковая адказнасць, якую браць на сябе не вельмі хочацца. Куды прасцей працаваць на свядомых і сацыяльна актыўных сяброў, у паўпадпольным стане, і адчуваць сабе носьбітам ідэй, якія не разумее сённяшні натоўп. Але хто будзе пашыраць уплыў на звычайных, простых суайчыннікаў, за якімі няма стрыжня гонару за ўласную краіну і культуру? Канешне, гэта праца няўдзячная, а можа і бессэнсоўная. Хоць з гэтым, апошнім, сцвярджэннем я паспрабую не пагадзіцца.

* * *

Музычны крытык **Зміцер Падбярэзскі** таксама лічыць, што фестываль атрымаўся. «Многія чыннікі выступалі супраць гэтага фестывалю, я не кажу ўжо пра такую банальную рэч, як зменлівае надвор'е. Самае істотнае, што гэта першы такі фестываль, і публіку трэба прывучыць і да самога факту існавання гэтага фестывалю, і да месца яго правядзення. І тое, што сабралася, як кажуць, каля трох тысяч гледачоў — гэта нармальна для першага фестывалю, — адзначыў Зміцер Падбярэзскі. — А ў будучыні арганізатарам трэба ўлічваць такія моманты, як працягласць выступлення і колькасць удзельнікаў. Я думаю, што колькасць удзельнікаў трэба скарачаць, трэба ўключаць туды больш маладыя калектывы і даваць ім выступаць не па 25–30 хвілін, а мінімум хвілін па 40, а то і па гадзіне».

На думку Зміцера Падбярэзскага, у Беларусі ёсць патэнцыял рок-музыкі, аднак вельмі важна, каб маладыя калектывы маглі сябе паказаць у такой наўпроставай фестывальнай атмасферы, тады і іх будуць ведаць, і самі яны атрымаюць стымул для развіцця.

Як глядач асаблівы рэспект хацеў бы выказаць супрацоўнікам міліцыі Мінскага раёна, якія вельмі прыязна і паважліва ставіліся да гасцей фестывалю, да моладзі, і не перашкаджалі народу весяліцца (гэта прыемнае адрозненне ад сталічных спецназаўцаў, якія пачуваюцца гаспадарамі жыцця паўсюдна, ці то на акцыях апазіцыі, ці то на канцэртах заезджых «зорак»).

Карацей, свята атрымалася, і першы блін стаўся смачнай стравай. Дай Бог, не апошні раз. У добры шлях, «BelaMusic»!

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# «ЦЭНТР ЕЎРОПЫ» УЛАДЗІМІРА НЯКЛЯЕВА



**26 мая ў сталічным Палацы мастацтваў пры поўным аншлагу прайшла прэзентацыя зборніка прозы паэта Уладзіміра Някляева «Цэнтр Еўропы».**

«Гэтая кніга — усім кнігам года кніга», — так ахарактарызаваў яе змест і сэнс старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч. І адначасова канкрэтнае месца: яна адкрывае сабой выдавецкую серыю, запачаткаваную СПБ пад назвай «Кнігарня пісьменніка».

«Гэтай кнігай, — падкрэсліў спадар Алесь, — аўтар услед за Багушэвічам, Гарэцкім, Караткевічам, Быкавым яшчэ і яшчэ раз нагадвае, дзе з'яўляецца цэнтр, дзе з'яўляецца сэрца сусвету, сэрца Еўропы. Нагадвае не так Еўропе, як нам, беларусам».

На вечарыне прысутнічалі не толькі калегі па літаратурнаму цэху, але і грамадскія і палітычныя дзеячы, прычым не толькі самых розных апазіцыйных, але і зусім не апазіцыйных асяродкаў. На дзве гадзіны іх сабрала разам і аб'ядна ла беларускае слова і асоба паэта.

Можа, і сапраўды паэт у нашай краіне больш чым паэт, і мы ўрэшце здолеем, як сказаў легендарны Ніл Гілевіч, дайсці да Беларусі? Вершамі Уладзімера Някляева, пакладзенымі на ўласную музыку, вечарыну аздабляў Зміцер Вайцюшкевіч.

СЯДЗІБА ТБМ ЗАПРАШАЕ

4 чэрвеня 2009 (чацвер)
**АДБУДЗЕЦЦА**
прэзентацыя чарговай кнігі
вядомага беларускага гісторыка
АНАТОЛЯ ГРЫЦКЕВІЧА

**«СТАРОНКІ НАШАЙ МІНУЎШЧЫНЫ»**

ПАЧАТАК У 17.30,
УВАХОД ВОЛЬНЫ
АДРАС: вул. Румянцава, 13

У межах кампаніі «БУДЗЬМА»
www.bydzma.org

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 29.05.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.